СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

26 снежня 2017 года, № 18–19 (2186–2187)

*1.* *Загрузіце на смартфон дадатак* ***Aurasma***
*2.* *Падпішыцеся на канал* ***#bsuby***
*3.* *Навядзіце камеру на выяву з пазнакай*



**АДРАС ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ**

**Мінск, вул. Ленінградская, 16, корпус геаграфічнага факультэта, п. 112.**
**Даведкі па тэл.**
**+375 17 209-50-85**
**(шматканальны).**

**Уся інфармацыя, што датычыцца паступлення ў БДУ, размешчана на сайце:**
**www.abiturient.bsu.by**

# Запрашае БДУ!

*Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй Дзмітрыевіч КАРОЛЬ*

*Паважаныя абітурыенты!*

*Сёння перад вамі стаіць складаная задача – вызначыць свой далейшы шлях, выбраць прафесію, каб пражыць жыццё, як лёс.*

*Кожны з вас – унікальны Сусвет са сваім рытмам і законамі быцця! Ад чаго залежыць поспех чалавека? Ад таго, наколькі мы ведаем сябе, здольныя выявіць, раскрыць і рэалізаваць свой патэнцыял.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – адзіная ўстанова вышэйшай адукацыі ў краіне, у структуру якой уваходзяць і факультэты, і буйныя навуковыя інстытуты, і прадпрыемствы. А гэта значыць, што кожны студэнт мае магчымасць не проста стаць запатрабаваным спецыялістам, але зможа здабыць сябе, вызначыць сваю місію, адказаўшы на пытанне «Хто я ёсць?». Я жадаю вам умоў для пастаноўкі асобасных мэтаў і іх ажыццяўлення. Глядзець на свет сваімі, а не чужымі вачыма, напаўняць яго ўласным сэнсам і зместам. Быць неабыякавым грамадзянінам нашай краіны і зрабіць унёсак у яе развіццё.*

*Пасляховага і правільнага выбару вам, дарагія абітурыенты!*

### БДУ – гэта брэнд, прэстыж, старт для вялікай будучыні:

- паводле вядучых міжнародных рэйтынгаў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт уваходзіць у **2 %** найлепшых універсітэтаў свету;
- тут працуюць звыш **3 тысяч** педагогаў, з іх больш за **400** прафесараў і звыш **1870** кандыдатаў навук;
- педагагічную працу ў БДУ вядуць **12** акадэмікаў і **13** членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі;
- больш за **30** замежных дзяржаўных дзеячаў з'яўляюцца ганаровымі прафесарамі БДУ;
- кожны **пяты** аспірант Беларусі праходзіць навучанне ў БДУ;
- кожная **шостая** кандыдацкая дысертацыя, абароненая ў краіне, выканана ў БДУ;
- кожная **пятая** доктарская дысертацыя, абароненая ў краіне, выканана ў вядучым універсітэце Беларусі;
- кожны **трэці** з рэспубліканскай базы адораных навучэнцаў з'яўляецца студэнтам БДУ.

### БДУ – гэта сучасная адукацыя і ўнікальныя тэхналогіі навучання:

- навучальны працэс ажыццяўляюць **26** факультэтаў і адукацыйных устаноў;
- на першай ступені адукацыі падрыхтоўка вядзецца па **81** спецыяльнасці і **83** напрамках спецыяльнасцяў;
- у магістратуры падрыхтоўка вядзецца па **84** спецыяльнасцях;
- за апошнія тры гады адкрыта **19** новых спецыяльнасцяў і **37** напрамкаў;
- Электронная бібліятэка БДУ ўваходзіць у сотню найлепшых універсітэцкіх бібліятэк свету;
- унікальныя тэхналогіі навучання, укараненне праектнага метаду, развіццё стартапаў, выкарыстанне дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій і электроннага навучання.

### БДУ – гэта акно ў свет, шырокія міжнародныя сувязі:

- **звыш тысячы** студэнтаў штогод удзельнічаюць у міжнародных праграмах акадэмічнага абмену;
- БДУ мае міжнародныя дамовы пра супрацоўніцтва больш чым з **360** адукацыйнымі і навуковымі ўстановамі з **54** краін;
- у ліку студэнтаў БДУ звыш **2400** замежных грамадзян з **50** краін.

### БДУ – беспрэцэдэнтныя магчымасці інтэлектуальнага росту і навуковай кар'еры:

- **4** навукова-даследчыя інстытуты, 6 навуковых цэнтраў, **10** інавацыйных вытворчых прадпрыемстваў, **41** навукова-даследчая лабараторыя;
- больш за **40** студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый прыродазнаўчага і гуманітарнага напрамкаў;
- **132** спецыяльнасці аспірантуры;
- **першы** ўніверсітэцкі нанаспадарожнік, распрацоўка лекавых прэпаратаў, унікальных біятэхналогій і нанаматэрыялаў;
- рэалізацыя поўнага цыкла «навуковая ідэя – распрацоўка – вытворчасць – рэалізацыя прадукцыі».

### БДУ – гэта ўнікальныя выпускнікі:

- паводле міжнароднага рэйтынгу ўніверсітэтаў, па ўзроўні занятасці выпускнікоў БДУ займае **115-е** месца ў свеце, а па ўзроўні прафесійных дасягненняў – **172**;
- за 95 гадоў працы ўніверсітэт падрыхтаваў больш за **160 тысяч** спецыялістаў, сярод якіх больш за **4500** кандыдатаў і больш за **670** дактароў навук;
- сярод выпускнікоў БДУ – лідары IT-індустрыі, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання і прадпрыемстваў, аўтарытэтныя юрысты і эканамісты, выбітныя дзеячы культуры і мастацтва, спартсмены.

### БДУ – выдатная пляцоўка для грамадскай, творчай і спартыўнай рэалізацыі:

- багатыя традыцыі студэнцкага самакіравання: **7** грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання;
- **8** творчых калектываў, **138** творчых аб'яднанняў і клубаў;
- спарткомплекс «Універсітэцкі», **23** спартыўныя секцыі і больш за **100** груп спартыўнага ўдасканалення.

# Біялагічны факультэт

*Дэкан – кандыдат біялагічных навук дацэнт Уладзімір Васільевіч ЛЫСАК*
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 10. Тэл. 2095808, 2095902, 2095805.*
*Факс 2095808. E-mail: bio@bsu.by; www.bio.bsu.by*













## Прафесія біёлага – прафесія будучыні!

**Біялагічны факультэт – самы вялікі сярод прыродазнаўчых факультэтаў.**

На факультэце дзейнічаюць **9 кафедраў**, **9** навукова-даследчых лабараторый, заалагічны музей, батанічны сад, гербарый, вучэбная лабараторыя вылічальнай тэхнікі і тэхнічных сродкаў навучання і вучэбна-навуковы цэнтр «Нарачанская біялагічная станцыя імя Г. Г. Вінберга». Функцыянуюць 9 філіялаў кафедраў на базе навуковых устаноў Нацыянальнай акадэміі навук, прыродаахоўных устаноў і прамысловых прадпрыемстваў. Працуюць **3** акадэмікі, **2** члены-карэспандэнты НАН Беларусі, **19** дактароў і **85** кандыдатаў навук.

Навучаюцца больш за **2000 студэнтаў**, **33** магістранты і **35** аспірантаў.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Падрыхтоўка спецыялістаў на дзённым аддзяленні вядзецца па 4 спецыяльнасцях: **«Біялогія»** (напрамкі «навукова-вытворчая дзейнасць», «навукова-педагагічная дзейнасць» і «біятэхналогія»), **«Біяэкалогія»**, **«Біяхімія»** і **«Мікрабіялогія»**. Студэнты атрымліваюць адну з 6 кваліфікацый: *«Біёлаг», «Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі», «Біёлаг-біятэхнолаг. Выкладчык біялогіі», «Біёлаг-эколаг. Выкладчык біялогіі і экалогіі», «Біёлаг. Біяхімік» і «Біёлаг. Мікрабіёлаг».* На завочным аддзяленні падрыхтоўка вядзецца па спецыяльнасцях «Біялогія» (напрамкі: «навукова-вытворчая дзейнасць» і «навукова-педагагічная дзейнасць»), «Біяэкалогія», «Біяхімія» і «Мікрабіялогія».

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Дзейнічаюць дзевяць студэнцкіх навуковых гурткоў, чатыры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі: малекулярнай біятэхналогіі; прыкладных праблем раслiннай клеткі і біятэхналогіі раслін; структуры і дынамікі біяразнастайнасці; біяінфарматыкі і малекулярнай эвалюцыі жывёл. У мінулым годзе студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя структуры і дынамікі біяразнастайнасці ў конкурсе БДУ на найлепшую СНДЛ заняла 2 месца, а таксама была адзначана (дыплом I ступені) у намінацыі «Уклад СНДЛ у падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі».

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі факультэта могуць працаваць супрацоўнікамі навукова-даследчых інстытутаў, на прадпрыемствах фармацэўтычнай, біяхімічнай, мікрабіялагічнай, ветэрынарнай і харчовай прамысловасці, аграпрамысловага комплексу, на прадпрыемствах, якія выпрабляюць касметыку, у экспертна-крыміналістычных цэнтрах, у запаведніках, заказніках, нацыянальных парках, батанічных садах, на селекцыйных станцыях, ва ўстановах Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у сістэме Дзяржкамгідрамета, у сертыфікацыйных, экспертна-аналітычных, мытных установах, выкладчыкамі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў і г. д.

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Штогод супрацоўнікамі факультэта выконваецца больш за 100 навукова-даследчых праектаў, з якіх вялікая колькасць з'яўляецца гаспадарчымі дамовамі. Праведзенне навуковых даследаванняў у рамках усіх праектаў ажыццяўляюць таксама і студэнты, многія на платнай аснове. Кафедры і лабараторыі маюць шырокія і трывалыя партнёрскія адносіны з рознымі навуковымі і адукацыйнымі цэнтрамі блізкага і далёкага замежжа ў рамках заключаных дамоў аб міжнародным навуковым і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. У бягучым годзе факультэт удзельнічае ў выкананні 2 міжнародных кантрактаў.

### ЗАБЯСПЕЧАНАСЦЬ ІНТЭРНАТАМ

У адпаведнасці з рашэннем Савета БДУ месцамі для пражывання ў інтэрнатах забяспечваюцца ўсе іншагароднія першакурснікі факультэта. На старэйшых курсах забяспечанасць студэнтаў месцамі для пражывання ў інтэрнатах складае 73 %. Большасць іншагародніх студэнтаў пражывае ў інтэрнаце № 10, размешчаным у непасрэднай блізкасці ад корпуса біялагічнага факультэта.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

На факультэце функцыянуюць розныя творчыя аб'яднанні і калектывы: «Біятэатр», рэдкалегія газеты Vita, рэдкалегія малатыражнай газеты Fresh і іншыя. Адной з традыцый біялагічнага факультэта з'яўляецца штогадовае правядзенне двух агульнафакультэцкіх святаў – пасвячэнне першакурснікаў у студэнты і дні біёлага. Падобныя падзеі маюць месца і на многіх іншых факультэтах, але толькі на біяфаку вось ужо больш за 40 гадоў гэтыя святы – не толькі святочныя мерапрыемствы для студэнтаў і выкладчыкаў, але і час традыцыйных сустрэч выпускнікоў факультэта. Падрыхтоўкай святочных праграм займаецца «Біятэатр» – саюз творчых людзей, якія імкнуцца зрабіць больш разнастайным і вясёлым жыццё на факультэце. Кожная пастаўленая «Біятэатрам» п'еса арыгінальная і ставіцца на сцэне толькі адзін раз, і гэта таксама непарушная традыцыя.

### ШКОЛА ЮНАГА БІЁЛАГА

На факультэце з 2011 г. працуе «Школа юнага біёлага». Слухачамі школы могуць стаць вучні 9–11 класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. Праграма навучання разлічана на 2 гады і накіравана на паглыбленае вывучэнне біялогіі. Заняткі праводзяць кваліфікаваныя выкладчыкі факультэта.

### ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Алег БАРАДЗІН, генеральны дырэктар Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах», дацэнт. Выпускнік 2000 г.**



*– Біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – гэта ўнікальная школа жыцця, прайшоўшы якую, можна смела называць сябе сапраўдным біёлагам. У свой час мне пашанцавала, і я трапіў у сцены роднага біяфака. Родным ён застаецца і зараз. Менавіта гады студэнцтва канчаткова вызначылі мой жыццёвы выбар і напрамак маёй спецыялізацыі. Наступнае навучанне ў магістратуры, аспірантуры, потым праца лабарантам, асістэнтам і, нарэшце, дацэнтам кафедры заалогіі канчаткова пераканалі мяне ў правільнасці раней зробленага выбару. Калектыў біёлагаў-прафесіяналаў з вялікім педагагічным вопытам, традыцыі, якія фарміруюца дзесяцігоддзямі, а таксама навуковыя школы, вялікая колькасць выбітных выпускнікоў, якія ігралі і іграюць зараз ключавыя ролі ў развіцці сучаснай біялогіі і ствараюць імідж і антураж біяфака.*

**Алена ЛІТВІНАВА, начальнік упраўлення інавацыйнага развіцця РУП «Белмедпрэпараты», кандыдат біялагічных навук. Выпускніца 1989 г.**



*– Не магу сказаць, што ў дзяцінстве і юнацтве марыла стаць біёлагам, хоць вельмі любіла прыроду. Прыцягвала прафесія ўрача, хіміка, педагога. Выбар на карысць біялогіі быў заснаваны, хутчэй, на сямейнай традыцыі: бацькі скончылі біялагічны факультэт БДУ і заставаліся адданымі атрыманай прафесіі ўсё жыццё. Але я ўвогуле не шкадую пра свой выбар! Бо, стаўшы біёлагам, я адначасова стала і хімікам, і педагогам, і нават трохі ўрачом. І нічога дзіўнага ў гэтым няма, бо праграма навучання на факультэце ўключае вялікую колькасць спецыяльных і дадатковых дысцыплін, вывучэнне якіх спрыяе фарміраванню не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў, але і ўсебакова развітых асоб.*

*Воляю лёсу пасля працы на факультэце я патрапіла ў рэальны сектар эканомікі – на РУП «Белмедпрэпараты». Зараз узначальваю ўпраўленне інавацыйнага развіцця. Здавалася б, якая сувязь фармацэўтыкі з біялогіяй? Самая непасрэдная! Біялагічная адукацыя дазваляе рэалізаваць сябе і ў гэтай сферы, у прыватнасці пры вызначэнні падыходаў да распрацоўкі біялагічных і хімічных метадаў кантролю якасці лекаў, да тэхналогій атрымання біялагічна актыўных злучэнняў і прэпаратаў на іх аснове з выкарыстаннем біятэхналагічных працэсаў. А гэтыя веды – вынік навучання на біялагічным факультэце!*

*Жадаю ўсім здароўя і дабрабыту, а роднаму біяфаку – росквіту!*

# Юрыдычны факультэт

*Дэкан – доктар юрыдычных навук, прафесар Сяргей Аляксандравіч БАЛАШЭНКА*
*Адрас: Мінск, вул. Ленінградская, 8. Тэл./факс 2095230.*
*E-mail: law@bsu.by; www.law.bsu.by*

**Юрыдычны факультэт БДУ – гэта прэстыж, творчасць, будучыня, фундаментальныя веды, выдатная прафесійная падрыхтоўка!**

Выкладчыцкі склад: **27** дактароў навук і прафесараў (у тым ліку **1** член-карэспандэнт НАН Беларусі), **153** кандыдаты юрыдычных навук, **73** выкладчыкі без вучоных ступеняў. На факультэце **11 кафедраў**, «Юрыдычная клініка» і **3** вучэбныя кабінеты: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, прававой інфарматыкі. Навучаецца больш за **2,7 тыс. студэнтаў**, магістрантаў, аспірантаў.







**Дыплом юрфака БДУ – гарантыя паспяховай кар'еры і максімальнай самарэалізацыі!**

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па трох спецыяльнасцях: **«Правазнаўства»** – кваліфікацыя *«Юрыст»*; **«Паліталогія»** – кваліфікацыя *«Палітолаг-юрыст»* і **«Эканамічнае права»** – кваліфікацыя *«Юрыст з веданнем эканомікі»*. Па спецыяльнасці «Правазнаўства» прапануецца таксама завочная форма навучання, у тым ліку для асоб, якія атрымліваюць другую вышэйшую адукацыю.

Студэнты-правазнаўцы спецыялізуюцца па 10 напрамках: арганізацыя і дзейнасць дзяржаўных органаў, гаспадарчае права, судова-пракурорска-следчая дзейнасць, адвакатура і натарыят, падатковае і банкаўскае права, параўнальнае правазнаўства, прававое забеспячэнне камерцыйнай дзейнасці, прававое рэгуляванне фінансаў і крэдыту, палітыка і дзяржаўнае кіраванне, еўрапейскае эканамічнае права.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Вучэбны працэс спалучае класічную форму выкладання з новымі адукацыйнымі тэхналогіямі. Юрыдычны факультэт забяспечаны сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, аб'яднанымі лакальнай сеткай. Прафесійныя навыкі студэнты набываюць на семінарскіх і практычных занятках, вучэбных і вытворчых практыках, у «Юрыдычнай клініцы».

На факультэце створаны ўсе ўмовы для вучэбнай, навуковай дзейнасці і рэалізацыі творчых здольнасцяў студэнтаў. На працягу навучальнага года праводзяцца студэнцкія навуковыя канферэнцыі, конкурсы навуковых работ, функцыянуе форум на афіцыйным сайце юрыдычнага факультэта, дзейнічаюць студэнцкія органы самакіравання, на кафедрах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі.

### МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Юрыдычны факультэт БДУ ажыццяўляе цеснае і плённае міжнароднае супрацоўніцтва ў адукацыйнай і навуковай дзейнасці. У цяперашні час асноўнымі замежнымі партнёрамі факультэта выступаюць:

1. Арганізацыя еўрапейскага публічнага права (EPLO);
2. Інстытут заканазнаўства і кіравання Усерасійскай паліцэйскай асацыяцыі, г. Тула;
3. Інстытут Луі Фаваро Універсітэта Экс-Марсэль;
4. Кіеўскі ўніверсітэт права;
5. Кубанскі дзяржаўны ўніверсітэт;
6. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава;
7. Патсдамскі ўніверсітэт;
8. Расійская дзяржаўная акадэмія інтэлектуальнай уласнасці;
9. Саратаўская дзяржаўная юрыдычная акадэмія;
10. Універсітэт Бін-Зыонг (В'етнам);
11. Універсітэт Усходні Парыж — Нантэр-ля-Дэфанс;
12. Філіпс-універсітэт г. Марбурга;
13. Хмяльніцкі інстытут рэгіянальнага кіравання і права.

Асноўнымі напрамкамі міжнароднага супрацоўніцтва з'яўляюцца:

1. Запрашэнне прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага складу замежных дзяржаў для чытання лекцый і правядзення семінараў для студэнтаў факультэта па найбольш актуальных пытаннях прававой навукі і практыкі.
2. Конкурс ICC Lex Mercatoria – штогадовы міжнародны конкурс студэнцкіх каманд па міжнародным гандлёвым праве і міжнародным камерцыйным арбітражы.
3. Міжнародная навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, якая праводзіцца па найбольш актуальных пытаннях права і аб'ядноўвае ўдзельнікаў з замежных дзяржаў.
4. Міжнародны летні ўніверсітэт пры ўзаемадзеянні з Патсдамскім універсітэтам і Універсітэтам Усходні Парыж — Нантэр-ля-Дэфанс.
5. Сумесная Навукова-метадычная і адукацыйная дзейнасць з замежнымі калегамі, сярод якіх асноўнымі партнёрамі выступаюць: Global Alliance for Justice Education (GAJE), European Network for Clinical Legal Education (ENCLE), Цэнтр развіцця юрыдычных клінік (заключана пагадненне аб супрацоўніцтве), Інстытут правоў чалавека і гуманітарнага права імя Р. Валенберга, Швецыя (The Raoul Wallenberg Institute of Human Rights and Humanitarian Law), Універсітэт Палацкага ў Аламоўцы (Чэхія), Фонд юрыдычных клінік Польшчы.
6. Удзел у міжнароднай адукацыйнай праграме Erasmus.
7. Удзел у праекце Еўрапейскага саюза па пашырэнні прафесійных кантактаў паміж грамадзянамі ЕС і Беларусі (MOST) і інш.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь на факультэце штогод праводзіцца Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда. На базе музея правазнаўства працуе гісторыка-патрыятычны цэнтр «Памяць».

Вучэбная лабараторыя «Юрыдычная клініка» – гэта структурнае падраздзяленне юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якое займаецца навучаннем студэнтаў практычным навыкам юрыста праз ажыццяўленне імі бясплатнага прававога інфармавання і кансультавання малазабяспечаных і сацыяльна неабароненых катэгорый грамадзян пад кіраўніцтвам выкладчыкаў-куратараў.

На дадзены момант вучэбная лабараторыя «Юрыдычная клініка» супрацоўнічае з агульнаадукацыйнымі навучальнымі ўстановамі горада Мінска, а таксама грамадскімі арганізацыямі: ДУА «Гімназія № 29 г. Мінска»; ДУА «Сярэдняя школа № 37 г. Мінска»; ДУА «Сярэдняя школа № 116 г. Мінска»; ДУА «Ліцэй № 1 г. Мінска»; грамадская арганізацыя «Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў».

Фонд бібліятэкі юрфака складае звыш 200 тыс. выданняў, у тым ліку і ўнікальных (XVIII – пачатак XX стст.).

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Юрыдычны факультэт БДУ сёння – вядучы вучэбны і навуковы цэнтр падрыхтоўкі кадраў прафесіяналаў-юрыстаў, здольных паспяхова працаваць як у сваёй краіне, так і за яе межамі. Нашы выпускнікі працуюць у заканадаўчых і выканаўчых органах улады, у судовай сістэме дзяржавы, у праваахоўных органах, адвакатуры, натарыяце, на прадпрыемствах усіх формаў уласнасці. Сярод выпускнікоў – міністры, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі ўстаноў і арганізацый. Выпускнікі факультэта ўзначальваюць Канстытуцыйны і Вярхоўны суды, Міжнародны арбітражны суд пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце, Міжнародны арбітражны (трацейскі) суд «Палата арбітраў пры Саюзе юрыстаў», Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў, Суд Еўразійскага эканамічнага саюза, Эканамічны суд СНД, Рэспубліканскую калегію адвакатаў, Саюз пісьменнікаў Беларусі, грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў», займаюць кіраўнічыя пасады ў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь.

### ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:**



*– Юрыдычны факультэт БДУ – заснавальнік беларускай юрыдычнай адукацыі і навукі, які даў пуцёўку ў прафесійнае жыццё больш чым 25 тысячам юрыстаў. Менавіта дзякуючы юрфаку забяспечвалася станаўленне і развіццё сучаснай беларускай дзяржаўнасці і яе заканадаўства.*

*Сёння факультэт – гэта самабытная моцная юрыдычная школа з багатай гісторыяй, пашыраная міжнароднымі сувязямі, а дыплом юрфака БДУ – гэта сведчанне высокай прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў-юрыстаў, здольных на здзяйсненне сацыяльна-эканамічнага ўздыму беларускай дзяржавы і яе паспяховай інтэграцыі ў сусветную супольнасць.*

**Аляксандр КАНЮК, Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь, дзяржаўны саветнік юстыцыі першага класа:**



*– На юрфаку працуюць сапраўды таленавітыя навукоўцы і педагогі. Яго выпускнікі паспяхова працуюць у шматлікіх дзяржаўных органах. Спецыялісты юрфака зрабілі важкі ўнёсак у навуковае забеспячэнне дзейнасці органаў пракуратуры Беларусі і ўкараненне вынікаў даследаванняў у практыку. Перакананы, што невычэрпны патэнцыял прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта будзе спрыяць фарміраванню прававой дзяржавы і развіццю прававой культуры.*

# Механіка-матэматычны факультэт

*Дэкан – кандыдат фіз.-мат. навук дацэнт Дзмітрый Георгіевіч МЯДЗВЕДЗЕЎ*
*Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4. Тэл. 209-50-46, 209-52-49.*
*E-mail: mmf@bsu.by; www.mmf.bsu.by*

У структуры факультэта **10 кафедраў**, **1** НДЛ, **4** СНДЛ, **2** цэнтры, **4** філіялы. Тут працуюць **5** акадэмікаў НАН Беларусі, **1** член-карэспандэнт НАН Беларусі, **39** дактароў навук, **92** кандыдаты навук. Навучаюцца **1134 студэнтаў**, **153** магістранты, **43** аспіранты.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Факультэт вядзе набор па наступных спецыяльнасцях: «Механіка і матэматычнае мадэляванне», «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі (па напрамках)», «Камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз», «Матэматыка (па напрамках)».

У рамках спецыяльнасці **«Механіка і матэматычнае мадэляванне»** вядзецца падрыхтоўка па розных напрамках сучаснай механікі і выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у механіцы. Студэнты асвойваюць такія сучасныя напрамкі, як «Фундаментальныя і прыкладныя праблемы механікі суцэльных асяроддзяў», «САПР і робататэхніка ў механіцы», «Камп'ютарная механіка», «Біямеханіка» і «Механіка нанасістэм».

Выпускнікі спецыяльнасці «Механіка і матэматычнае мадэляванне» будуць працаваць у навукова-даследчых установах; канструктарскіх і праектных арганізацыях; ва ўстановах і арганізацыях, звязаных з праграмаваннем, а таксама мадэляваннем (матэматычным і камп'ютарным) механічных працэсаў і механізмаў. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Механік. Матэматык-прыкладнік»*.

Падрыхтоўка па спецыяльнасці **«Матэматыка»** адбываецца па асобных навучальных планах у адпаведнасці з сённяшнімі патрабаваннямі з вывучэннем найноўшых камп'ютарных сістэм, што дае магчымасць размеркавання ў прэстыжныя IT-кампаніі.

Выпускнікам навукова-вытворчага напрамку даецца кваліфікацыя *«Матэматык»*. Яны працуюць у навучальных установах, НДІ, канструктарскіх бюро, інфармацыйных цэнтрах, на прадпрыемствах, у банках і інш.

Студэнты навукова-педагагічнага напрамку атрымліваюць кваліфікацыю *«Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі»*.

Напрамак «Эканамічная дзейнасць» мае эканамічны ўхіл. Выпускнікі працуюць як прафесійныя матэматыкі ў даследчых установах, а таксама як эканамісты-матэматыкі – у банках, страхавых фірмах, агенцтвах па продажы нерухомасці і г. д. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Матэматык-эканаміст»*.

Выпускнікі напрамку «Навукова-канструктарская дзейнасць» працуюць у айчынных і замежных даследчых установах, праектных арганізацыях, на прадпрыемствах. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Канструктар праграмна-апаратных сістэм»*.

Выпускнікі спецыяльнасці **«Камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз»** з'яўляюцца спецыялістамі па распрацоўцы, стварэнні і суправаджэнні інфармацыйных сістэм любога ўзроўню; распрацоўцы і выкарыстанні матэматычных метадаў апрацоўкі, назапашвання, надзейнасці захоўвання, перадачы і забеспячэння абароны інфармацыі. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Сістэмны аналітык»*.

На спецыяльнасць **«Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі»** набор праходзіць па двух напрамках: «Вэб-праграмаванне і інтэрнэт-тэхналогіі» і «Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне мабільных прылад».

У рамках гэтых напрамкаў студэнты вывучаюць курсы па асноўных мовах праграмавання, Java і .NET-тэхналогіях, тэхналогіях праектавання і працы з базамі дадзеных, камп'ютарнай бяспецы і абароне інфармацыі.

Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Спецыяліст па інфармацыйных тэхналогіях»*.

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ І РАЗМЕРКАВАННЕ

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца ў цеснай сувязі з навуковымі даследчымі і вытворчымі арганізацыямі, шматлікія з якіх з'яўляюцца базавымі партнёрамі факультэта. Нашы выпускнікі паспяхова працуюць у такіх арганізацыях як: «Эксадэл», «Ітранзішн», «ЭПАМ Сістэмз», «Хайква Салюшанс», «К'юлікс Сістэмс», «Белхард Груп», VPI Systems, «Тэхнабанк», «Беларусбанк», «Мінскі аўтамабільны завод», «СКЭНД», «Атлант», «Інтэграл», «Міжнародны дзелавы альянс», «Белаграпрамбанк», «Беларуськалій», «АГАТ-сістэмы кіравання», Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Белгархімпрам і інш.








### МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У рамках дамовы аб супрацоўніцтве з Універсітэтам Магдэбурга (Германія) рэалізуецца сумесная праграма падрыхтоўкі магістраў па спецыяльнасці «Камп'ютарная матэматыка».

У рамках дамовы аб супрацоўніцтве з Далянскім універсітэтам (Кітай) дзейнічае сумесная праграма падрыхтоўкі па спецыяльнасцях: «Матэматыка», «Механіка і матэматычнае мадэляванне».

У рамках дамовы аб супрацоўніцтве з Таджыкскім нацыянальным універсітэтам функцыянуе сумесная праграма падрыхтоўкі па спецыяльнасці «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі».

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

На факультэце існуюць 4 СНДЛ:

- «Трыбафатыка»;

## Мехмат – адзіны ў краіне, унікальны па змесце дысцыплін

- «Лагічнае праектаванне прылад вылічальнай тэхнікі»;
- Міжкафедральная СНДЛ «Дыскрэтныя структуры і алгарытмы»;
- Міждысцыплінарная СНДЛ «Дыстанцыйная адукацыйныя тэхналогіі».

Дзейнасць СНДЛ накіравана на развіццё кампетэнцый, неабходных для паспяховай прафесійнай працы.

### ЗАБЕСПЕЧАНАСЦЬ ІНТЭРНАТАМ

Заселенасць у інтэрнат у 2017/2018 навуч. годзе склала 84 % ад усіх ахвотнікаў, уключаючы 100 % іншагародніх студэнтаў 1 курса.

Лагістыка з месцам вучобы:

Інтэрнат № 7: вул. Кастрычніцкая, 10Б. Праезд ад чыгуначнага вакзала аўтобусам № 127, трамваем № 1, № 3, № 7.

Інтэрнат № 3: вул. Курчатава, 6. Праезд ад чыгуначнага вакзала аўтобусам № 47с.

Інтэрнат № 11: пр. Дзяржынскага, 87. Праезд на метро да станцыі «Пятроўшчына».

### КАРПАРАТЫЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Студэнты мехмата паспяхова выступаюць у «Капусніку БДУ»: 1-е месца ў 2016 годзе, 3-е месца ў 2017 годзе. Дні механіка-матэматычнага факультэта з удзелам выпускнікоў розных гадоў дэманструюць невычарпальную фантазію і творчыя здольнасці студэнтаў. У красавіку 2018 года факультэт святкуе сваё 60-годдзе!

### ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНЫЯ КУРСЫ

На факультэце для навучэнцаў 5–11 класаў, якія цікавяцца матэматыкай, арганізаваны заняткі ў «Школе юнага матэматыка», якую штогод наведвае каля 400 вучняў.

- Праграма для 5–8 класаў накіравана на падрыхтоўку да рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд.
- Для 9–11 класаў прадугледжана праграма, якая ўключае не толькі рашэнне алімпіядных задач, але і падрыхтоўку да навучання на механіка-матэматычным факультэце БДУ.

На факультэце створана і працуе дыстанцыйная матэматычная школа
http://mmf.bsu.by/ru/distantsionnaya-matematicheskaya-shkola/

### ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Сяргей ЧЫЖЫК, выпускнік 1980 года, першы намеснік старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук.**



– Факультэт навучыў нас правільна, лагічна думаць, аналізаваць і збіраць дадзеныя. Гэта асабліва важна, калі чалавек збіраецца працаваць у навуцы, таму што матэматыка патрэбная ў любой сферы навукі, няхай гэта будзе фізіка, хімія, эканоміка, ці іншая галіна.

Засвоіць праграму навучання не проста, аднак гэта акупіцца ў далейшым, таму што за час вучобы вы, канешне, даведзяце да ладу свае думкі, навучыцеся навыкам працы з літаратурай, авалодаеце складанымі матэматычнымі дысцыплінамі. Вядома ж, гэта вельмі важна для Вашага наступнага працаўладкавання.

**Аляксандр МАШЭНСКІ, выпускнік 1992 года, генеральны дырэктар СП «Санта Імпэкс Брэст».**



*– Вызначальным для мяне пры паступленні на механіка-матэматычны факультэт стала тое, што мяне будуць вучыць высокапрафесійныя выкладчыкі. У мяне не было сумненаў у тым, што я атрымаю якасную адукацыю.*

*Мне сапраўды пашанцавала, што гады вучобы прайшлі менавіта тут, дзе базавыя дысцыпліны, спорт і зносіны даюць магчымасць фарміраваць сябе не толькі як прафесіянала, а таксама як асобу.*

*Тыя навыкі, якія я атрымаў падчас вучобы, дапамаглі мне дасягнуць поспехаў у тым, чым я займаюся цяпер.*

*У сваім жыцці я сустракаю вялікую колькасць паспяховых людзей, моцных кіраўнікоў, выбітных лідараў, прычым мяне асабліва цешыць тое, што сярод іх значную частку складаюць выпускнікі мехмата БДУ.*

**Максім МІХАЛЁЎ, выпускнік 2006 года, заснавальнік кампаніі ARTOX.**



*– Мехмат вучыць думаць, аналізаваць, прымаць рашэнні – гэта тыя фундаментальныя навыкі, якія дазваляюць развівацца і разбірацца ў самых розных сферах. Мой выпуск прыйшоўся на час станаўлення IT-індустрыі ў краіне. Яшчэ не было такога попыту на выпускнікоў. Мы адчувалі, што сталі вельмі разумнымі, але кожны сутыкнуўся з праблемай, дзе ўжыць свае веды. Мяне ўніверсітэт звёў з самымі лепшымі сябрамі, і разам мы адкрылі IT-кампанію, у якой праз тры гады ўжо працавалі больш за 100 чалавек. Выпускнікі мехмата з пазіцыі стажораў за год вырасталі па кар'ернай лесвіцы да кіраўнікоў аддзелаў. База, якую нам даў мехмат, дазволіла вельмі хутка выявіць сябе і дамагчыся поспеху і ў зусім іншых галінах.*

*Я вельмі рады таму, як развіваецца IT-індустрыя. На рынку з'явіліся кампаніі, якія займаюцца камп'ютарным праектаваннем, робататэхнікай. Гэта адкрывае новыя бліскучыя перспектывы для выпускнікоў нашага факультэта.*

# Факультэт міжнародных адносін

*Дэкан – доктар гістарычных навук прафесар Віктар Генадзьевіч ШАДУРСКІ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20. Тэл. 2095977. Факс 2095742.*
*E-mail: fir@bsu.by; www.fir.bsu.by*

***ФМА створаны 1 кастрычніка 1995 г. На 13 кафедрах факультэта працуе болей за 300 выкладчыкаў, з якіх 17 дактароў і 95 кандыдатаў навук.***

Каля **2000 студэнтаў**, магістрантаў і аспірантаў навучаюцца на ФМА, у тым ліку каля 400 замежных навучэнцаў з 25 краін свету.

За гісторыю свайго існавання факультэт выпусціў больш за 6000 спецыялістаў і звыш 500 магістрантаў.

Толькі на нашым факультэце прапануецца такі шырокі выбар замежных моў. Студэнты ўсіх спецыяльнасцяў вывучаюць прынамсі дзве замежныя мовы з **18**, што выкладаюцца на факультэце.





**На ФМА студэнты вывучаюць дзве замежныя мовы з 18, што выкладаюцца на факультэце**

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

На факультэце вядзецца падрыхтоўка па 6 спецыяльнасцях (18 спецыялізацый) на I ступені вышэйшай адукацыі:

**Міжнародныя адносіны** (спецыялізацыі: знешняя палітыка і дыпламатыя, міжнародныя арганізацыі, арганізацыя міжнародных сувязяў)

**Міжнароднае права** (спецыялізацыі: міжнароднае публічнае права, міжнароднае прыватнае права, еўрапейскае права)

**Сусветная эканоміка** (спецыялізацыі: кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю, знешнегандлёвая і камерцыйная дзейнасць)

**Менеджмент** (напрамак «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму»)

(спецыялізацыі: менеджмент уязнога і выязнога турызму, менеджмент агра- і экалагічнага турызму, менеджмент гасціннасці)

**Мытная справа** (спецыялізацыі: прававое забеспячэнне мытнай дзейнасці, эканамічнае забеспячэнне мытнай дзейнасці, мытная лагістыка)

**Лінгвакраіназнаўства** (спецыялізацыі: лінгвакраіназнаўства Блізкага і Сярэдняга Усходу, лінгвакраіназнаўства Далёкага Усходу)

### ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ

У нас вывучаюцца замежныя мовы:

англійская, французская, італьянская, іспанская, партугальская, шведская, нямецкая, польская, чэшская, кітайская, карэйская, японская, персідская, арабская, іўрыт, хіндзі, турэцкая, руская мова як замежная

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

На факультэце актыўна функцыянуюць органы студэнцкага самакіравання і грамадскія аб'яднанні: савет старастаў, прафсаюзнае бюро, студэнцкі саюз, пярвічная арганізацыя БРСМ, дыскусійныя клубы і інш. Удзельнічаючы ў іх дзейнасці, студэнты могуць развіць свае арганізатарскія і камунікатыўныя навыкі.

На факультэце з удзелам студэнтаў развіваецца інтэрнэт-сайт, выдаецца студэнцкая газета ФМОn-line.

З 1999 года факультэт міжнародных адносін першым у краіне пачаў праводзіць «Мадэляванне ААН». Гэта ролевая гульня праходзіць на англійскай мове двойчы на год – у красавіку і лістападзе.

### ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ

На ФМА рэгулярна арганізуюцца сустрэчы студэнтаў і выкладчыкаў з дзяржаўнымі і палітычнымі дзеячамі, вядомымі навуковымі, беларускімі і замежнымі дыпламатамі, кіраўнікамі міністэрстваў і ведамстваў, прадстаўнікамі найбуйнейшых сусветных карпарацый, прадпрыемстваў і арганізацый, дзеячамі культуры і мастацтва.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Актыўна развіваецца студэнцкая навука: студэнты прымаюць актыўны ўдзел у канферэнцыях, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах, працы 6 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, а таксама каля 15 навуковых гурткоў і клубаў, дзе кожны ахвотнік знойдзе сабе сферу па інтарэсах, пісьменнае кіраўніцтва з боку нашых выкладчыкаў, а таксама матывацыйнае асяроддзе і каворкінг з калегамі па студэнцкай лаве.



*Студэнткі спецыяльнасці «Міжнароднае права», лаўрэаты прэстыжнага міжнароднага конкурсу па мадэляванні Суда ААН у Вашынгтоне (ЗША)*



*Мадэляванне дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый на ФМА*

Выпускаецца зборнік навуковых артыкулаў студэнтаў, аспірантаў і магістрантаў (выдадзена 18 выпускаў.)

Факультэт арганізуе буйную штогадовую студэнцкую канферэнцыю ў красавіку, дзе арганізавана каля 60 секцый. Даклады пераможцаў публікуюцца.

І гэта яшчэ не ўсё! У 2017 годзе, прысвечаным навуцы, на ФМА БДУ прайшоў Тыдзень студэнцкай навукі.

ФМА рэгулярна праводзіць навуковыя мерапрыемствы, асноўнымі з якіх з'яўляюцца міжнародныя канферэнцыі «Беларусь у сучасным свеце» і «Міжкультурная камунікацыя і прафесійна арыентаванае навучанне замежным мовам» (штогод у канцы кастрычніка).

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Сёння выпускнікі ФМА працуюць у Міністэрстве замежных спраў, Дзяржаўным мытным камітэце, практычна ва ўсіх міністэрствах і ведамствах краіны, у структурах міжнародных арганізацый. Значная частка выпускнікоў звязала сваю працоўную кар'еру з рэальным сектарам эканомікі, паспяхова развівае ўласны бізнес, працягвае навукова-педагагічную кар'еру. Факультэт рэгулярна атрымлівае вусныя і пісьмовыя падзякі, у якіх адзначаюцца высокія прафесійныя і маральныя якасці прадстаўнікоў нашага вялікага і згуртаванага калектыву.

### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Магчымасць навучання за мяжой для студэнтаў факультэта рэалізуецца пасродкам акадэмічных абменаў у рамках дамоў пра супрацоўніцтва паміж БДУ і замежнымі ВНУ, а таксама ў рамках праграм акадэмічнай мабільнасці. На працягу навучальнага года некалькі сотняў студэнтаў ФМА БДУ бяруць удзел у розных праграмах акадэмічнай мабільнасці. Гэта не толькі кароткатэрміновыя візіты, канферэнцыі, семінары, конкурсы ці адна-двухтыднёвыя школы. Гэта яшчэ і навучанне на працягу ад 3 месяцаў да года ў прэстыжных універсітэтах свету, уключаючы краіны Заходняй Еўропы, Амерыкі, Кітай, Паўднёвую Карэю, Японію, Расію і шматлікія іншыя дзяржавы.

Усё, што патрабуецца ад студэнтаў для ўдзелу ў такіх праграмах акадэмічнай мабільнасці, – веды замежнай мовы, добрая вучоба і ініцыятыва! Адкрыйце для сябе свет адукацыі разам з намі!

Чакаем вас на факультэце міжнародных адносін БДУ!

### ШКОЛЫ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

Для вучняў выпускных класаў на факультэце працуюць:

**«Школа будучага мытніка»** для дзяцей, што мараць пра кар'еру ў сферы мытнай справы. Галоўная мэта школы – кампетэнтная дапамога ў прафесійнай арыентацыі абітурыента, дапамога ў першых кроках да будучай прафесіі: мытнага інспектара і мытнага дэкларанта. Заняткі праводзяць выкладчыкі кафедры мытнай справы і супрацоўнікі Мінскай рэгіянальнай мытні. Пры паспяховым заканчэнні курс выдаецца сертыфікат. Навучанне бясплатнае.

**«Школа будучага лагіста-міжнародніка»**. Галоўная мэта школы – аказанне дапамогі на шляху да будучай прафесіі міжнароднага і мытнага лагіста, спецыяліста па кіраванні ланцугамі паставак, падрыхтоўка да сур'ёзнага выбару будучай прафесіі. Заняткі праводзяць выкладчыкі кафедры мытнай справы і супрацоўнікі міжнародных лагістычных кампаній. Пры паспяховым заканчэнні выдаецца сертыфікат. Навучанне бясплатнае.

### ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ:

**Аляксандра ШКОДА, выпускніца спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны», 2015 г. Працуе трэцім сакратаром упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі МЗС Беларусі**



*– Што для мяне ФМА? Адказ на гэта пытанне і лёгкі, і складаны адначасова. Мой ФМА – гэта людзі. Каманда высакакласных, высокакваліфікаваных, закаханых у сваю справу прафесіяналаў. Гэта свет магчымасцяў. Кароткатэрміновыя, доўгатэрміновыя стажыроўкі, праграмы абмену, навучальныя курсы, міжнародныя канферэнцыі і сімпозіумы – факультэт міжнародных адносін адкрывае перад студэнтамі велізарны акадэмічны свет без межаў і бар'ераў. А валоданне дзвюма замежнымі мовамі становіцца прыемным бонусам! Гэта і насычанае жыццё. Сустрэчы з беларускімі і замежнымі дыпламатамі, прадстаўнікамі палітычнага істэблішменту нашай краіны, замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый. Мой ФМА – гэта сям'я, увайшоўшы ў якую, ты назаўжды становішся яе часткай.*

**Таццяна МІХАЛЁВА, выпускніца спецыяльнасці «Міжнароднае права» 2001 г., саветнік экспертна-аналітычнага аддзела сакратарыята Суда Еўразійскага эканамічнага саюза, кандыдат юрыдычных навук**

*– Спецыяльнасць «Міжнароднае права» адчыняе дзверы ў свет міжнароднай юрыспрудэнцыі – веды прававых асноў фарміравання і рэалізацыі міжнародных абавязацельстваў, функцыянавання міжнародных арганізацый, судоў, інтэграцыйнага ўзаемадзеяння. Адукацыя, якую дае факультэт па спецыяльнасці «Міжнароднае права», унікальная. Студэнты атрымліваюць веды і нацыянальнага права, і міжнароднага і, вядома, важкі моўны базіс: як мінімум 2 актыўныя замежныя мовы. Выкарыстоўвайце ўсе магчымасці сваёй самай радаснай пары – студэнцтва: удзельнічайце ў конкурсах, канферэнцыях, стажыроўках, пашырайце і паглыбляйце свае веды!*

**Марына ГРЫЧЫК, выпускніца спецыяльнасці «Сусветная эканоміка» 2012 г., начальнік упраўлення макраэканамічнай палітыкі Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь**

*На факультэце міжнародных адносін я атрымала тое, што і павінна даваць адукацыя. Інфармацыю. Перспектыву, з якой на яе глядзець. Логіку, як яе аналізаваць. Людзей, з якімі яе абмяркоўваць. Выкладчыкаў, у якіх заўсёды працягваеш вучыцца.*

*Менавіта ФМА я дзякую за тое, што чытаю The Economist, веду рэгулярнасць выхаду аглядаў рынкаў сыравінных тавараў міжнародных арганізацый і маю спіс кантактаў людзей, з кім можна абмеркаваць падзеі, якія не друкуюць у навінах і дакладах.*

# Геаграфічны факультэт

*Дэкан – доктар сельскагаспадарчых навук прафесар Мікалай Васільевіч КЛЕБАНОВІЧ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16*
*Тэл. 2095257. Факс 2095015. Email: geo@bsu.by; www.geo.bsu.by*

У складзе факультэта: **8 кафедраў**; **2** навукова-даследчыя лабараторыі; навучальная геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна»; музей землязнаўства; аранжарэя; **9** філіялаў кафедраў. Сярод выкладчыкаў **11** дактароў навук і **43** кандыдаты навук. Навучаецца **485 студэнтаў**, у тым ліку 102 на завочным аддзяленні; **37** магістрантаў; **27** аспірантаў.

## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

**Спецыяльнасць «Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў»**

Кваліфікацыя: *«Інжынер-геолаг»*

Спецыялізацыі: геалагічная здымка, пошук і разведка радовішчаў карысных выкапняў; гідрагеалогія і інжынерная геалогія.

Месцы працаўладкавання: геолагаразведачныя партыі і экспедыцыі ўпраўлення па геалогіі Мінпрыроды РБ; НПЦ па геалогіі; ГП «Белдзяржгеацэнтр»; экспедыцыі РУП «Белгеалогія»; ААТ «Белгархімпрам»; прыватныя прадпрыемствы геалагічнага профілю.

**Спецыяльнасць «Геаграфія»**

Напрамак *«Навукова-педагагічная дзейнасць»*

Кваліфікацыя: *«Географ. Выкладчык геаграфіі»*

Спецыялізацыі: геаграфія турызму і экскурсійны менеджмент; геаграфія глеб, зямельныя рэсурсы і меліярацыя; рэгіянальнае кіраванне.

Месцы працаўладкавання: структурныя падраздзяленні абласных і раённых выканаўчых камітэтаў; установы сярэдняй і вышэйшай адукацыі Мінадукацыі РБ; профільныя навукова-даследчыя інстытуты НАН Беларусі: «Інстытут эканомікі», «Інстытут глебазнаўства і аграхіміі», «Інстытут меліярацыі», «Інстытут прыродакарыстання» і інш.

Прадпрыемствы і службы: транспартныя, эканоміка-статыстычныя, турысцкія, экскурсійна-краязнаўчыя – па профілі атрыманай спецыяльнасці.

Напрамак *«Геадэмаграфія»*

Кваліфікацыя: «Географ. Геадэмограф»

Месцы працаўладкавання: Нацыянальны статыстычны камітэт; галоўныя абласныя ўпраўленні статыстыкі; падраздзяленні Міністэрства эканомікі і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны; Інстытут эканомікі, Інстытут сацыялогіі, НДІ працы.

**Спецыяльнасць «Геаінфармацыйныя сістэмы»**

Кваліфікацыя: *«Спецыяліст па кадастры і геаінфармацыйных сістэмах»*

Месца працаўладкавання: прадпрыемствы і арганізацыі Дзяржкамітэта па маёмасці: РУП «Белгіпразем», «Агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» і інш.; навукова-даследчыя інстытуты: «Інстытут глебазнаўства і аграхіміі», «Інстытут меліярацыі»; «БелНДІПгорадабудаўніцтва».

**Спецыяльнасць «Касмааэракартаграфія»**

Кваліфікацыя: *«Географ. Спецыяліст па картографа-геадэзічнай дзейнасці»*

Месца працаўладкавання: прадпрыемствы і арганізацыі Дзяржкамітэта па маёмасці: РУП «Белгеадэзія», «Белкартаграфія», «Белгіпразем», «Агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» і інш.

**Спецыяльнасць «Гідраметэаралогія»**

Кваліфікацыя: *«Географ. Гідраметэаролаг»*

Месцы працаўладкавання: упраўленне па гідраметэаралогіі Мінпрыроды РБ і яго тэрытарыяльныя падраздзяленні: ДУ «Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыёактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя», абласныя цэнтры па гідраметэаралогіі, метэаралагічныя станцыі.

**Спецыяльнасць «Геаэкалогія»**

Кваліфікацыя: *«Географ-эколаг. Выкладчык геаграфіі і экалогіі»*

Спецыялізацыі: геаэкалагічны менеджмент; геаэкалагічныя інфармацыйныя сістэмы





*Тапаграфічная практыка*



*Геастанцыя «Заходняя Бярэзіна»*

**Геаграфічны факультэт – адзіны ў краіне рыхтуе спецыялістаў, якія аналізуюць з дапамогай ГІС-тэхналогій інфармацыю з касмічных спадарожнікаў для прадказання надвор'я, складання лічбавых картаў па прыродакарыстанні, а таксама спецыялістаў па вырашэнні дэмаграфічных праблем.**

Месцы працаўладкавання: падраздзяленні Мінпрыроды РБ (гаррайінспекцыі па ахове прыроды, «Бел НДЦ «Экалогія» і інш.); установы сярэдняй і вышэйшай адукацыі Мінадукацыі РБ; навукова-даследчыя інстытуты: Інстытут эканомікі, Інстытут прыродакарыстання і інш.

## СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Факультэтам заключана больш за 30 дамоў з прадпрыемствамі. Сумесная з профільнымі прадпрыемствамі падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўляецца на базе філіялаў кафедраў, створаных у ДУ «Рэспубліканскі гідраметэаралагічны цэнтр»; на базе прадпрыемстваў РУП «Белгеадэзія» і «Белкартаграфія»; у інстытутах «Белгіпразем»; глебазнаўства і аграхіміі; Інстытуце прыродакарыстання; Навукова-вытворчым цэнтры па геалогіі; УА «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства»; РНУП «Бел НДЦ «Экалогія»; ААТ «Белгархімпрам»; АТ «БелНДІПгорадабудаўніцтва». Спецыялісты прадпрыемстваў кіруюць вытворчымі і пераддыпломнымі практыкамі, прыцягваюцца да правядзення заняткаў.

## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Выкладчыкі і студэнты геаграфічнага факультэта праходзяць стажыроўкі ў такіх краінах, як Венгрыя, Партугалія, Ізраіль, Канада, Германія, Славакія, Швецыя і інш. У 2016 годзе стажыроўкі ў краінах блізкага і далёкага замежжа прайшлі больш за 30 выкладчыкаў і 28 студэнтаў геаграфічнага факультэта. Супрацоўнікі і студэнты толькі ў 2016 годзе прынялі ўдзел у 13 міжнародных праграмах супрацоўніцтва (праекты акадэмічнага абмену, праграма трансмежнага супрацоўніцтва, праграмы, фундаваныя фондам ААН, і інш.)

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

На факультэце працуюць 3 СНДЛ і 7 навуковых студэнцкіх гурткоў. Студэнцкая ГІС-лабараторыя на працягу 3 гадоў займае I месца сярод навуковых студэнцкіх аб'яднанняў БДУ. Творчыя аб'яднанні студэнтаў геафака: творчы саюз геафака, добраахвотніцкая група «Абдымкі геафака», студэнцкая газета «Экватар».

## РАЗМЕРКАВАННЕ

Штогод 100 % выпускнікоў бюджэтнай формы навучання атрымліваюць першыя працоўныя месцы, галоўным чынам на базавых прадпрыемствах, з якімі заключаны дамовы пра супрацоўніцтва. У 2016 годзе паступілі дадатковыя заяўкі з ДПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі», «Бярэзінскі біясферны запаведнік», ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь», ДУП ДА «Беларуская чыгунка» і інш.

## ЗАБЯСПЕЧАНАСЦЬ ІНТЭРНАТАМ

82 % студэнтаў атрымалі месцы ў інтэрнаце студэнцкай вёскі.

## СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Штогод арганізуецца цыкл мерапрыемстваў да Дня географа, па ініцыятыве студэнтаў-географаў праводзіцца ў БДУ «Сутычка» і турыстычны злёт, а таксама «Дзень ГІС».

## ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

Прафарыентацыйныя курсы (школы юных, супрацоўніцтва з сярэднімі школамі)

Школа географаў, геолагаў, краязнаўцаў.

Праводзяцца заняткі з навучэнцамі 9–11 класаў па паглыбленым вывучэнні геаграфіі (алімпіядны ўзровень).

Факультатыўныя заняткі па тэматыцы «Фізічная геаграфія і геалогія».

Са школьнікамі (6–8 класы) праводзяцца заняткі ў Музеі землязнаўства геаграфічнага факультэта БДУ.

Гуртокі «Геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы».

Штогод сумесна з камітэтам па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта праводзіцца «Тыдзень геаграфіі».

## ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Лілія ЖЫГАЛЬСКАЯ, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі НАН Беларусі, аспірант геаграфічнага факультэта БДУ. Выпускніца 2014 г.**



*– Цікавасць да геаграфіі цягнецца яшчэ са школы, але менавіта у студэнцтве склаўся мой прафесійны выбар займацца навуковымі даследаваннямі. Пасля пятага курса я паступіла ў магістратуру, а потым – у аспірантуру. Падчас вучобы на геаграфічным факультэце атрымала веды, якія выкарыстоўваю кожны дзень на прафесійнай ніве і ў побыце. Калектыў факультэта вызначаецца сваёй прыязнасцю і прафесіяналізмам. Вялікае ўражанне пакінулі палявыя навучальныя, вытворчыя і педагагічная практыкі, на адной з якіх мне было прапанавана працоўнае месца.*

*Факультэт сфарміраваў геаграфічны погляд на наваколле, пазнаёміў з цікавымі людзьмі, захапіў падарожжамі. Калі б мне давялося яшчэ раз выбіраць факультэт і ВНУ, я б не задумваючыся, зноў выбрала геафак БДУ, бо вучыцца тут адно задавальненне.*

**Ніна ЛІТВІНКА, аспірант кафедры глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм**



*Існуе мноства розных стэрэатыпаў накont вышэйшай геаграфічнай адукацыі, але яна дае досыць шырокі спектр магчымасцяў. Географ – па сваёй прыродзе ўніверсальны спецыяліст, можа спатрэбіцца ў самых розных галінах, ад будаўніцтва і праектавання да эканомікі і палітыкі. Варыянты будучага працаўладкавання не абмежаваны педагагічнай і навуковай дзейнасцю. Гэта асаблівы спосаб пазнання, бо вывучэнне геаграфіі прывучае аналізаваць і сістэматызаваць, глядзець на з'явы і падзеі з розных бакоў. І калі раней геафак асаблівa прыцягваў рамантыкаў і даследчыкаў, то зараз таксама настаў час людзей, зацікаўленых быць у плыні вялікай колькасці прасторавай інфармацыі, разумець механізмы кіравання дадзенымі і нават вывучаць праграмаванне ў дапамогу асноўнай прафесіі.*

*Асабіста для мяне студэнцкія гады сталі вялізным шанцам знайсці сабе! Геаграфію як кірунак для паступлення я абрала яшчэ ў школе і прыйшла на факультэт з трыма дыпломамі рэспубліканскай алімпіяды. Але менавіта падчас навучання я лепш знаёмілася не толькі з навакольным сусветам, але і з асаблівасцямі чалавечых адносін, глыбей спазнала свой унутраны сусвет. Гэта выдатнае месца для сустрэчы з новымі сябрамі і праверкі сабе на трываласць падчас разнастайных палявых практык. Ад тэарэтычных ведаў ты паступова пераходзіш на ўзровень разумення механізма працэсаў і выкарыстання сапраўды неабходных табе крыніц дадзеных і спосабаў іх апрацоўкі. Нікога не абмінуць вандроўкі, і з розных варыянтаў дзейнасці ты абавязкова знойдзеш свой!*

*Геафак – гэта сапраўдная школа жыцця для тых, хто здольны гэта ўбачыць і зразумець. Бо «географ» – не толькі прафесія і слова ў дыпломе аб адукацыі. Гэта стыль жыцця!*

# Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі

*Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт*
*Павел Аляксеевіч МАНДРЫК*
*Адрас: г. Мінск, праспект Незалежнасці, 4. Тэл. 2095245.*
*Факс 2265548. E-mail: dean_office_FPMI@bsu.by; www.fpmi.bsu.by*

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – ведамы ў Беларусі, СНД і за мяжой брэнд**, вылучаецца прынцыповым падыходам да пабудовы навучальных праграм і ўсяго працэсу навучання: факультэт не вучыць пэўным мовам праграмавання ці тэхналогіям, а на прыкладзе пэўных моў і тэхналогій дае сістэмныя веды. Гэта дазваляе сфарміраваць у студэнта – будучага спецыяліста – здольнасць убачыць у прыватнай задачы агульны падыход і, наадварот, умець эфектыўна ўжываць агульныя сістэмныя веды для рашэння прыватнай пэўнай задачы. Менавіта таму ўзровень падрыхтоўкі на факультэце ў галіне матэматыкі і сістэмнага праграмавання адпавядае найлепшым сусветным узорам.

ФПМІ заснаваны 1 красавіка 1970 г.

Выкладчыцкі склад налічвае больш за **200** чалавек, сярод якіх акадэмік і член-карэспандэнт НАН Беларусі, **30** прафесараў і дактароў навук, больш за **100** дацэнтаў і кандыдатаў навук.

На **12 кафедрах** навучаюцца больш за **1400 студэнтаў** дзённай формы навучання. Акрамя гэтага, у структуру факультэта ўваходзяць **4** навукова-даследчыя лабараторыі, **5** навучальных лабараторый, цэнтр кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях, школа аналізу дадзеных, а таксама **6** філіялаў кафедраў, якія дзейнічаюць на базе Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і шэрагу IT-кампаній.





## Пасля ФПМІ вы пагледзіце на камп'ютар па-іншаму!

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

**«Прыкладная матэматыка»,** напрамак: навукова-вытворчая дзейнасць; кваліфікацыя: *«Матэматык-праграміст»*. Асноўныя віды дзейнасці: стварэнне матэматычных мадэляў, алгарытмаў і праграм кіравання аб'ектамі і працэсамі; распрацоўка матэматычнага і праграмнага забеспячэння электроннай вылічальнай тэхнікі.

**«Інфарматыка»;** кваліфікацыя: *«Матэматык – сістэмны праграміст»*. Асноўныя віды дзейнасці: стварэнне матэматычных мадэляў і аўтаматызацыя праектавання складаных сістэм, распрацоўка сістэмнага праграмнага забеспячэння сродкаў вылічальнай тэхнікі.

**«Эканамічная кібернетыка»,** напрамак: матэматычныя метады і камп'ютарнае мадэляванне ў эканоміцы, кваліфікацыя: *«Матэматык-эканаміст»*. Асноўныя віды дзейнасці: матэматычнае мадэляванне і аптымізацыя эканамічных працэсаў і сістэм, эканамічны аналіз і прагназаванне ў эканоміцы і бізнесе, распрацоўка камп'ютарных сістэм апрацоўкі інфармацыі і кіравання ў эканоміцы і бізнесе.

**«Актуарная матэматыка»,** кваліфікацыя: *«Матэматык-фінансіст»*. Асноўныя віды дзейнасці: інвестыцыйны аналіз і кіраванне актывамі, агульнае страхаванне і страхаванне жыцця, пенсійнае забеспячэнне, дэмаграфічная статыстыка.

**«Камп'ютарная бяспека»,** напрамак: матэматычныя метады і праграмныя сістэмы; кваліфікацыя: *«Спецыяліст па абароне інфармацыі. Матэматык»*. Асноўныя віды дзейнасці: распрацоўка матэматычных метадаў абароны інфармацыі, праграмнае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі.

**«Прыкладная інфарматыка»,** напрамак: праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм; кваліфікацыя: «Інфарматык. Спецыяліст па распрацоўцы праграмнага забеспячэння». Асноўныя віды дзейнасці: стварэнне, укараненне і суправаджэнне праграмнага забеспячэння камп'ютарных сістэм.

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Сучаснае жыццё немагчымае без выкарыстання дасягненняў прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Яны запатрабаваны ў вырашэнні канкрэтных фізічных, эканамічных, фінансавых, сацыяльных, тэхнічных задач, калі змястоўную сутнасць той альбо іншай праблемы трэба перавесці на мову формул і знайсці эфектыўнае рашэнне. Менавіта таму спецыялісты ў галіне прыкладной матэматыкі і інфарматыкі запатрабаваныя сучасным жыццём і маюць вельмі добрыя перспектывы знайсці цікавую і высокааплатную працу. Факультэт цесна супрацоўнічае і мае афіцыйныя дамовы аб падрыхтоўцы спецыялістаў з Нацыянальным банкам і шматлікімі камерцыйнымі банкамі, з больш як 100 кампаніямі ПВТ і іншымі арганізацыямі, сярод якіх «Беларусбанк», «Прыёрбанк», «Белінвестбанк», «ЭПАМ Сістэмз», IBA, «Ітранзішэн», «Сістэмныя тэхналогіі», «Гейм Стрым», «Яндэксбел», «Вайбер Медыя», «Ісофт Салюшэнз», «Навучсофт», «Софтклуб», «Эксадэл» і іншыя.

### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Любы студэнт, які паспяхова навучаецца на факультэце, можа прыняць удзел у праграмах міжнароднага студэнцкага абмену, міжнародных навуковых семінарах. Факультэт актыўна развівае міжнародныя адукацыйныя і навуковыя сувязі, увесь час пашырае міжнародную акадэмічную мабільнасць і акадэмічныя абмены, развіваючы прамыя дамоўныя адносіны з профільнымі ВНУ краін блізкага і далёкага замежжа.

Магчымасці, якія даюць міжнародныя праграмы студэнцкага абмену для студэнтаў факультэта, разнастайныя. Нашы студэнты ўвесь час удзельнічаюць у міжнародных адукацыйных праграмах у такіх краінах, як Літва, Латвія, Нарвегія, Германія, Польшча, Італія і інш.

Нароўні з супрацоўніцтвам па двухбаковых дамовах з замежнымі ўніверсітэтамі факультэт паспяхова працуе і ў рамках міжнародных праектаў (Tempus, Erasmus+, стыпендыяльныя праграмы Германскай службы акадэмічных абменаў DAAD), а таксама ў рамках міждзяржаўных дамоў пра абмен у галіне адукацыі (напрыклад, з Кітайскай Народнай Рэспублікай).

Вядзецца распрацоўка сумесных магістарскіх праграм.

### СТУДЭНЦКАЕ ЖЫЦЦЁ

Студэнцкае жыццё насычана яркімі падзеямі. Сярод культурных і забаўляльных мерапрыемстваў ёсць шмат традыцыйных – штогадовых, ужо звычных і чаканых усімі студэнтамі і многімі выкладчыкамі, і без якіх ужо і не ўяўляюцца тыя ці іншыя тыдні ў чарадзе навучальных заняткаў, кантрольных і калоквіўмаў:

- турсцяжына першакурсніка,
- студэнцкія капуснікі, падчас падрыхтоўкі і правядзення якіх ярка выяўляецца клопат старшакурснікаў ФПМІ над сваімі малодшымі «фпмаўцамі» (адной з важных традыцый якраз і з'яўляецца тое, што кожная група 2 курса ФПМІ з'яўляецца куратарам адной з груп першакурснікаў, што дапамагае ім асвоіцца ва ўсіх складанасцях і хітраспляценнях унутрыфакультэцкага жыцця)
- канцэрты факультэцкай каманды КВЗ,
- калядная акцыя «ФПМушка»,
- і, вядома, дні нараджэння факультэта – 1 красавіка – яркія і незабыўныя!

Але кожны год з'яўляюцца і новыя незвычайныя мерапрыемствы, якія становяцца ўнікальнымі падзеямі ў культурным і інтэлектуальным жыцці факультэта (і часта пераходзяць у разрад традыцыйных): «Лямпавы вечар», «Музычныя пятніцы», кінавечары і размовы пра сапраўднае кіно, шматлікія іншыя ...

Арганізацыяй усіх гэтых падзей займаюцца розныя студэнцкія арганізацыі факультэта (студэнцкі саюз, БРСМ, творчы саюз, савет старастаў, прафсаюзная арганізацыя, каманда КВЗ факультэта «Дзеці Цьюрынга»), якія адкрытыя для новых актыўных людзей, новых ідэй і праектаў.

### ЗАБЕСПЕЧАНАСЦЬ ІНТЭРНАТАМ

Вялікае значэнне ў студэнцкім жыцці мае інтэрнат, у якім жывуць іншагароднія студэнты ФПМІ (інтэрнат № 6 па вул. Кастрычніцкай, 10).

Дарэчы, усе іншагароднія першакурснікі ФПМІ забяспечваюцца інтэрнатам!

З аднаго боку, у інтэрнаце створаны камфортныя ўмовы пражывання: функцыянуюць трэнажорны і більярдны пакоі, відэазалы, сертыфікаваная камп'ютарная сетка, якая дазваляе падключаць камп'ютары непасрэдна да адукацыйных сервераў факультэта з выхадам у інтэрнэт. А з іншага боку, гэта тое месца, дзе можна ўвесь час ствараць, дзеяць, трэніравацца, дэманстраваць, вучыць і вучыцца, а галоўнае, знаходзіць адданых сяброў!

### СІСТЭМА БЕСПЕРАПЫННАЙ АРЫЕНТАВАНАЙ АДУКАЦЫІ ПА МАТЭМАТЫЦЫ І ІНФАРМАТЫЦЫ

На факультэце дзейнічае сістэма бесперапыннай адукацыі, арыентаванай на прадметы «Матэматыка» і «Інфарматыка». Сістэма ўключае пастаянныя школы для юнацтва (пачынаючы з 5 класа сярэдняй школы) і мерапрыемствы алімпіядна-конкурснага і навучальнага характару (алімпіяды, канферэнцыі, вучэбныя зборы рознага ўзроўню і накіраванасці, летнія школы і г. д.).

Вынікам з'яўляецца пастаянны высокі інтэлектуальны ўзровень абітурыентаў – студэнтаў, якія паступаюць на факультэт, што дазваляе ўвесь час падтрымліваць высокі ўзровень навучання ў галіне матэматыкі і інфарматыкі. Пры гэтым на факультэце заўсёды ёсць як падтрымныя (факультатыўныя) курсы для тых, каму патрэбная дапамога пры пераходзе ад школы ва ўніверсітэт, так і курсы, семінары, школы для найбольш зацікаўленых у далейшым паглыбленні сваіх ведаў і навыкаў у розных галінах сучаснай матэматыкі і інфарматыкі (школа аналізу дадзеных, семінары па дадатковых частках матэматыкі і інфарматыкі).

І як пастаянны вынік – поспехі нашых студэнтаў на самых прэстыжных рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах.

### ДАСЯГНЕННІ

Штогод нашы студэнты працуюць у складзе журы розных алімпіяд і конкурсаў для школьнікаў.

Каманды БДУ ў складзе студэнтаў ФПМІ шматразова былі фіналістамі аднаго з самых вядомых спаборніцтваў – каманднага чэмпіянату свету па праграмаванні (ACM ICPC), у якім прымаюць удзел каманды звыш 2300 універсітэтаў! Найвышэйшага поспеху наша каманда дасягнула ў 2004 г., калі заваявала залаты медаль, у 2008 г. – бронзавы, а ў 2012 і 2013 гг. – сярэбраныя.

Увесь час нашы студэнты і выпускнікі дэманструюць самыя высокія вынікі ў індывідуальных і іншых спаборніцтвах праграмістаў (IEEEXtreme, TopCoder, Google HashCode і іншых).

Адным з апошніх прыкладаў стала абсалютная перамога каманды YMTeam (Раман Удавічэнка і Сяргей Жгіроўскі – выпускнікі ФПМІ 2014 года) ў фінале Google HashCode у Парыжскім офісе Google у 2016 г. (адзначым, што на другім месцы апынуліся студэнты з МФТІ).

На студэнцкіх алімпіядах па матэматыцы з 2001 г. студэнты ФПМІ заваявалі больш за 80 медалёў рознай вартасці (у тым ліку 40 залатых), а ў 2003 і 2005 гг. узялі першыя месцы ў агульнакамандным спаборніцтве.

Запрашаем усіх зацікаўленых на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, а навучэнцаў 5–11-х класаў – у нашыя школы для юнацтва, а таксама ў цэнтр па рабоце з адоранымі школьнікамі («ЮНІ-цэнтр–XXI»).

Мы гарантуем:

**Якасць адукацыі, праверану практыкай і часам!**

# Фізічны факультэт

*Дэкан – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Віктар Міхайлавіч АНІШЧЫК*
*Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 2. Тэл. 2095267, 2095115.*
*E-mail: physdean@bsu.by; сайт: www.physics.bsu.by*

У складзе факультэта **11 кафедраў**; **12** навукова-даследчых лабараторый; вучэбна-навуковая абсерваторыя. Колькасць прафесараў – **26**; дацэнтаў – **65**; аспірантаў – **41**; магістрантаў – **21**; **студэнтаў – 608**.

## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Падрыхтоўка ажыццяўляецца па спецыяльнасцях **«Камп'ютарная фізіка»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Праграміст»*), **«Ядзерныя фізіка і тэхналогіі»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*), **«Фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*), а таксама **«Фізіка»**, у межах якой тры напрамкі: навукова-даследчы (кваліфікацыя – *«Фізік. Даследчык»*), вытворчы (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*) і кіраўніцкі (кваліфікацыя – *«Фізік. Менеджар»*).

На другім курсе студэнты размяркоўваюцца па спецыялізацыях, якія адпавядаюць розным галінам сучаснай фізічнай навукі: камп'ютарнае мадэляванне фізічных працэсаў, фізічная інфарматыка, фізічныя метады пераўтварэння інфармацыі, тэарэтычная фізіка, біяфізіка, нанабіяматэрыялы і нанабіятэхналогіі, лазерная фізіка і спектраскапія, нанафатоніка, фізічная оптыка, функцыянальныя нанаматэрыялы, нанаэлектроніка, фізіка паўправаднікоў і дыэлектрыкаў, энергафізіка, рацыянальная энергетыка, ядзерная фізіка і электроніка, фізіка ядзерных рэактараў і атамных энергетычных установак, ядзерная бяспека, радыяцыйнае матэрыялазнаўства і іншыя.

## ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Акрамя фундаментальнай падрыхтоўкі па фізіцы і матэматыцы, асаблівая ўвага на факультэце звяртаецца на сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі і інфарматыку. Штогод частка нашых выпускнікоў размяркоўваецца па заяўках вядучых камп'ютарных кампаній: СП ЗАТ «Міжнародны дзелавы альянс» (больш вядомае як IBA), EPAM Systems, ААТ «АМПсофт», ЗТАА «Эксадэл», ЗАТ «Ітранзішн» і інш.

Нашы выпускнікі працуюць у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, навукова-даследчых і навукова-вытворчых цэнтрах (напрыклад, ААТ «Мінскі НДІ радыёматэрыялаў» Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта), канструктарскіх бюро (напрыклад, НВРУП «КБТЭМ-ОМО» ДНВА дакладнага машынабудавання «Планар»), наглядных структурах (напрыклад, «Дзяржатамнагляд»), фірмах рознага профілю (гл. інфармацыю на сайце факультэта).

## СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Кафедры факультэта ажыццяўляюць супрацоўніцтва і абмен навукова-тэхнічнай інфармацыяй з шэрагам інстытутаў НАН Беларусі, ААТ «Інтэграл», НПДК парашковай металургіі, НДЦ «Плазматэг», НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі і НДІ ядзерных праблем пры БДУ, БДУІР, РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, РНПЦ «Кардыялогія», РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, ЗАТ «Амкадор-Унікаб», ТАА «Кваліт», а таксама іншымі навуковымі і вытворчымі цэнтрамі.

## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Факультэт супрацоўнічае з ВНУ і іншымі арганізацыямі Расіі, Украіны, Казахстана, Германіі, Іспаніі, Чэхіі, Польшчы, Даніі, Турцыі, Іарданіі, Манголіі, Літвы, Францыі, Сербіі, Італіі, В'етнама, Японіі, Балівіі, Латвіі, Азербайджана. Супрацоўнікі факультэта ўдзельнічаюць у выкананні міжнародных праектаў па праграмах АІЯД, ERASMUS+, міжнародных грантах БРФФІ, 2 праектах у рамках праграмы Horizon 2020. Акрамя таго, стажыроўкі і камандзіроўкі супрацоўнікаў факультэта ажыццяўляюцца пры падтрымцы грантаў універсітэтаў-партнёраў, а таксама фонду DAAD (Германія).











**Паважаныя абітурыенты! Сардэчна запрашаем вас на фізічны факультэт БДУ, дзе вы зможаце атрымаць якасную сучасную адукацыю і авалодаць самай універсальнай прафесіяй – ФІЗІК.**

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Да правядзення навуковых даследаванняў прыцягваюцца і студэнты факультэта. Студэнты старэйшых курсаў удзельнічаюць у працы міжкафедральных СНДЛ «Нелінейная дынаміка фізічных сістэм», «Біяфізіка і клетачныя тэхналогіі», «Фізіка нанаструктураваных паўправаднікоў» і «Мадыфікацыя ўласцівасцяў матэрыялаў з дапамогай кампрэсійных і іонна-плазменных струменяў». Для студэнтаў першага і другога курсаў працуюць навуковыя гурткі на кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі, на кафедры біяфізікі, на кафедры ядзернай фізікі (гурток па радыёэлектроніцы). Усё большую папулярнасць набывае нядаўна арганізаваны кафедрай энергафізікі навукова-адукацыйны семінар для студэнтаў і школьнікаў «Энергаэфектыўныя тэхналогіі і новыя матэрыялы».

Безумоўна, не толькі вучобай і магчымасцямі правядзення ўнікальных навуковых эксперыментаў характарызуецца студэнцкае жыццё на факультэце. Пры ўдзеле студэнцкіх арганізацый і аб'яднанняў праводзяцца вечарыны першакурсніка, свята «Дні фізіка», турысцкі злёт, турнір па кіберспорце, конкурс «Міс фізфака», «Факультэцкія гульні» і шматлікае іншае. Нямала цікавых мерапрыемстваў праходзіць і ў інтэрнаце, дзе пражываюць студэнты факультэта. Дарэчы, традыцыйна 100 % першакурснікаў забяспечваюцца месцамі ў інтэрнаце.

## ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

У чым спецыфіка фізічнага факультэта, якія магчымасці развіцця навуковай кар'еры? Думкамі на гэту тэму з намі падзяліўся **намеснік старшыні прэзідыума НАН Беларусі, прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі Сяргей КІЛІН,** які скончыў фізфак у 1974 г.: *«Фізфак у маім жыцці вельмі значны. Ён падтрымаў цікавасць маладога чалавека да фізікі, і, дзякуючы бліскучым лектарам і выкладчыкам фізфака, юнацкае гарэнне атрымала надзейнае «паліва» ў выглядзе глыбокіх ведаў і – што вельмі важна – уменняў іх выкарыстоўваць пры рашэнні задач, якія ўзнікаюць, як правіла, у новай пастаноўцы. Менавіта гэты досвед пошуку рашэння праблем, незалежна ад галіны іх выкарыстання, робіць выпускнікоў фізфака паспяховымі ва ўсіх відах дзейнасці, дзе б ім ні прыйшлося працаваць. Тут, на фізфаку, на другім курсе мне пашчасціла пачаць першыя крокі ў навуцы пад кіраўніцтвам Барыса Іванавіча Сціпанава. На фізфаку ў студэнцкія гады я пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай. Фізфак падарыў мне шчасце зносін з маладымі людзьмі на лекцыях па квантавай оптыцы, а зараз і квантавай інфарматыцы, якія я чытаю тут вось ужо амаль трыццаць гадоў».*



Узровень адукацыі, атрыманы на факультэце, дазваляе выпускнікам лёгка адаптавацца да працы не толькі па фізіка-тэхнічным профілі, але і ў іншых галінах (арганізацыйнай, камерцыйнай, банкаўскай, выдавецкай і інш.). Доказвае гэта прыклад **Віталя БРАГІНЦА**, выпускніка фізічнага факультэта, а зараз дырэктара ўласнай юрыдычнай фірмы, якая паспяхова існуе ўжо болей за 15 гадоў. *«Вельмі добра адчуваецца розніца паміж падыходам да права юрыста і падыходам фізікаюрыста, – падзяліўся ўласным досведам Віталь Фёдаравіч. – Разглядаючы заканадаўства, я аналізую яго так, як гэта робяць фізікі ў дачыненні да фізічных заканамернасцяў і з'яў. Тым больш сённяшняе жыццё немагчыма ўявіць без высокіх тэхналогій. А займацца юрыдычным суправаджэннем навуковатэхнічных галін, безумоўна, можа толькі той, хто добра з імі знаёмы».* В. Брагінец лічыць, што фізічны факультэт – выдатнае месца для набыцця ведаў і навыкаў, якія могуць быць скарыстаныя ў прынцыпе ў любой прафесіі. Ён спрыяе развіццю аналітычнага мыслення, логікі – таго, што неабходна для паспяховай дзейнасці ў кожнай сферы.

**Больш падрабязныя звесткі пра факультэт можна знайсці на нашым сайце, дзе змешчана інфармацыя пра Дні адчыненых дзвярэй (5 студзеня і 31 сакавіка 2018 года), вочна-завочную школу па фізіцы і матэматыцы для абітурыентаў, а таксама шмат іншай карыснай інфармацыі.**

# Інстытут журналістыкі БДУ

*Дырэктар – кандыдат філалагічных навук дацэнт Сяргей Валянцінавіч ДУБОВІК*
*Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9. Тэл. 2597400.*

**Найстарэйшы на постсавецкай прасторы журфак БДУ** ўмела спалучае ў сабе натхненне і найноўшыя тэхналогіі, творчы парыў і карпатлівую штодзённую працу, моцныя традыцыі і самыя сучасныя трэнды. Вядомыя людзі Беларусі, майстры слова – а гэта журналісты, пісьменнікі, паэты, дзеячы культуры імастацтва – «родам з журфака». Які яшчэ факультэт можа пахваліцца сваім **нобелеўскім лаўрэатам** – а наш можа!

Галоўны капітал журфака – яго выкладчыкі, і толькі потым – новы сучасны будынак, абсталяваны ўсім неабходным лабараторыі і студыі. Людзі, якія тут працуюць, не падзяляюць жыццё на прафесійнае і прыватнае, таму выкладаюць натхнёна, сумесна са студэнтамі рэалізуюць шмат самых разнастайных адукацыйных, культурных, грамадскіх праектаў.

А яшчэ ў нас трывалыя сувязі з прафесійнай супольнасцю і працадаўцамі, усе самыя новыя трэнды ўкараняюцца ў навучальны працэс. Аднак самая галоўная асаблівасць журфака ў тым, што ён стаў прасторай, дзе рэалізуюцца ўсе таленты, усе ідэі, усе пачынанні.

Факультэт журналістыкі БДУ быў заснаваны ў 1944 г. З 1 верасня 2008 г. рэарганізаваны ў Інстытут журналістыкі з двума факультэтамі – факультэтам журналістыкі і факультэтам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.

Займаюцца **948 студэнтаў** (з іх 213 – завочна), 38 магістрантаў (з іх 18 замежнікаў), **39** аспірантаў, **5** дактарантаў.

Высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў забяспечваюць **10 кафедраў**.

Кафедрамі створана 13 філіялаў на базе вядучых масмедыя краіны, у тым ліку РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», Нацыянальны прэс-цэнтр Рэспублікі Беларусь, УП «Агенцтва «Минск-Новости», выдавецтвы «Народная асвета», «Пачатковая школа» і інш.








## Інстытут журналістыкі БДУ – месца, дзе юнацтва распраўляе крылы!

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

У інстытуце ёсць лабараторыі аўдыявізуальных тэхналогій, інфарматыкі і мультымедыя, фотажурналістыкі, вучэбна-выдавецкая лабараторыя. Заняткі праходзяць у сучасным Тэлевізійным цэнтры БДУ. На кафедрах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі, лабараторыі («Крытык», «Медыяпсіхолаг»), клубы, літаратурныя аб'яднанні. Рэгулярна праходзяць студэнцкія навуковыя канферэнцыі, конкурсы творчых работ, заняткі ў «Акадэміі PR».

Студэнты з дапамогай выкладчыкаў выпускаюць газеты «ЖурФАКТЫ», «Перья», часопіс «Завтрак на траве», рыхтуюць матэрыялы для канала «Студэнцкае тэлебачанне», інфармацыйных рэсурсаў «Вэб-журналіст» і Studlive.by.

Выкладчыцкі склад факультэта – вопытныя педагогі, журналісты, супрацоўнікі вядучых СМІ краіны. Сярод штатных супрацоўнікаў 10 дактароў навук і 55 кандыдатаў навук.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Факультэт забяспечвае падрыхтоўку студэнтаў па наступных спецыяльнасцях:

**«Журналістыка»** (кваліфікацыя *«Журналіст»*). Напрамкі: журналістыка (друкаваныя СМІ), журналістыка (аўдыявізуальная), журналістыка (вэб-журналістыка), журналістыка (менеджмент сродкаў масавай інфармацыі). Пасады, якія могуць займаць выпускнікі: рэдактар, выпускаючы адказны, аглядальнік палітычны, аглядальнік па эканамічных пытаннях, каментатар, карэспандэнт, карэспандэнт спецыяльны, вядучы праграмы, рэдактар інтэрнэт-рэсурсу.

**«Журналістыка міжнародная»** (кваліфікацыя *«Журналіст-міжнароднік»*). Пасады: аглядальнік палітычны, аглядальнік па эканамічных пытаннях, карэспандэнт уласны, аглядальнік, замежны карэспандэнт.

**«Інфармацыя і камунікацыя»** (кваліфікацыя *«Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі»*). Пасады: спецыяліст па сувязях з грамадскасцю, спецыяліст па рэкламнай камунікацыі, прэс-сакратар, рэдактар інтэрнэт-рэсурсу.

**«Літаратурная работа».** Напрамкі: літаратурная работа (рэдагаванне) (кваліфікацыя *«Літаратурны рэдактар. Журналіст»*), літаратурная работа (творчасць) (кваліфікацыя «Літаратурны работнік. Журналіст»). Пасады: рэдактар, рэдактар-стыліст, рэдактар-перакладчык, літаратурны супрацоўнік, рэдактар-кансультант, карэспандэнт.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі Інстытута журналістыкі працуюць на тэлеканалах і радыёстанцыях Белтэлерадыёкампаніі («Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3», «Беларусь 5», «Культура», «Сталіца», «Радиус-FM») і рэгіянальных тэлерадыёкампаній («Брэст», «Віцебск», «Гомель», «Гродна», Магілёў»), тэлеканалах «ОНТ», «СТВ», «МІР», у рэдакцыях рэспубліканскіх («Звязда», «СБ. Беларусь сегодня», «Рэспубліка», «Народная газета», «Сельская газета», «Знамя юности»), рэгіянальных і карпаратыўных газет, інфармацыйных агенцтвах, прэс-цэнтрах, службах сувязяў з грамадскасцю, выдавецтвах.

### БАЗАВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ

З 14 арганізацыямі заключаны дамовы аб узаемадзеянні, сярод іх ЗАТ «Столичное телевидение», прадстаўніцтва МТРК «МИР», ЗАТ «Второй национальный телеканал», Установа «Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета», выдавецтвы «Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки» і «Пачатковая школа».

### РАЗМЕРКАВАННЕ

Па выніках 2016/2017 навучальнага года былі размеркаваны 194 маладыя спецыялісты. Першае працоўнае месца атрымалі 100 % выпускнікоў факультэта журналістыкі. Месцамі размеркавання сталі разнастайныя сродкі масавай інфармацыі, «Редакция газеты «Советская Белоруссия», РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», структурныя падраздзяленні Белтэлерадыёкампаніі.

### ТРАДЫЦЫІ

Факультэт мае багата традыцый: «Дзень першакурсніка», «Залатая качка», «Міс журфак», «Дзень роднай мовы» і інш. – мерапрыемствы, у якіх актыўна прымаюць удзел як студэнты, так і выкладчыкі.

### ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

На факультэце журналістыкі штогод працуюць падрыхтоўчыя курсы па дысцыпліне «Творчасць». Для абітурыентаў рэгулярна праводзяцца Дні адчыненых дзвярэй, створана і працуе «Школа маладога журналіста».

Шчыра запрашаем да нас вучыцца!

**Вераніка КАНЮТА, выпускніца 2014 г., магістратуры БДУ (2015), спецыяльны карэспандэнт выдавецкага дома «Звязда», лаўрэат творчых конкурсаў Міністэрства абароны і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, моладзевага творчага конкурсу «Дэбют» Беларускага саюза журналістаў у намінацыі «Найлепшы рэпарцёр» (2015):**



*– Паступіць на журфак было найвялікшай марай. І вось я, дзяўчынка з вёскі, – студэнтка галоўнай ВНУ краіны, аднаго з прэстыжных і, бадай, самага цікавага ўніверсітэцкага факультэта. Журфакаўскія сцены, якія здаваліся недасягальнымі, сталі такімі ўтульнымі і роднымі, што і дагэтуль адчуваеш сябе тут «сваім». І мы не былі б такімі блізкімі, каб не выкладчыкі – галоўныя кавалі журналісцкіх кадраў краіны. І не яны адны – студэнты-аднакурснікі, якія па крэатыўнасці, яскравасці таленту і ўніверсальнасці не маюць сабе роўных. Для многіх з іх, як і для мяне, журфак стаў уваходным білетам у прафесію. Прафесію, якую, аднойчы паспытаўшы, не разлюбіш ніколі!*

**Андрэй КАЗЛОЎ, выпускнік 2012 года спецыяльнасці «Літаратурная работа (рэдагаванне)». Месца працы, пасада: Белтэлерадыёкампанія, карэспандэнт:**

*– Я скончыў так званую «литработу», і ўпэўнены, што калісьці па шчаслівым збегу абставінаў нездарма на яе паступіў. Чуў масу меркаванняў пра тое, што кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання ў чымсьці не дае перспектывы стаць тэлежурналістам альбо тэлевядучым. На самой справе, я лічу, што гэтая кафедра універсальная. Бо журналіст галоўныя навыкі знаходзіць у прафесіі, гэта значыць у практыцы. Дыплом з такой спецыяльнасцю мне зусім не перашкодзіў патрапіць на тэлебачанне. Але галоўнае, што трэба ведаць пачаткоўцу журналісту, – гэта практыка. Яўген Перлін два першыя курсы адвучыўся са мной, і на той жа кафедры. Думаю, не варта тлумачыць, якое месца ў нашай прафесіі займае гэты чалавек :)*



*Вядома, вучоба на журфаку – гэта студэнцкі інтэрнат. Мы ж гаворым пра ўражанні? Адукацыя, безумоўна, мне таксама многае дала. Галоўнае – я стаў шмат чытаць. Я і так чытаў, але тут прыходзілася яшчэ больш. А чытанне – гэта велізарная справа, найважнейшая.*

*Самае дзіўнае для мяне – першы курс. Таму што там здарылася ўсё самае добрае. Усё сышлося, скажам так. Я пра студэнцкае жыццё ва ўсёй красе. Пакой у інтэрнаце нумар № 3 падабраўся шыкоўны: фізік, інжынер, журналіст, географ... Ядзерная сумесь!*

*Вучыцца я таксама паспяваў, але не так добра, як варта было б. Хоць любімыя аднагрупнікі скажуць, што я быў двоечнікам. Але дакладна памятаю раман Фрэдэрыка Бегбедэра Windows on the World, пасля якога акунуўся ў літаратуру. І нягледзячы на тое, што быў адносна пісьменным вучнем у школе, кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання мне дала вельмі шмат! Сяргея Зелянко, на той момант майго выкладчыка, я вельмі люблю і сумую па ім.*



*Дарэчы, пасля выпуску ў 2012 годзе я застаўся ў ансамблі танца «Крыжачок» пры БДУ і танцую там да гэтага часу, атрымліваючы пры гэтым велізарнае задавальненне!*

# Гістарычны факультэт

*Дэкан – доктар гістарычных навук прафесар Аляксандр Генадзьевіч КАХАНОЎСКІ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6. Тэл. 2095598, факс 3273014.*
*E-mail: hist@bsu.by; www.hist.bsu.by*

У склад гістарычнага факультэта БДУ ўваходзяць: **9 кафедраў**, **4** лабараторыі і адзін навучальны кабінет. Навучальную, навукова-метадычную працу на факультэце забяспечваюць **164 выкладчыкі** (у тым ліку **1 акадэмік**, **1 член-карэспандэнт**, **22 дактары навук**, **96 кандыдатаў навук**).

Гістарычны факультэт ажыццяўляе навучанне студэнтаў на дзвюх ступенях вышэйшай адукацыі. Праграмы першай ступені вышэйшай адукацыі асвойваюць **1015 студэнтаў** (у тым ліку 525 студэнтаў дзённай формы навучання і 490 студэнтаў завочнай формы навучання). Па праграмах другой ступені вышэйшай адукацыі навучаюцца 89 магістрантаў (у т. л. 83 дзённай формы навучання, 6 – завочнай), у аспірантуры – **65** чалавек.

## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па чатырох спецыяльнасцях:

1. **Гісторыя** (па напрамках), напрамкі: айчынная і ўсеагульная гісторыя, паліталогія, археалогія, этналогія, гісторыя мастацтваў, гісторыя рэлігій, гістарычная інфарматыка, гісторыя міжнародных зносін;
2. **Гісторыка-архівазнаўства**;
3. **Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны** (па напрамках), напрамкі: гісторыя і музеялогія, мастацтвазнаўства і музеялогія, культурная спадчына і турызм;
4. **Дакументазнаўства** (па напрамках), напрамкі: дакументацыйнае забеспячэнне кіравання, інфармацыйнае забеспячэнне кіравання.

Ва ўмовах сучаснай універсітэцкай адукацыі традыцыі факультэта спалучаюцца з выкарыстаннем навацый. База для вучэбнай і навуковай работы скіравана на шырокае выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій.

Актывізацыі навучальнага працэсу спрыяе музей археалогіі, этнаграфіі і антычнага мастацтва. Яго нумізматычная калекцыя – адна з самых багатых і каштоўных у краіне.

## ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЕ НАВУЧАННЕ

Гістарычны факультэт актыўна ўзаемадзейнічае з органамі дзяржаўнага кіравання, школамі і гімназіямі, музейнымі, архіўнымі, турыстычнымі і іншымі ўстановамі, якія з'яўляюцца арганізацыямі-замоўцамі кадраў, у тым ліку Дэпартамент па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і інш. На іх базе праводзяцца навучальныя і вытворчыя практыкі, выконваюцца курсавыя і дыпломныя працы, вядзецца прафарыентацыйная праца, створаны чатыры філіялы кафедраў гістарычнага факультэта. Супрацоўнікі філіялаў чытаюць лекцыі студэнтам факультэта, кіруюць дыпломнымі, магістарскімі і кандыдацкімі дысертацыямі.

## МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Гістарычны факультэт падтрымлівае цесныя сувязі з гістарычным факультэтам МДУ імя М. В. Ламаносава, універсітэтамі Расіі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Латвіі, Літвы, Германіі, Англіі і інш. За апошнія два гады студэнты стажыраваліся ў МДУ імя М. В. Ламаносава, Латвійскім універсітэце г. Рыга, універсітэце Брно, універсітэце Плзеня, універсітэце Брэмена, універсітэце Цюбінгена, універсітэце Кента і шэрагу іншых. У верасні 2017 г. праводзіўся міжнародны расійска-беларускі конкурс студэнцкіх навуковых прац па гісторыі сумесна са МДУ імя М. В. Ламаносава, студэнцкі конкурс сумесна з Уроцлаўскім універсітэтам. Студэнты ўдзельнічалі ў летняй школе ШОС ва Усходне-кітайскім універсітэце г. Шанхая. Студэнты факультэта некалькі гадоў запар выязджалі на археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Польшчы.



**Гістфак – флагман айчыннай гістарычнай адукацыі!**

**Ён размешчаны ў будынку, які з'яўляўся домам № 1 БДУ. Тут пачыналася гісторыя ўніверсітэта ў 1921 годзе**



*Занятак з gnss-станцыяй і раскопкі (Польшча, Славікова-Рэнкайчын)*

Штогод студэнты ўдзельнічаюць у міжнародных конкурсах, якія праводзяцца на базе іншых універсітэтаў. Арганізоўваюцца экскурсійныя паездкі для знаёмства з культурай суседніх краін (Расія, Літва, Польшча).

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Больш за 30 % студэнтаў гістарычнага факультэта займаюцца навукова-даследчай працай, бяруць удзел у міжнародных, рэспубліканскіх, універсітэцкіх канферэнцыях. Пры кафедрах дзейнічаюць дзве студэнцкія навуковыя лабараторыі і дванаццаць студэнцкіх навуковых гурткоў. У рамках студэнцкіх навуковых гурткоў MUSEUM, экскурсійнага клуба In VIA праводзяцца віктарыны, конкурсы і іншыя мерапрыемствы па пытаннях папулярызацыі гісторыка-культурнай, духоўнай спадчыны і дасягненняў Рэспублікі Беларусь. Студэнцкі гурток «Старажытны свет і сярэднія вякі» выдае электронны часопіс Scriptorium. Савет па якасці адукацыі сумесна з саветам маладых навукоўцаў факультэта выпускаюць электронны навуковы часопіс Historicus Iuvenis. Акрамя навуковых дзейнічаюць студэнцкія творчыя і спартыўныя аб'яднанні, інтэлектуальныя «Дэбат-клуб» і «Што? Дзе? Калі?».

## РАЗМЕРКАВАННЕ

У 2017 г. усе выпускнікі-бюджэтнікі гістарычнага факультэта былі забяспечаны першым працоўным месцам.

Выпускнікі спецыяльнасці «Гісторыя (па напрамках)» былі размеркаваны: 70 % ва ўстановы адукацыі; 10 % у Інстытут гісторыі НАН Беларусі, музеі, архівы; 9 % у органы МУС і мытнага камітэта, іншыя дзяржустановы; 11 % у БДУ, грамадскія арганізацыі і іншыя ўстановы. Выпускнікі спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)» былі размеркаваны: 35 % у музеі; 55 % у турыстычныя фірмы; 10 % у выканаўчыя камітэты, архівы, іншыя ўстановы. Тыя, хто засвоіў праграму спецыяльнасці «Дакументазнаўства (па напрамках)», размеркаваны ў розныя арганізацыі: 46 % у мытныя органы, выканаўчыя камітэты, банкі, БелНДІДАД; 30 % у архівы, музеі; 7 % ва ўстановы адукацыі; 13 % у іншыя ўстановы. Выпускнікі спецыяльнасці «Гісторыка-архівазнаўства» былі размеркаваны: 50 % у архівы, БелНДІЦЭД; 17 % ва ўстановы адукацыі; 33 % у дзяржаўныя і іншыя ўстановы.

## ЗАБЯСПЕЧАНАСЦЬ ІНТЭРНАТАМ

Іншагароднія студэнты гістарычнага факультэта пражываюць у інтэрнаце № 1 БДУ, які размешчаны на вул. Свярдлова, 34, недалёка ад вакзалаў і навучальнага корпуса. У 2017/2018 навучальным годзе месца ў інтэрнаце атрымалі 87 % студэнтаў першага курса.

## ПРАКТЫКІ

Па завяршэнні першай летняй сесіі студэнты выязджаюць на археалагічную і этнаграфічную практыку, займаюцца археалагічнымі раскопкамі і збіраюць этнаграфічны матэрыял па традыцыйнай культуры Беларусі. Шматлікія знаходкі, якія характарызуюць розныя аспекты і перыяды гісторыі Беларусі, папаўняюць калекцыі музейнага збору гістарычнага факультэта і прадстаўлены ў экспазіцыі навучальнай лабараторыі. Праграмы падрыхтоўкі спецыялістаў уключаюць таксама інфармацыйную, эўрыстычную, музейна-экскурсійную, дакументазнаўчую, педагагічную і іншыя практыкі.

## СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Студэнты гістарычнага факультэта БДУ маюць усе магчымасці для самарэалізацыі па розных напрамках у навучальнай, навуковай, грамадскай дзейнасці, у творчасці, спорце і турызме. Студэнцкія арганізацыі факультэта паспяхова рэалізуюць розныя моладзевыя праекты і праграмы, накіраваныя на раскрыццё творчага патэнцыялу таленавітай моладзі, вядуць пошук асоб, здольных прыўнесці штосьці новае, нестандартнае, «крэатыўнае» ў жыццё сваёй групы, факультэта і ўніверсітэта ў цэлым. У штогадовых мерапрыемствах «Турзлёт у Анусіне», «Капуснік», «Хвіліна славы», «Містар гістфака», «Дзень гістарычнага факультэта», «Дні айчыннай гісторыі» і іншых бярэ ўдзел вялікая колькасць студэнтаў усіх курсаў. Сумесныя высілкі студэнцкіх арганізацый накіраваны на тое, каб паўсядзённае жыццё было цікавым, змястоўным і разнастайным.

## ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

На гістарычным факультэце дзейнічае «Школа юнага гісторыка», асноўнай задачай якой з'яўляецца аказанне дапамогі вучням 7–11 класаў у вывучэнні айчыннай і сусветнай гісторыі, выяўленне пазнавальнай актыўнасці, творчых здольнасцяў, даследчых уменняў і навыкаў падчас навучальнай і навукова-даследчай дзейнасці.

## ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Яўген МАЛЬЧЭЎСКІ – выпускнік 2009 года спецыяльнасці «Дакументазнаўства і інфармацыйнае забеспячэнне кіравання». Працуе начальнікам упраўлення інавацыйнай палітыкі ДКНТ, кандыдат гістарычных навук.**



– Гістарычны факультэт з'яўляецца адным з найстарэйшых факультэтаў БДУ. Разам з тым грунтоўныя традыцыі арганізацыі навучальнага працэсу тут удала спалучаюцца з апорай на сучасныя тэхналогіі. І гэта дазваляе забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў гуманітарнай сферы высокага ўзроўню.

Для мяне гістфак – гэта, канешне, таленавітыя выкладчыкі, сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы, якія дзяліліся са мною сваімі ведамі на працягу ўсіх гадоў вучобы.

Набытыя веды дазваляюць мне адчуваць сябе адукаваным, інтэлектуальна развітым, эрудыяваным чалавекам, здольным падтрымаць гутарку ў самым высокім коле зносін. Дзякуючы добраму веданню замежных моў, якія вывучаў на факультэце, я магу вольна размаўляць з калегамі і сябрамі з замежных краін.

Гістфак – гэта таксама вялікія магчымасці для самарэалізацыі. Удзел у студэнцкіх аб'яднаннях, навукова-даследчых гуртках і спартыўных мерапрыемствах дазваляюць атрымаць такія навыкі, як камунікабельнасць і ініцыятыўнасць, уменне працаваць у камандзе і адстойваць свой пункт гледжання.

І якога ўзроўню я не дасягнуў бы, заўсёды буду ўдзячны гістарычнаму факультэту БДУ за атрыманы досвед жыцця.

**Сяргей КЛІШЭВІЧ – выпускнік 2013 года спецыяльнасці «Гісторыя (паліталогія)». Цяпер навучаецца ў аспірантуры на кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу. У 2011 г. быў абраны сакратаром ГА «БРСМ» БДУ. З 2013 па 2015 гг. працаваў у аддзеле па справах моладзі Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама, з 2015 па 2017 г. – другім сакратаром ЦК «БРСМ». У наш час выконвае абавязкі першага сакратара Мінскага гарадскога камітэта ГА «БРСМ».**



– Для мяне гістарычны факультэт БДУ адкрыў велізарныя магчымасці асобаснага росту. Тут сапраўды створаны ўсе ўмовы для развіцця студэнта ў тым напрамку, у якім хоча развівацца сам студэнт. Гістарычны факультэт ужо традыцыйна з'яўляецца не проста адукацыйным цэнтрам, дзе можна атрымаць добрыя веды, але і цэнтрам падрыхтоўкі лідараў. Тут вучаць адказваць не толькі за сябе, але і за людзей, якія цябе атачаюць. А гэта, вядома, вельмі неабходна чалавеку, які хоча звязаць сваё жыццё з працай з людзьмі.

# Хімічны факультэт

*Дэкан – доктар хімічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Дзмітрый Вадзімавіч СВІРЫДАЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14. Тэл. 2095253. Факс 2264998.*
*E-mail: chem@bsu.by; www.chemistry.bsu.by*

**Хімічны факультэт, заснаваны ў 1931 г., з'яўляецца вядучым вучэбна-навуковым цэнтрам па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў.**

У структуры факультэта **9 кафедраў**, на якіх працуюць **2** акадэмікі, **2** члены-карэспандэнты, **26** дактароў і **86** кандыдатаў навук. На факультэце навучаецца **750 студэнтаў** і звыш **30** аспірантаў.

Факультэт плённа супрацоўнічае з НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ, інстытутамі НАН Беларусі, дзе створаны філіялы кафедраў факультэта і арганізаваны спецыялізаваныя практыкумы. Там студэнты знаёмяцца з перадавымі даследаваннямі, выконваюць курсавыя і дыпломныя працы, удзельнічаюць у выкананні навуковых тэм.





**Хімфак – гэта новыя матэрыялы і біямедыцынскія тэхналогіі**

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

У апошнія гады на хімічным факультэце арганізавана падрыхтоўка па трох высокатэхналагічных спецыяльнасцях: **«Фундаментальная хімія»**, **«Хімія высокіх энергій»** і **«Хімія лекавых злучэнняў»**. Адначасова захаваны прыём па традыцыйнай для факультэта спецыяльнасці **«Хімія»** па чатырох напрамках: навукова-вытворчая дзейнасць, фармацэўтычная дзейнасць, навукова-педагагічная дзейнасць, ахова навакольнага асяроддзя. У залежнасці ад абранай спецыяльнасці выпускнікі атрымліваюць адну з кваліфікацый: *«Хімік. Даследчык», «Хімік. Інжынер», «Хімік. Выкладчык хіміі», «Хімік. Хімік-эколаг», «Хімік. Хімік-фармацэўт», «Хімік. Радыяцыйны хімік. Радыяхімік», «Хімік. Біяфармахімік»*. Навучальны працэс на хімічным факультэце скіраваны на развіццё творчага патэнцыялу студэнтаў, уменне самастойна будаваць сваю адукацыйную траекторыю, пастаянна папаўняць і абнаўляць свае прафесійныя кампетэнцыі.





### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Навучальны працэс на хімічным факультэце адпавядае сусветным адукацыйным стандартам, у чым студэнты пераконваюцца, трапляючы ў вядучыя замежныя універсітэты і навучальныя цэнтры на стажыроўкі. Штогод дзясяткі студэнтаў хімічнага факультэта накіроўваюцца на стажыроўку за мяжу па праграмах «Эразмус+», Дзяржаўнай праграме падрыхтоўкі спецыялістаў для ядзернай энергетыкі і інш.

На хімічным факультэце на англійскай мове чытаюць лекцыі прафесары з Польшчы, Аўстрыі, Чэхіі, Венгрыі, а таксама запрашаюцца лектары з вядучых універсітэтаў і навукова-даследчых інстытутаў Расіі. Падчас летніх вакацый студэнты ўдзельнічаюць у праграме летніх міжнародных студэнцкіх практык IAESTE (The International Association of the Exchange of Students for Technical Experience) і працуюць у даследчых цэнтрах і універсітэтах Еўропы.

На хімічным факультэце ў навучальнай праграме ёсць адзіны ў рэспубліцы білінгвальны курс «Уводзіны ў зялёную хімію», які дазваляе студэнтам не толькі авалодаць стратэгіяй і тактыкай хімічных сінтэзаў, бяспечных для навакольнага асяроддзя і чалавека, але і ўдасканальваць навыкі валодання пісьмовай і гутарковай англійскай мовай.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Каб працэс навучання быў эфектыўным і займальным, для студэнтаў укаранёны розныя інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі: кааператыўны метад навучання, лекцыйны падкастынг, дыстанцыйнае навучанне на платформе MOODLE. Студэнты спецыяльнасці «Хімія высокіх энергій» выконваюць лабараторныя працы ў рэжыме відэаканферэнцыі на даследчым рэактары, які размешчаны ў Францыі. Гэта адзіны сярод беларускіх ВНУ прыклад дыстанцыйнага навучання, у якім спалучаюцца не толькі тэорыя, але і практычныя заняткі ў рэжыме анлайн.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

На факультэце штогод праводзіцца шмат мерапрыемстваў з удзелам студэнтаў, у тым ліку дні гісторыі навукі і студэнцкая алімпіяда, розныя конкурсы і канцэрты. І кожную вясну факультэт дружна святкуе сваё галоўнае свята – Дзень хіміка.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі хімфака маюць шырокія магчымасці ў выбары сваёй прафесійнай дзейнасці. Яны могуць працаваць у даследчых і інжынерных цэнтрах прадпрыемстваў, інстытутах НАН Беларусі, хімічных лабараторыях буйных прамысловых аб'яднанняў фармацэўтычнай, хімічнай і радыёэлектроннай прамысловасці, на Беларускай АЭС, у нацыянальнай антыдопінгавай лабараторыі, навукова-практычных медыцынскіх цэнтрах, уключаючы пазітронны эмісійны тамограф у РНПЦ анкалогіі і радыялогіі імя М. М. Аляксандрава – усюды, дзе выкарыстоўваюцца хімічныя тэхналогіі. І не толькі ў Беларусі. Тыя, хто схільны да выкладчыцкай дзейнасці, рэалізуюць сябе ў навучальных установах.

Хімічны факультэт – адзіная арганізацыя ў нашай краіне, дзе рыхтуюць хімікаў-універсалаў, здольных распрацоўваць і ўкараняць хімічныя тэхналогіі VI тэхналагічнага ўкладу, ствараць новыя матэрыялы і лекавыя рэчывы. Нашым лозунгам з'яўляецца «Here we create the future!».

Нашы выпускнікі становяцца не толькі буйнымі навукоўцамі і арганізатарамі вытворчасці, але і прадпрымальнікамі, дыпламатамі, крыміналістамі, менеджарамі, а гэта значыць, што яны лёгка ўваходзяць ў іншыя сферы дзейнасці і дасягаюць у іх знакавых поспехаў. Мы чакаем вас на хімічным факультэце. Вы не пашкадуеце, калі прыйдзеце вучыцца да нас.

### ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Кацярына СКОРБ, дацэнт кафедры неарганічнай хіміі, кандыдат хімічных навук, лаўрэат прэзідэнцкай стыпендыі маладым навукоўцам. Скончыла хімічны факультэт у 2006 годзе, абараніла кандыдацкую дысертацыю ў 2009 годзе. Зараз знаходзіцца на стажыроўцы ў Гарвардскім універсітэце (ЗША)**



– Хімфак – гэта вялізны калектыў высокапрафесійных выкладчыкаў, гэта верныя і добрыя сябры на ўсё жыццё, гэта САПРАЎДНАЯ спецыяльнасць. Зараз сфер прыкладання хімікаў велізарная колькасць – гэта і эколагі, і фармацэўты, і настаўнікі, і інжынеры, і даследчыкі, і многія іншыя. Але самае галоўнае тое, што хімічны факультэт – скарбніца магчымасцяў, якія адкрываюцца перад табой па яго заканчэнні. Ты малады, разумны і мэтанакіраваны – перад табой адкрыты ўсе гарызонты. Далучайся да каманды універсітэцкіх хімікаў!

**Дзмітрый ШЧУКІН, прафесар Ліверпульскага універсітэта (Вялікабрытанія)**



– Для многіх з нас хімічны факультэт БДУ, які мне пашчасціла скончыць у 1998 г., стаў выдатнай школай, якая зрабіла з нас кампетэнтных і інтэлігентных людзей, здольных шмат чаго дасягнуць у жыцці. Хімік – не проста прафесія. Гэта хобі, гэта пакліканне, а для большасці з нас гэта само жыццё. Дзе б ні працаваў хімік, кім бы ён ні быў, яго вылучае розум, напорыстасць, мэтанакіраванасць і незвычайнае ўменне выйсці пераможцам з любой сітуацыі. Так навучылі нас нашыя выкладчыкі. Хімфак – гэта вялікая сям'я, поўная добразычлівасці і паважлівых адносін, якія вы цалкам зможаце адчуць, паступіўшы на хімічны факультэт БДУ.

# Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій

*Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт*
***Сяргей Уладзіміравіч МАЛЫ***
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5. Тэл. 2095818, 2095817.*
*E-mail: maly@bsu.by; www.rfe.bsu.by*





**Радыёфізікаў у БДУ рыхтуюць з 1962 г. У 1976 г. адкрыты факультэт радыёфізікі і электронікі. У 2010 г. ён перайменаваны ў факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій.**

У структуры: **8 кафедраў** (радыёфізікі і лічбавых мэдыятэхналогій; фізічнай электронікі і нанатэхналогій; інфарматыкі і камп'ютарных сістэм; тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій; сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання; фізікі і аэракасмічных тэхналогій), **4** навукова-даследчыя лабараторыі, **3** СНДЛ, даследча-тэхналагічны цэнтр «Нанатэхналогіі і фізічная электроніка», цэнтр аэракасмічнай адукацыі, сучасныя навучальныя лабараторыі і камп'ютарныя класы.

Навучальны працэс забяспечваюць болей за 100 выкладчыкаў, у тым ліку **1** акадэмік і **1** член-карэспандэнт НАН Беларусі, **15** прафесараў, **63** дацэнты, **50** супрацоўнікаў навучальна-дапаможнага складу.

На факультэце навучаюцца **900 студэнтаў**, **100** магістрантаў, **40** аспірантаў, **6** дактарантаў.

## Адукацыя на ўзроўні найлепшых еўрапейскіх ВНУ





### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па спецыяльнасцях: **«Радыёфізіка»**, **«Фізічная электроніка»**, **«Камп'ютарная бяспека»** (Напрамак: Радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі), **«Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі»**, **«Прыкладная інфарматыка»** (Напрамак: Інфармацыйныя тэхналогіі тэлекамунікацыйных сістэм з наступнымі спецыялізацыямі: мультымедыйныя інфармацыйныя тэхналогіі, квантавая радыёфізіка і лазерныя сістэмы, стахастычныя працэсы і сістэмы, мікра- і наносістэмы, камп'ютарнае прыборабудаванне, інтэлектуальныя інфармацыйныя тэхналогіі, прыкладная электрадынаміка, цвёрдацельная электроніка, нанаэлектроніка і нанатэхналогіі, квантавая электроніка, фізічная мікраэлектроніка, медыцынская электроніка, тэлекамунікацыйныя і інфармацыйныя сістэмы, інфармацыйна-аналітычныя метады ў электроніцы, радыёэлектронныя і тэлекамунікацыйныя сістэмы, комплекснае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі тэлекамунікацыйных і інфармацыйных сістэм, праграмнатэхнічныя сродкі і сістэмы абароны інфармацыі, інтэлектуальныя тэхналогіі абароны інфармацыйных сістэм, мадэляванне і аналіз інфармацыйных сістэм, глабальныя навігацыйныя і тэлекамунікацыйныя сістэмы, радыёэлектронныя сістэмы апрацоўкі і перадачы інфармацыі і г. д.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі факультэта працуюць у розных сферах інфармацыйных тэхналогій, тэлекамунікацый, радыёэлектроннага і аптычнага прыборабудавання, праграмаванай электронікі, мікра- і нанаэлектронікі, лазерных аптычных тэхналогій. Палова выпускнікоў факультэта размяркоўваюцца і пасяховa працуюць у кампаніях-рэзідэнтах Парку высокіх тэхналогій (EPAM Systems, Itransition, Bel-Hard, IBA, «Навусофт» і інш.). Сярод іх ёсць кіраўнікі і вядучыя спецыялісты навукова-вытворчых аб'яднанняў, даследчых інстытутаў, ВНУ, буйныя бізнесмены.

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Пры правядзенні навучальнай і навуковай працы, выкананні курсавых і дыпломных прац актыўна выкарыстоўваюцца філіялы кафедраў у НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі», «Інтэграл» «НТЛаб-сістэмы», ДНВА «Планар». На факультэце створаны сумесныя навучальна-навуковыя лабараторыі з вядучымі высокатэхналагічным кампаніямі: EPAM Systems, Motorola, Itransition, Hewlett-Packard.

### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Факультэт мае цесныя навукова-тэхнічныя сувязі з вядучымі замежнымі навуковымі цэнтрамі і ўніверсітэтамі Германіі, Францыі, Даніі, Бельгіі, Нідэрландаў, Швейцарыі, Італіі, Славеніі, Расіі.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Студэнты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні навуковых даследаванняў на базе навуковых лабараторый факультэта, НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, навуковых інстытутаў і цэнтраў НАН Рэспублікі Беларусь, навукаёмістых прадпрыемстваў. Каардынацыя навуковай працы студэнтаў ажыццяўляецца саветам па НДРСА факультэта. На факультэце функцыянуюць навуковае студэнцкае таварыства, тры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі: «Паўправадніковых лазераў», «Нанатэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання», «Мадэляванне і аналіз стахастычных працэсаў і сістэм». На базе факультэта створаны і актыўна функцыянуюць студэнцкія ячэйкі міжнародных навуковых грамадстваў OSA і IEEE. Студэнты, магістранты і аспіранты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у распрацоўцы ўніверсітэцкага нанаспадарожніка, запуск якога на калязямную арбіту плануецца ў 2018 годзе.

### СТАЖЫРОЎКІ

На факультэце рэалізуюцца праграмы стажыровак студэнтаў у вядучых навуковых цэнтрах Еўропы: Institute of Science and Technology (Вена, Аўстрыя), Helmholtz-Zentrum Dresden-Rossendorf (HZDR) (Дрэздэн, Германія), Deutsches Elektronen-Synchrotron (DESY) (Гамбург, Германія), The European Organization for Nuclear Research (CERN) (Жэнева, Швейцарыя).

Студэнты-радыёфізікі жывуць актыўным і яркім грамадскім жыццём.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

На факультэце паспяхова функцыянуюць студэнцкія грамадскія арганізацыі (прафсаюзная арганізацыя, БРСМ, савет старастаў, студэнцкі саюз, творчы саюз і інш.) . Штогод праводзяцца розныя культурна-масавыя мерапрыемствы: Дзень радыёфізіка, капуснік, «Міс» ці «Містар факультэта», навагодні вечар. Кожныя пяць гадоў сумесна з Беларускім рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем радыёфізікаў праводзяцца юбілейныя мерапрыемствы.

Круглы год праходзяць творчыя вечары, квэсты, конкурсы, фотавыставы. Існуе шмат цікавых праектаў, напрыклад, «Факультэтый узаемадапамогі». На ім студэнты старэйшых (і не толькі) курсаў дапамагаюць першакурснікам разабрацца з матэматычнымі прадметамі. Сутнасць праекта «Музычная пятніца» відавочная з назвы: таленавітыя студэнты выконваюць творчыя нумары па пятніцах падчас вялікага перапынку. Карысным апынуўся гід першакурсніка «#rfe_guide» – цыкл online-артыкулаў пра факультэт вачыма студэнтаў для новых радыёфізікаў.

Радыёфізікі актыўна ўдзельнічаюць у спартыўным жыцці БДУ. Турніры па футболе, тэнісе, баскетболе, веласпорце, валейболе збіраюць не толькі студэнтаў усіх курсаў, але і выкладчыкаў факультэта.

На факультэце выдаецца BUG – студэнцкая газета, на старонках якой публікуецца актуальная інфармацыя пра студэнцкае жыццё.

### ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

На факультэце актыўна вядзецца прафарыентацыйная праца з навучэнцамі школ, гімназій і ліцэяў. З многімі навучальнымі ўстановамі заключаны дамовы аб супрацоўніцтве. Праводзяцца штомесячныя экскурсіі па факультэце для школьнікаў з наведваннем кафедраў, навучальных і навуковых лабараторый. Праводзяцца выязныя выступленні выкладчыкаў і студэнтаў факультэта перад абітурыентамі. У рамках заняткаў са школьнікамі ажыццяўляецца падрыхтоўка да алімпіяд і навуковых канферэнцый па фізіцы, да цэнтралізаванага тэсціравання па фізіцы і матэматыцы. Штогод у рамках дзён адчыненых дзвярэй праводзіцца школа радыёфізіка, а таксама алімпіяда па фізіцы «Абітурыент БДУ».

**Мікалай ЗЯНЬКЕВІЧ, старшы выкладчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, галоўны інжынер-праграміст EPAM Systems**



*– З фізікі вядома, што калі частата ўласных хістанняў супадае з частатой знешняга ўздзеяння, то ўзнікае рэзананс і ўздзеянне можа быць шматразова ўзмоцнена. Нешта падобнае, як мне здаецца, адбываецца і на нашым факультэце. Цікаўнасць і энергія студэнтаў узмацняецца энтузіязмам і вопытам выкладчыкаў – яны падладжваюцца, прыцірающа адзін да аднага, а затым пачынаюць працаваць на поўную моц. Такі сплаў дазваляе студэнтам атрымаць агульны фундаментальны базіс вышэйшай фізіка-тэхнічнай адукацыі, а таксама практычныя навыкі, запатрабаваныя як у Беларусі, так і за мяжой, а выкладчыкі змушаны працягваць самаадукацыю і развівацца разам са сваімі вучнямі.*

# Філалагічны факультэт

*Дэкан – доктар філалагічных навук прафесар Іван Сямёнавіч РОЎДА*
*Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31. Тэл. 2223421, 2223602.*
*E-mail: phyl@bsu.by; www. philology.bsu.by*

Падрыхтоўка спецыялістаў-філолагаў ва ўніверсітэце пачалася ў год яго заснавання: 12 жніўня 1921 г. быў аб'яўлены прыём на этнолагалінгвістычнае аддзяленне факультэта грамадскіх навук. Адкрыццё самастойнага філалагічнага факультэта адбылося ў 1939 г.

## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Да сярэдзіны 1990-х гадоў аснову факультэта складалі два аддзяленні: беларускай і рускай мовы і літаратуры. На сёння падрыхтоўка студэнтаў-філолагаў на першай ступені атрымання вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца па наступных спецыяльнасцях:

- **Беларуская філалогія** (Напрамкі: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць, камп'ютарнае забеспячэнне, дзелавая камунікацыя). У залежнасці ад напрамку прысвойваецца наступная кваліфікацыя: *Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік. Спецыяліст па камп'ютарнай філалогіі. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі.*
- **Руская філалогія** (Напрамкі: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць, камп'ютарнае забеспячэнне, дзелавая камунікацыя, руская мова як замежная). У залежнасці ад напрамку прысвойваецца наступная кваліфікацыя: *Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік. Спецыяліст па камп'ютарнай філалогіі. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі. Выкладчык рускай мовы як замежнай.*
- **Славянская філалогія**. Кваліфікацыя: *Філолаг. Выкладчык славянскіх моў і літаратур (з указаннем моў і літаратур). Перакладчык.*
- **Класічная філалогія**. Кваліфікацыя: *Філолаг. Выкладчык класічных моў, антычнай літаратуры і сучаснай замежнай мовы (з указаннем мовы). Перакладчык.*
- **Рамана-германская філалогія**. Кваліфікацыя: *Філолаг. Выкладчык замежных моў і літаратур (з указаннем моў і літаратуры). Перакладчык.*
- **Усходняя (кітайская) філалогія**. Кваліфікацыя: *Філолаг. Выкладчык замежных моў і літаратур (з указаннем моў і літаратуры). Перакладчык.*

Усе студэнты маюць магчымасць праходзіць моўную стажыроўку ў замежных краінах. Так, напрыклад, кожны студэнт спецыяльнасці «Усходняя (кітайская) філалогія» за перыяд навучання адзін год праводзіць у адным з універсітэтаў Кітая.

## ПРАКТЫКА

На працягу навучання студэнты філалагічнага факультэта праходзяць вучэбныя і вытворчыя практыкі ва ўстановах адукацыі рознага тыпу, а таксама на пляцоўках базавых арганізацый – Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, ААТ «Славянскія мовы і культуры», «Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа», Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», ДУ «Навукова-практычны цэнтр Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь» і інш.

## КАФЕДРЫ І СКЛАД

На **16 кафедрах** працуе **230** выкладчыкаў – высакакласных спецыялістаў у сваёй галіне. У іх ліку **27** дактароў навук, прафесараў і больш за **120** кандыдатаў навук, дацэнтаў.

Асяродкамі вучэбна-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу з'яўляюцца **14** спецыялізаваных кабінетаў (беларускай, рускай, польскай, украінскай, чэшскай, славацкай, сербскай, нямецкай, італьянскай, кітайскай і інш. філалогій), а таксама **2** цэнтры: 1) філалагічнай падрыхтоўкі; 2) інфармацыйных тэхналогій. У складзе апошняга некалькі лабараторый: вучэбная лабараторыя тэхнічных сродкаў навучання і вучэбная лабараторыя інфармацыйна-метадычнага забеспячэння адукацыі.



## Філфак жыве пад дэвізам: роднае варта берагчы!





## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Як вядома, невычэрпнай крыніцай тэм, вобразаў, мастацка-выяўленчых сродкаў для роднай літаратуры з'яўляецца вусная народная творчасць. Таму невыпадкова сталася, што больш за паўстагоддзя на факультэце функцыянуе вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору. За гады актыўнай дзейнасці былі сабраны найбагацейшыя ў краіне архівы песень, казак, прыказак і прымавак, якімі сёння карыстаюцца не толькі даследчыкі, але і творчыя калектывы. Поруч з «дарослай» лабараторыяй значных поспехаў дасягнулі і ўдзельнікі студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі фальклору і этнакультуралогіі. Яны неадаразова атрымлівалі гранты на правядзенне ўласных даследаванняў.

## СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Пасляховая вучоба – гэта далёка не ўсё, чым займаюцца нашы студэнты! Плённаму развіццю творчых здольнасцей і максімальна поўнай самарэалізацыі спрыяюць разнастайныя студэнцкія гурткі і творчыя калектывы, ладзяцца тэматычныя вечарыны і праводзяцца шматлікія конкурсы, як у межах факультэта, так і ўсяго ўніверсітэта, дзе студэнты-філолагі нярэдка становяцца пераможцамі ці заваёўваюць высокія прызавыя месцы! Выдатнае валоданне замежнымі мовамі і бліскучыя артыстычныя здольнасці забяспечваюць поспех у рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах па кітайскай, польскай, французскай і іншых замежных мовах, дзе нашы студэнты неаднойчы станавіліся пераможцамі!

Студэнцкія творчыя калектывы, якія дзейнічаюць на філалагічным факультэце БДУ:

- Літаратурнае аб'яднанне «Альтанка»
- Гурток «Роднае слова»
- Гурток перакладчыкаў кітайскай літаратуры на беларускую мову «对白» («Дыялог»)
- Гурток «Школа молодого автора»
- Лінгвакультуралагічны гурток «История, культура и языки Италии»
- СНДЛ «Фальклору і этнакультуралогіі»
- Фальклорна-этнаграфічны гурт «Багач»
- Харавая камерная капэла студэнтаў італьянскай філалогіі
- Дыскусійны клуб пры кафедры англійскага мовазнаўства
- Клуб аматараў фантастыкі «KAFCo»

## ЗАБЯСПЕЧАНАСЦЬ ІНТЭРНАТАМ

У мэтах падтрымкі сацыяльна значных педагагічных спецыяльнасцей рашэннем жыллёва-бытавой камісіі філалагічнага факультэта 100 % студэнтаў 1 курса спецыяльнасцей «беларуская філалогія», «руская філалогія» і «беларуская і руская філалогія» забяспечваюцца месцамі ў інтэрнаце.

## ІМПРЭЗЫ

**Патрыятычна-асветніцкая акцыя «Вязынка»**

Злёт студэнтаў на малой радзіме народнага паэта Беларусі ў філіяле музея Янкі Купалы ў Вязынцы справядліва лічыцца галоўным святам філалагічнага факультэта БДУ і ўсяго ўніверсітэта. Менавіта тут, у колішнім маёнтку Вязынка, нарадзіўся Ясь Луцэвіч, будучы народны паэт Беларусі Янка Купала (1882 –1942). Неад'емнай часткай акцыі з'яўляецца знаёмства студэнцкай моладзі з музеем, у якім узноўлены інтэр'ер сялянскай хаты ў такім выглядзе, як гэта было пры жыцці Янкі Купалы.

Традыцыя правядзення злётаў на радзіме Янкі Купалы была закладзена студэнтамі і выкладчыкамі філалагічнага факультэта яшчэ ў далёкім 1976 годзе. Акцыя адрадзілася на пачатку XXI стагоддзя і паступова набыла статус агульнаўніверсітэцкай.

У праграме ўрачыстасці традыцыйны святочны канцэрт, ускладанне кветак да помніка Песняру, наведванне экспазіцыі музея, культурна-забаўляльна-спартыўная праграма «На Парнасе»: каша «ад рэктара», пенальці дэкану, чытанне вершаў і спевы каля вогнішча, спартыўнае арыентаванне, анімацыйная праграма і многае іншае.

**Фестываль моў філалагічнага факультэта БДУ** – гэта ўнікальнае культурна-асветніцкае мерапрыемства, прысвечанае мовам і мовазнаўству, арыентаванае на шырокую аўдыторыю. Свята моў і лінгвістыкі!

На працягу дня ўдзельнікі фестывалю могуць наведаць шэсць 45-хвілінных мінілекцый, абіраючы самае цікавае з аповедаў пра 50 розных моў свету – старажытных і сучасных, рэдкіх і распаўсюджаных, а таксама з разнастайных захапляльных навукова-папулярных лекцый па лінгвістычную тэматыку, лекцый па беларусістыцы, моўных гульняў, лінгвістычных задач і г.д.

## ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

Школьнікі 8–11 класаў запрашаюцца да ўдзелу ў «Школы юных філолагаў», дзе для іх традыцыйна праводзіцца Мінская алімпіяда па лінгвістыцы, а таксама конкурс творчых работ «Гульня слоў».

## ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ, доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі, старшыня Міжнароднага камітэта славістаў (2008–2013), старшыня Беларускага камітэта славістаў, выпускнік 1977 года.**



*– Паступленне ў 1972 годзе на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта стала вызначальнай падзеяй не толькі на шляху майго адукацыйнага ўдасканалення, але і вызначыла ўвесь далейшы жыццёвы і прафесійны шлях. Само студэнцкае жыццё запомнілася многім. Гэта і пераезд з маленькай вёскі ў сталіцу. Гэта і студэнцкі інтэрнат і добрае сяброўства. Гэта і рамантыка будаўнічых атрадаў. Але самае галоўнае – гэта сам працэс навучання. Безумоўна, вучоба ў ВНУ, адносіны да яе ў многім залежаць ад асоб выкладчыкаў. У гэтым сэнсе мне, як і ўсяму нашаму курсу, вельмі пашанцавала. У нас былі цудоўныя выкладчыкі-моваведы, якія не толькі далі добрыя прафесійныя веды, але і прывілі любоў да лінгвістычнай навукі. Самае ж галоўнае, вучоба на філалагічным факультэце БДУ стала тым вызначальным фактарам, які назаўсёды звязаў мой лёс і маё жыццё з беларускай мовай і беларускім мовазнаўствам, якім я ўвесь час стараюся служыць па меры маіх сіл і якія дазволілі мне ў поўнай меры рэалізаваць свой творчы патэнцыял і адчуваць задавальненне ад зробленага на гэтай ніве.*

**Дзмітрый ГЕРЧЫКАЎ, намеснік дырэктара дэпартамента маркетынгу і камунікацый асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола», журналіст, спартыўны каментатар тэлеканала «Беларусь 5», выпускнік 2007 года.**



*– Філфак (і для мяне, і для любога хлопца) – гэта школа жыцця, пасля якой, напэўна, ужо ніякія выклікі і экстрэмальныя сітуацыі не страшныя. Пасля 5 гадоў тут гатовы да самых нечаканых паваротаў у побыце, працы і адносінах. Асаблівае дзякуй факультэту за кругагляд: думаю, база, закладзеная тут, будзе выклікаць зайздрасць сяброў і калегаў аж да старасці. І, вядома, удзячны людзям, якія атачалі мяне на працягу навучання. З многімі выкладчыкамі пасля заканчэння ВНУ застаюся ў цёплых адносінах да гэтага дня.*

# Факультэт філасофіі і сацыяльных навук

*Дэкан – кандыдат гістарычных навук дацэнт Вадзім Францавіч ГІГІН*
*Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9. Тэл./факс 2597047.*
*Email: phse@bsu.by; www.ffsn.bsu.by*

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук быў створаны ў 1989 г. першапачаткова як філасофска-эканамічны факультэт. Сёння ФФСН з'яўляецца адзіным міждысцыплінарным факультэтам БДУ.** Ён арганічна складаецца з трох класічных спецыяльнасцяў: філасофіі, сацыялогіі і псіхалогіі, а таксама досыць новай – сацыяльных камунікацый.






**ФФСН – самы ўнікальны факультэт па наборы спецыяльнасцяў і адзіны ў Рэспубліцы Беларусь, які ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў у галіне філасофіі!**



## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Спецыяльнасць **«Філасофія»**. Кваліфікацыя: *Філосаф. Выкладчык філасофіі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.* Спецыялізацыі: Сацыяльная філасофія, гісторыя філасофіі. Тэрмін навучання: дзённая форма – 4 гады, завочная форма – 5 гадоў.

Дысцыпліны, якія вывучаюцца: гісторыя сусветнай і айчыннай філасофіі, філасофія і метадалогія навуковага пазнання, сацыяльная філасофія, логіка, культуралогія, этыка, эстэтыка, сацыяльная экалогія, а таксама псіхалогія, сацыялогія, гісторыя і іншыя сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны.

Спецыяльнасць **«Сацыялогія»**. Кваліфікацыя: *Сацыёлаг. Выкладчык сацыялогіі і сацыяльна-палітычных дысцыплін.* Спецыялізацыі: Сацыялогія кіравання, метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання, палітычная сацыялогія. Тэрмін навучання: дзённая форма – 4 гады, завочная – 5 гадоў.

Дысцыпліны, якія вывучаюцца: тэорыя і гісторыя сацыялогіі, метадалогія і метады сацыялагічных даследаванняў, эканамічная сацыялогія, сацыялогія асобы, працы, кіравання, навукі, адукацыі, выхавання, культуры, рэлігіі, масавых паводзін, тэорыя і практыка Public Relations, метады вывучэння грамадскай думкі і электаральных паводзін, эканоміка, дэмаграфія, статыстыка і дысцыпліны матэматычнага цыкла.

Спецыяльнасць **«Псіхалогія»**. Кваліфікацыя: *Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі.* Спецыялізацыі: Сацыяльная псіхалогія, медыцынская псіхалогія. Тэрмін навучання: дзённая форма – 4 гады, завочная другая вышэйшая – 3 гады.

Дысцыпліны, якія вывучаюцца: агульная, узроставая, сацыяльная, эканамічная, педагагічная, інжынерная і медыцынская псіхалогія, псіхалогія ўлады, патапсіхалогія, гісторыя псіхалогіі, псіхалогія працы, кіравання і творчасці, дыферэнцыяльная псіхалогія, статыстыка і дысцыпліны матэматычнага цыкла, асновы псіхалагічнай дапамогі, псіхалагічная карэкцыя і кансультаванне, методыка выкарыстання псіхалагічных ведаў у працы з кадрамі.

Спецыяльнасць **«Сацыяльныя камунікацыі»**. Кваліфікацыя: *Спецыяліст па сацыяльных камунікацыях.* Спецыялізацыі: Арганізацыйныя камунікацыі, масавыя камунікацыі, маркетынгавыя камунікацыі.

Дысцыпліны, якія вывучаюцца: гісторыя навук пра інфармацыю і камунікацыю, тэорыя камунікацыі, маркетынгавыя камунікацыі, метадалогія даследавання камунікацый, менеджмент, арганізацыйныя паводзіны, канфлікталогія, медыяпланаванне, Public Relations, семіялогія, маўленчая камунікацыя, сацыялогія масавай камунікацыі, web-дызайн, менеджмент інавацый, правілы вядзення дзелавых перамоў, мастацтва прэзентацыі, рэкламная справа і інш.

Факультэт ажыццяўляе набор у магістратуру па спецыяльнасцях: філасофія, сацыялогія, псіхалогія, псіхалогія ў бізнесе, камунікатыўны менеджмент, а таксама рыхтуе кадры вышэйшай кваліфікацыі ў аспірантуры і дактарантуры.

## РАЗМЕРКАВАННЕ

Выпускнікі факультэта ўсіх спецыяльнасцяў працуюць у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, органах дзяржаўнага кіравання, навуковых і адукацыйных цэнтрах, камерцыйных структурах, грамадскіх аб'яднаннях, СМІ, рэкламных і кадравых агенцтвах.

## СТРУКТУРА

ФФСН – гэта перш за ўсё вялікі і дружны калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. У нас працуюць вядучыя навуковыя гуманітарыі Беларусі. Рэгулярна на факультэт з лекцыямі прыязджаюць вядомыя замежныя эксперты.

Прафесарска-выкладчыцкі склад факультэта налічвае больш за 150 чалавек, у тым ліку акадэмік НАН Беларусі, **2** членыкарэспандэнта НАН Беларусі, **19** дактароў навук і больш за **70** дацэнтаў. На факультэце філасофіі і сацыяльных навук навучаецца больш за **1000 студэнтаў**, **64** магістранты, **35** аспірантаў дзённай і завочнай формаў навучання, а таксама **14** дактарантаў.

Структура факультэта складаецца з **5 кафедраў**. Таксама функцыянуюць 3 спецыялізаваныя саветы па абароне доктарскіх дысертацый і 2 навучальныя лабараторыі.

## СУВЯЗЬ З ПРАКТЫКАЙ

Базавымі партнёрамі факультэта выступаюць вядучыя навукова-адукацыйныя і вытворчыя цэнтры Рэспублікі Беларусь. Сярод іх Інстытут філасофіі НАН Беларусі, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны прэс-цэнтр Рэспублікі Беларусь і іншыя.

## МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук інтэнсіўна развівае адукацыйныя і навуковыя сувязі з шэрагам вядучых універсітэтаў Англіі, Іспаніі, Італіі, Германіі, Швецыі, Фінляндыі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Польшчы, Расіі, ЗША, Украіны, Францыі, Кітая. Студэнты і выкладчыкі факультэта рэгулярна ўдзельнічаюць у міжнародных праграмах акадэмічнай мабільнасці ERASMUS+ і Copernicus, на факультэце праводзяцца адборачныя туры міжнароднай алімпіяды па філасофіі і міжнароднага Балтыйскага конкурсу эсэ па філасофіі на англійскай мове пры падтрымцы Міжнароднай асацыяцыі філасофскіх грамадстваў і UNESCO.

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

У рамках навукова-даследчай працы для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў факультэта функцыянуюць студэнцкая навуковая лабараторыя «Соцыум», філасофскі дыскусійны клуб, міждысцыплінарны навукова-тэарэтычны семінар «Інавацыйныя стратэгіі ў сучаснай сацыяльнай філасофіі», адукацыйны праект English Learning Club FPSS, студыя PsyFox, псіхалагічны квэст-семінар, а таксама штогод праводзіцца навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў «Чалавек. Культура. Грамадства».

## ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі факультэта філасофіі і сацыяльных навук размяркоўваюцца ў вядучыя дзяржаўныя і камерцыйныя арганізацыі нашай краіны. Сярод іх НАН Беларусі, вядучыя ВНУ Рэспублікі Беларусь, ІАЦ пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя тэлевізійныя каналы, адукацыйна-аздараўленчыя цэнтры, абласныя і раённыя выканаўчыя камітэты, кампаніі «Белавія», «Атлант-М», Wargaming і іншыя.

## ЛАГІСТЫКА

Навучальны корпус нашага факультэта размешчаны ў самым цэнтры г. Мінска, па адрасе вул. Кальварыйская, 9. Гэты сучасны будынак, дзе для студэнтаў уладкаваны болей за 100 прасторных аўдыторый, бібліятэка, сталовая, спартыўная і актавая залы. Штогод больш за 85 % іншагародніх студэнтаў атрымліваюць месцы ў камфартабельным інтэрнаце, размешчаным у зялёнай зоне па вул. Курчатава, 6, дзе наладжана зручная транспартная сувязь з навучальным корпусам факультэта. Студэнты прызыўнога ўзросту маюць магчымасць навучацца на ваеннай кафедры БДУ.

## СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Факультэт славіцца сваім студэнцкім грамадскім жыццём. Наш дэвіз – давяраць студэнтам! Студэнцкае самакіраванне з'яўляецца асновай выхаваўчай работы на нашым факультэце.

Мноства навуковых, культурных, спартыўных і грамадскіх мерапрыемстваў, якія складаюць традыцыі факультэта, заслужылі аўтарытэт і вядомасць на ўніверсітэцкім, рэспубліканскім і міжнародным узроўнях. Самыя папулярныя з іх – турзлёт ФФСН, дзень першакурсніка, ліга малодага грамадзяніна, дзень нараджэння факультэта, фэст кароткаметражнага кіно «Кальварыйскія бабры», «Містар» і «Міс ФФСН».

## ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

Асноўнымі напрамкамі прафарыентацыйнай працы факультэта з'яўляюцца заняткі для школьнікаў старэйшых класаў у школе юнага філосафа «Пайдэя», штогадовая віктарына для школьнікаў «Першы крок у прафесію» і адукацыйна-прафарыентацыйны праект «Майстэрня сацыякама».

## ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Дыяна АЎСЮКЕВІЧ, аспірантка ФФСН, лаўрэат стыпендыі імя К. Крапівы**




*– Адукацыя – гэта не вынік, а працэс. Універсітэт заклікаены не выдаваць гатовыя вынікі, а спрыяць фарміраванню ўстойлівай пазіцыі і рэфлексіўнага стаўлення да сябе і навакольнага свету. Гады вучобы ў БДУ прайшлі менавіта так: мы пазнавалі сябе, сталелі, атрымлівалі веды і прагнулі знайсці ім найбольш эфектыўнае прыкладанне. Вельмі хутка надыдзе момант, калі мы зможам нарэшце праверыць ККД нашых высілкаў, але сумненняў у поспеху насамрэч практычна няма. Здаровыя амбіцыі, творчая энергія і непахісная вера ва ўласныя сілы – гэтыя якасці сёння для нас з'яўляюцца не абавязковымі пунктамі ў рэзюмэ, а рэальным багажом, назапашаным за гады вучобы на факультэце філасофіі і сацыяльных навук!*

# Эканамічны факультэт

*Дэкан – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь*
*Міхаіл Міхайлавіч КАВАЛЁЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31. Тэл. 3276025, 2178352.*
*E-mail: economics@economy.bsu.by; www. economy.bsu.by*





**Мы разумных робім багацейшымі, а багатых – разумнейшымі!**






**Эканамічны факультэт заснаваны ў 1999 г. Ён працягвае слаўныя традыцыі падрыхтоўкі эканамістаў у БДУ – у 1925 г. менавіта эканамісту быў выдадзены дыплом БДУ № 1.** Сёння на факультэце на ўсіх формах навучаюцца каля **1870 студэнтаў** і магістрантаў. Вучацца не толькі беларусы, але і 270 замежных грамадзян з 16 краін свету. На **8 кафедра**х працуюць 97 штатных выкладчыкаў, з якіх **13** прафесараў і дактароў навук, **45** дацэнтаў і кандыдатаў навук. Па сумяшчальніцтве тут працуюць вядомыя навукоўцы-практыкі, кіраўнікі і вядучыя спецыялісты міністэрстваў, банкаў, дзяржаўных устаноў, кансалтынгавых фірмаў. Пры кожнай кафедры маецца 1 альбо 2 філіялы ад вытворчых арганізацый, якія бяруць на працу шмат выпускнікоў.

## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Абітурыенты пасля паступлення на факультэт размяркоўваюцца на 5 спецыяльнасцяў: **Эканамічная тэорыя** (кваліфікацыя *«Эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін»*), **Эканоміка** (кваліфікацыя *«Эканаміст-аналітык»*), **Эканамічная інфарматыка** (кваліфікацыя *«Эканаміст-інфарматык»*), **Фінансы і крэдыт** (напрамкі «Фінансы» і «Банкаўская справа», кваліфікацыя *«Эканаміст»*), **Менеджмент** (напрамкі «Міжнародны менеджмент», «Інавацыйны менеджмент», кваліфікацыя *«Менеджар-эканаміст»*). На ўсіх спецыяльнасцях тэрмін навучання – 4 гады.

Першыя два гады ўсе студэнты атрымліваюць фундаментальную эканамічную (макра-, мікра-, агра-, міжнародная, рэгіянальная эканоміка), фінансавую (бухуліК і аўдыт, карпаратыўныя фінансы, бізнес-планаванне, інвестыцыйны аналіз), а таксама інструментальную (матэматыка, інфарматыка, базы дадзеных, статыстыка, эканаметрыка, метады прыняцця рашэнняў, лагістыка) падрыхтоўку.

Паглыбленае тэарэтычнае і практычнае навучанне працягваецца на III–IV курсах у адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю, яе напрамкам і спецыялізацыяй.

## МІЖНАРОДНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ

На эканамічным факультэце шмат увагі надаецца вывучэнню англійскай мовы, аднак зацікаўленыя могуць вывучаць і іншыя мовы як мовы нашых важных гандлёвых партнёраў. Многія студэнты навучаюцца адзін ці два семестры за мяжой у рамках праектаў «Эразмус Мундус», прымаюць удзел у сумесных праектах кшталту «Нямецкія інвестыцыі ў Беларусі» (з Універсітэтам прыкладных навук Мітвайда, ФРГ), «Беларусь–Галандыя: знешнеэканамічнае супрацоўніцтва і лагістыка» (з Інстытутам менеджменту FONTYS, Галандыя), а таксама ў праектах з многімі іншымі замежнымі ўніверсітэтамі Літвы, Польшчы, ФРГ, Італіі, Швейцарыі, Кітая, Украіны, Расіі.

Папулярным з'яўляецца сумесны праект з Універсітэтам прыкладных навук (Мітвайда, ФРГ) па падрыхтоўцы магістраў па спецыяльнасці Industrial Management на англійскай мове з выдачай пасля двух гадоў навучання (з якіх 3 семестры студэнты навучаюцца і праходзяць практыку ў Германіі і за нямецкую стыпендыю) двух дыпломаў: БДУ і Універсітэта Мітвайда.

На факультэце шмат лекцый чытаецца на англійскай мове. Напрыклад, вялікай папулярнасцю карыстаюцца лекцыі праф. Р. Менге з Дзюсельдорфскага ўніверсітэта па канкурэнцыі ў Еўропе.

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Кожны год праводзяцца міжнародныя конкурсы і алімпіяды, так, у 2018 г. запланаваны: IV Еўразійская алімпіяда па аналітычнай эканоміцы і прагназаванні, IT конкурс Biztech startup, IV алімпіяда па фінансавай пісьменнасці, конкурс стартап-праектаў школьнікаў. Дапамогу па арганізацыі апошняга мерапрыемства аказвае цэнтр развіцця моладзевага прадпрымальніцтва факультэта. Студэнты факультэта неаднаразова перамагалі ў міжнародных алімпіядах, такіх як «Бітва банкіраў СНД», «Карпаратыўныя фінансы ў МДУ». На факультэце пры кожнай выпускаючай кафедры існуюць навуковыя гурткі і студэнцкія навуковыя лабараторыі. Напрыклад, студэнцкая лабараторыя Guru кожны год арганізуе лекцыі для студэнтаў-ментараў у вядучых сучасных фірмах, у галіне інтэрнэт-маркетынгу, блокчэйну і г. д.

Студэнты кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі на замову Каралеўскай акадэміі фінансаў з Барселоны рыхтуюць на англійскай мове кнігу «Бізнес у Беларусі».

На замову шэрагу фірмаў, банкаў, прадпрыемстваў студэнты актыўна займаюцца навукова-практычнай працай у галіне бізнес-планавання, кансалтынгу, электроннага бізнесу, маркетынгу, лагістыкі. Мы маем уласныя карпункты часопісаў «Вестник Ассоциации белорусских банков», «Банкаўскі веснік», «Финансы, учет, аудит», «Новая эканоміка», у якіх студэнты друкуюць свае артыкулы.

## ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Дапаможа выпускнікам адаптавацца да практычнай работы вучэбная і вытворчая практыка па статыстыцы, фінансах, макра- і мікраэканоміцы, міжнародным менеджменце – як у дзяржаўных установах, так і на найлепшых айчынных і замежных прадпрыемствах, у фірмах і банках. Такое ўзаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі дазваляе яшчэ задоўга да заканчэння ўніверсітэта наладзіць кантакт і знайсці месца працы, якое найбольш адпавядае здольнасцям выпускніка. Добра падрыхтаванаму эканамісту няцяжка знайсці працу, але мы ставім больш складаную задачу: дапамагчы нашым выхаванцам знайсці цікавую і высокааплатную працу. У 2017 г. быў здвоены выпуск – і мы размеркавалі 56 студэнтаў. Вельмі добрае размеркаванне атрымалі студэнты спецыяльнасці «Эканамічная інфарматыка»: амаль усе пайшлі на працу ў фірмы Парку высокіх тэхналогій, такія як «ЭПАМ Сістэмз», а там вельмі вялікі заробак. Традыцыйна добры попыт на студэнтаў з кваліфікацыяй «Эканаміст-аналітык», якіх бяруць на працу ў аналітычныя ці стратэгічныя ўпраўленні вядомых, як правіла, замежных («Эрнст энд Янг»), фірмаў і банкаў, у якія традыцыйна ідуць працаваць таксама выпускнікі спецыяльнасці «Фінансы і крэдыт» (БелВЭБ, Беларусбанк, Альфа-банк, МТБанк).

Пасля атрымання дыплома можна працягваць навучанне па магістарскіх праграмах, па навуковых і прыкладных напрамках. Выпускнікі з дыпломам магістра навук могуць паступіць у аспірантуру, абараніць дысертацыю і папоўніць эліту нацыянальнай эканамічнай навукі.

## СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Дэвіз факультэта: «Традыцыі будучыні закладваюцца сёння». І сапраўды, за 18 гадоў яго існавання склаліся добрыя традыцыі: 1 верасня – Дзень ведаў з сустрэчамі і дыскусіямі з выкладчыкамі сваёй выпускаючай кафедры, 1 кастрычніка – КВЗ паміж групамі першага курса (у 2017 г. перамагла група «Эканамічная тэорыя»), 1 сакавіка на дзень нараджэння факультэта праходзіць конкурс «Міс» альбо «Містар факультэта» і студэнцкая навуковая канферэнцыя «Маладыя эканамісты БДУ – народнай гаспадарцы», 5 мая – дзень палітэканома і сустрэчы з выпускнікамі (пры факультэце працуе асацыяцыя выпускнікоў). Зараз мы рыхтуемся да 1 сакавіка 2019 г. – дваццацігоддзя факультэта.

**Эканамічны факультэт – элітарны факультэт для здольных і энергічных абітурыентаў.**

**Андрэй ГУСЕЎ, выпускнік 2006 г., генеральны дырэктар ААТ «Сек'юрыціз» (Расія, СПб).**



*– Адукацыя на эканамфаку мае больш высокі ўзровень, чым у іншых ВНУ Беларусі і Расіі. Гэта абумоўлена як якасцю матэматычнай падрыхтоўкі студэнтаў, так і значным упорам на самаадукацыю. Хоць эканоміка навука гуманітарная, яна памылкова лічыцца недакладнай шматлікімі ВНУ, якія складаюць план навучання студэнтаў. І гэты фактар з'яўляецца вызначальным як у кар'ернай перспектыве выпускнікоў, так і ў выніковым успрыманні якасці ВНУ кадравымі службамі прадпрыемстваў. На практыцы эфектыўнасць эканаміста залежыць ад яго здольнасці вызначаць дакладную меру ў кіраванні эканамічнымі аб'ектамі і працэсамі. Бо памылкі ў кіраванні эканамічнымі працэсамі, напрыклад, запазычанне па высокай стаўцы ў валюце, прыводзяць да таго, што дзяржава губляе сродкі. Менавіта здольнасці вызначаць меру вучаць такія дысцыпліны, як матэматычная статыстыка, эканаметрыка, матэматычныя метады ў эканоміцы, тэорыя гульняў, тэорыя верагоднасцяў і г. д.*

**Анастасія СМЕЛАЯ, выпускніца 2011 г., аналітык кампаніі фінансавага і інвестыцыйнага аналізу «Прametэя» (Італія).**



*– Эканамічны факультэт у асобе яго выкладчыкаў даў мне не толькі ўнікальную магчымасць атрымаць фундаментальныя веды ў галіне эканомікі і фінансаў, але таксама дапамог пашырыць мой далягляд у сумежных дысцыплінах, сфарміраваўшы тым самым унікальны лад аналітычнага мыслення, які ў далейшым дазволіў мне скончыць магістратуру Балонскага ўніверсітэта і пачаць кар'еру ў адной з найлепшых кампаній Італіі.*

**Юлія БАРАНАВА, выпускніца 2011 года, эканаміст, Банк Англіі (Лондан, Вялікабрытанія).**

*– Навучаючыся на эканамічным факультэце БДУ, я атрымала веды і навыкі, якія дазволілі мне паступіць і паспяхова скончыць адну з вядучых магістарскіх праграм па эканоміцы і фінансах у свеце і якія я штодня выкарыстоўваю ў сваёй прафесійнай дзейнасці. Эканамічны факультэт БДУ – гэта ўнікальнае спалучэнне таленавітых выкладчыкаў і студэнтаў, фундаментальных і прыкладных дысцыплін, што робіць яго ідэальнай адпраўной кропкай для маладых людзей у галіне эканомікі і фінансаў.*

# Факультэт сацыякультурных камунікацый

*Дэкан – кандыдат гістарычных навук дацэнт*
*Іван Іванавіч ЯНУШЭВІЧ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5. Тэл. 209-59-11.*
*E-mail: fsc@bsu.by*

**Факультэт сацыякультурных камунікацый (да 9 сакавіка 2015 г. – гуманітарны факультэт) БДУ быў створаны 11 сакавіка 2004 г. У наш час факультэт сацыякультурных камунікацый з'яўляецца самым маладым, але, бясспрэчна, адным з самых перспектыўных падраздзяленняў БДУ.** ФСК імкнецца сачыць за подыхам часу і прапануе сваім студэнтам атрымліваць наватарскія прафесіі, запатрабаваныя і ў сучаснасці, і ў будучыні.





## Самы малады – самы творчы!






### СТРУКТУРА

Сёння ў склад факультэта ўваходзяць **9 кафедраў**: дызайну, інфармацыйных тэхналогій, камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі, культуралогіі, менеджменту, нямецкай мовы, агульнай і клінічнай псіхалогіі, тэорыі і практыкі перакладу, экалогіі чалавека. Прафесарска-выкладчыцкі склад налічвае больш за 150 чалавек. Колькасць выкладчыкаў з навуковай ступенню ці навуковым званнем складае каля 50 %. Сярэдні ўзрост выкладчыкаў – 45 гадоў. Навучаецца на ФСК больш чым **1300** студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

**Дызайн** (напрамак – камунікатыўны). Тэрмін атрымання адукацыі – 5 гадоў. Кваліфікацыя спецыяліста: *дызайнер*. Кафедрай дызайну распрацавана арыгінальная методыка падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне дызайн-адукацыі. Закладам поспеху выпускнікоў у прафесійнай дзейнасці з'яўляецца ўменне аб'ядноўваць прынцыпы навуковай, тэхнічнай і мастацкай творчасці. Выкладчыкі ФСК праводзяць падрыхтоўчыя курсы на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі БДУ па дысцыпліне «Творчасць».

**Прыкладная інфарматыка** (напрамак – вэб-праграмаванне і камп'ютарны дызайн). Тэрмін атрымання адукацыі – 4 гады. Кваліфікацыя спецыяліста: *інфарматык. Спецыяліст па камп'ютарным дызайне і распрацоўцы вэб-прыкладанняў*. Спецыяльнасць займае ўстойлівую нішу ў галіне падрыхтоўкі спецыялістаў для IT-сферы. Выпускнікі напрамку – гэта спецыялісты па інфармацыйных сістэмах і інфармацыйных рэсурсах, сістэмныя аналітыкі, распрацоўшчыкі бізнес-прыкладанняў. Яны здольныя працаваць як у IT-кампаніях, так і ў арганізацыях, якія ўкараняюць і эксплуатуюць інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

**Культуралогія** (напрамак – прыкладная). Спецыялізацыі: менеджмент рэкламы і сувязяў з грамадскасцю; менеджмент міжнародных культурных сувязяў. Тэрмін атрымання адукацыі – 4 гады. Кваліфікацыя спецыяліста: *культуролаг-менеджар*. Задачы спецыялістаў па сувязях з грамадскасцю – наладжванне эфектыўных камунікацый паміж працадаўцам і грамадствам. Выпускнікі могуць працаваць спецыялістамі па сувязях з грамадскасцю (PR) у дзяржаўных органах і прыватных структурах, у турыстычным бізнесе, у рэкламных і PR-агенцтвах, спецыялістамі ў галіне міжнародных культурных сувязяў, арт-менеджменту.

**Менеджмент** (напрамак – сацыяльна-адміністрацыйны менеджмент, скарочаная форма навучання). Тэрмін атрымання адукацыі – 3 гады. Кваліфікацыя спецыяліста: *менеджар-эканаміст*. Спецыяльнасць «Менеджмент» уваходзіць у групу спецыяльнасцяў «Бізнес-кіраванне» і адлюстроўвае запатрабаванні сучаснай рынкавай эканомікі ў сацыяльных менеджарах. Студэнты вывучаюць агульны комплекс дысцыплін па эканоміцы і кіраванні і маюць шырокія магчымасці для працаўладкавання ў прыватных і дзяржаўных структурах.

**Сучасныя замежныя мовы**.

1. Сучасныя замежныя мовы (напрамак – выкладанне). Спецыялізацыя: камп'ютарная лінгвістыка. Тэрмін атрымання адукацыі – 5 гадоў. Кваліфікацыя спецыяліста: *лінгвіст. Выкладчык дзвюх замежных моў (з указаннем моў)*. Для Беларусі спецыяльнасць з'яўляецца ўнікальнай. Выпускнікі атрымліваюць веды па фармалізацыі любой прыроднай мовы, якія дазваляюць забяспечыць дыялог чалавека з камп'ютарам, а таксама зрабіць магчымым стварэнне сістэм штучнага інтэлекту. Выпускнікі працуюць у розных адукацыйных і навуковых установах, IT-кампаніях, вытворчай сферы.

2. Сучасныя замежныя мовы (напрамак – пераклад). Тэрмін атрымання адукацыі – 5 гадоў. Кваліфікацыя спецыяліста: *лінгвіст, перакладчык*. Навучанне па спецыяльнасці носіць практыка-арыентаваны характар. У абавязкі перакладчыка ўваходзіць: арганізацыя і правядзенне экскурсій па культурна-гістарычных месцах для замежных грамадзян, суправаджэнне іх падчас візітаў у краіну, пераклады на прэзентацыях, дзелавых сустрэчах, суправаджэнне рускамоўных груп пры паездках за мяжу, пераклад літаратуры. Выпускнікі кафедры працуюць у вядомых міжнародных кампаніях.

**Сацыяльная праца** (напрамак – сацыяльнае праектаванне). Тэрмін атрымання адукацыі – 4 гады. Кваліфікацыя спецыяліста: *спецыяліст па сацыяльнай працы і кіраванні праектамі*. Гэта першая і пакуль адзіная ў Рэспубліцы Беларусь універсітэцкая праграма падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы кіравання праектамі. Праект – гэта часовае прадпрыемства, прызначанае для стварэння ўнікальных прадуктаў, паслуг ці вынікаў. Праектная дзейнасць – будучыня сацыяльна-эканамічнай мадэлі свету.

### МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі, навукі і культуры ажыццяўляецца ў рамках міжнародных дамоў, якія складаюцца факультэтам сацыякультурных камунікацый з 7 замежнымі навуковымі і адукацыйнымі ўстановамі і арганізацыямі. У рамках падпісаных дамоў ажыццяўляецца абмен вопытам, праводзяцца стажыроўкі, арганізоўваюцца кансультацыі, а таксама ўзаемныя візіты і чытанне лекцый прадстаўнікоў установ. Факультэт вядзе падрыхтоўку студэнтаў з 12 замежных краін.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Больш за 37 % студэнтаў удзельнічаюць у навуковых даследаваннях. Функцыянуюць лабараторыі: лабараторыя праграмных і імітацыйных сродкаў навучання, крэатыўная лабараторыя дызайну, студэнцкі навукова-даследчы гурток «Лабірынт», студэнцкі навукова-даследчы гурток «Камп'ютарная лінгвістыка», студэнцкі клуб Litera, клуб прафесійнага самаразвіцця «Фенікс», студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя «Камп'ютарны дызайн», студэнцкі навукова-практычны гурток «Школа валанцёраў».

### ЖЫЦЦЁ ФАКУЛЬТЭТА

Маладыя таленты факультэта з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі розных канцэртных праграм. Многія сталі лаўрэатамі розных фэстаў і тэлепраектаў. З рэалізацыі праекта «Падзяліся цяплом душы сваёй» у 2005 г. пачаўся добраахвотніцкі рух. З 2009 года на факультэце актыўна развіваецца спартыўны напрамак. Студэнты ўдзельнічаюць практычна ва ўсіх міжнародных спартыўных турнірах.

Студэнты факультэта сацыякультурных камунікацый пражываюць у інтэрнаце № 10 па вул. Курчатава, д. 8. Колькасць заселеных у інтэрнат у 2017/2018 навучальным годзе склала 80 % ад ліку тых, хто меў патрэбу. Актыўна развіваецца сайт факультэта http://fsc.bsu.by/ і старонка ў сацыяльнай сетцы https://m.vk.com/fsc_bsu.

Традыцыйнымі мерапрыемствамі з'яўляюцца капуснік, Дзень нараджэння факультэта, Калядны баль, «Miss/Mister ФСК», «За здаровы лад жыцця «Пціч»» і шматлікія іншыя.

### ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Вольга ПАЎЛЮЦЬ, выпускніца спецыяльнасці «Менеджмент» (напрамак «Сацыяльна-адміністрацыйны менеджмент»), найлепшы выпускнік БДУ–2016, член банка дадзеных адоранай моладзі.**

*– Кожны дзень на ФСК быў для мяне яркай, эмацыйнай падзеяй. Спрыяла гэтаму як студэнцкае асяроддзе, так і калектыў супрацоўнікаў. Лічу, што навучанне ва ўніверсітэце – гэта рэалізацыя духоўнага патэнцыялу асобы, станаўленне творцы і носьбіта культурных традыцый, нараджэнне прафесіянала. І ФСК дапамог мне скласці ўсе гэтыя часткі ў гарманічную і апрабаваную сістэму жыццёвых правіл і звычак.*

**Кацярына СТЭФАНОЎСКАЯ, выпускніца 2017 г. спецыяльнасці «Сучасныя замежныя мовы (пераклад)».**



*Традыцыйна перад абітурыентамі, якія жадаюць стаць перакладчыкамі, стаіць выбар паміж нашым факультэтам і МДЛУ. Я ж першапачаткова ведала, што хачу вучыцца ў БДУ, і, паступіўшы сюды, ні разу не ўсумнілася ў сваім выбары. Больш за тое, пазнаўшы і адчуўшы непараўнальную атмасферу БДУ, на 4 курсе я вырашыла паралельна скончыць Інстытут журналістыкі. Цяпер я выкладаю на сваёй кафедры і ўжо сама вучу будучых перакладчыкаў, а таксама працую перакладчыкам і прэс-аташэ ў дзвюх спартыўных федэрацыях. Тым самым я магу з гонарам сказаць, што працую па спецыяльнасці, і ў гэтым заслуга дасведчаных выкладчыкаў альма-матар, якія на працягу ўсіх 5 гадоў укладвалі ў мяне тыя фундаментальныя тэарэтычныя і практычныя веды, на аснове якіх і выбудаваліся мае прафесійныя кампетэнцыі.*

# Ваенны факультэт

*Начальнік – палкоўнік Ігар Анатольевіч НОВІКАЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4.*
*Тэл. 209-56-02. Тэл./факс 209-56-25.*

**Факультэт пачынаўся з ваеннай кафедры БДУ, утворанай 4 лістапада 1926 г. За перыяд да 2003 г. ваенная кафедра падрыхтавала тысячы афіцэраў запасу па 13 ваенна-ўліковых спецыяльнасцях.**

У 2003 г. кафедра была рэарганізавана ў ваенны факультэт БДУ.

Падрыхтоўка студэнтаў вядзецца па **10** спецыяльнасцях па праграмах афіцэраў запасу, па **15** праграмах малодшых вайсковых спецыялістаў.

Падчас навучання курсанты і студэнты выконваюць практыкаванні стральбы са стралковай зброі, сродкаў узбраення БМП, а таксама практыкаванні па кіраванні баявой тэхнікай.

Асноўныя задачы факультэта:

падрыхтоўка кадравых афіцэраў для Узброеных Сіл і іншых ведамстваў Рэспублікі Беларусь; фарміраванне і развіццё пачуцця патрыятызму, адказнасці за выкананне службовага абавязку, адданасці народу і краіне, Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.







### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Факультэт забяспечвае падрыхтоўку па наступных спецыяльнасцях:

**«Хімія»**, напрамак: радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона (кваліфікацыя *«Спецыяліст па кіраванні. Хімік-эколаг»*);

**«Правазнаўства»**, спецыялізацыя: юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы (кваліфікацыя *«Юрыст»*);

**«Геаінфармацыйныя сістэмы»**, напрамак: спецыяльныя (кваліфікацыя *«Спецыяліст па геаінфармацыйных сістэмах»*);

**«Прыкладная крыптаграфія»** (кваліфікацыя *«Матэматык. Спецыяліст па абароне інфармацыі»*);

**«Міжнародныя адносіны»**, спецыялізацыя: міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы (кваліфікацыя *«Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моў зносін)»*).

На ўсіх спецыяльнасцях факультэта вывучаюцца агульнапрафесійныя дысцыпліны адпаведных грамадзянскіх спецыяльнасцяў, а таксама ваенная тапаграфія, ваенна-інжынерная падрыхтоўка, агульная тактыка, агнявая падрыхтоўка, асновы ваеннага заканадаўства, радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона, агульнавайсковыя статуты, страявая падрыхтоўка, кіраванне і сродкі сувязі.

Форма атрымання адукацыі на факультэце – дзённая.



**Пасля навучання маладых лейтэнантаў чакаюць камандзірскія пасады у вайсковых часцях Міністэрства абароны Беларусі**



### ПАСТУПЛЕННЕ

На ваенны факультэт маюць права паступаць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь:

- ва ўзросце ад 17 да 21 года, у тым ліку тыя, якія дасягнуць 17-гадовага ўзросту ці дасягнулі 21-гадовага ўзросту ў год паступлення на вучобу;
- якія прайшлі ці праходзяць тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, якія прайшлі ваенную службу па кантракце, – не старэйшыя за 23 гады;
- ваеннаслужачыя, што праходзяць ваенную службу па кантракце, – не старэйшыя за 25 гадоў;
- на ўсе спецыяльнасці навучання прымаюцца толькі асобы мужчынскага полу.

Абітурыенты ва ўзросце да 18 гадоў акрамя дакументаў, неабходных для паступлення на ваенны факультэт у БДУ, дадаткова ў абавязковым парадку прадстаўляюць пісьмовую згоду з умовамі кантракта бацькоў або законнага прадстаўніка.

Тэрмін навучання па спецыяльнасцях:

хімія, правазнаўства, геаінфармацыйныя сістэмы, міжнародныя адносіны – 4 гады;

прыкладная крыптаграфія – 5 гадоў.

### ПРАЖЫВАННЕ

Курсанты пражываюць у інтэрнаце. Два разы на год (узімку і ўлетку) курсантам даецца адпачынак працягласцю да 14 і 30 сутак адпаведна.

**Андрэй СІНЯЎСКІ, пераможца першынства Рэспублікі Беларусь па гіравым спорце сярод юніёраў, кандыдат у майстры спорту.**



*– Заняткі фізічнай культурай і спортам граюць немалаважную ролю ў захаванні і ўмацаванні здароўя чалавека, развіцці яго фізічных здольнасцяў.*

*На ваенным факультэце ўсім курсантам даецца магчымасць сістэматычна займацца спортам у адпаведнасці са сваімі жаданнямі і ўзроўнем фізічнай падрыхтоўкі. Кваліфікаваныя выкладчыкі факультэта і трэнерскі склад універсітэта заўсёды гатовыя падзяліцца сваім досведам і дапамагчы ў дасягненні вынікаў.*

*Камандаванне факультэта заўсёды ідзе насустрач, дазваляючы займацца спортам у вольны ад вучобы час, што спрыяе дасягненню поспехаў у навучанні. Бо ў канчатковым выніку фізічнаму выхаванню павінна надавацца гэтулькі ж увагі, колькі і разумоваму.*

**Пётр СТРЭЖ, намеснік камандзіра ўзвода 4 курса, старшыня студэнцкага савета інтэрната № 7 Студэнцкага гарадка БДУ ў 2015 г., кандыдат на званне «Студэнт года БДУ–2017».**



*За час навучання на ваенным факультэце БДУ я адкрыў для сябе мноства цікавых і захапляльных напрамкаў для грамадскай дзейнасці. На першым курсе ўніверсітэта я стаў сябрам БРСМ, а таксама быў абраны ў студэнцкі савет інтэрната № 7 Студэнцкага гарадка БДУ, які ўзначаліў менш чым праз год. Дзейнасць такога роду дала мне магчымасць паглядзець на жыццё студэнтаў з іншага боку: прасякнуцца іх праблемамі і даведацца інтарэсы людзей. Прычыны ўзнікнення праблем заўсёды ліквідавалі, інтарэсы студэнтаў падтрымліваліся і развіваліся. Найбольшы імпульс атрымалі творчы і спартыўны напрамкі. Мной была арганізавана і праведзена вялікая колькасць мерапрыемстваў і праектаў. Шматлікія з іх мелі на мэце сацыяльную, культурную і творчую інтэграцыю паміж рознымі факультэтамі нашага ўніверсітэта. Курсанты ваеннага факультэта змаглі прыняць удзел у розных мерапрыемствах, конкурсах, семінарах, дзе змаглі рэалізаваць сябе, знайсці добрых сяброў, атрымаць масу пазітыўных эмоцый. Велізарную дапамогу ў арганізацыі ўсіх мерапрыемстваў аказала камандаванне батальёна курсантаў і ваеннага факультэта.*

*На працягу чатырох гадоў я кожны дзень даведваўся штосьці новае і карыснае, развіваўся культурна і маральна, займаўся спортам і навукай. Самае выдатнае ў гэтым тое, што ў нашым універсітэце створаны абсалютна ўсе ўмовы для вучобы, самаразвіцця і, вядома, адпачынку. Падводзячы вынік сваёй вучобе ва ўніверсітэце і грамадскай дзейнасці, я абавязаны сказаць, што Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і ў прыватнасці ваенны факультэт – гэта вялікая дружная сям'я, дзе заўсёды дапамогуць, падтрымаюць, паспрыяюць у любых пытаннях з розных сфер жыцця. Дзякуй альма-матар за выхаванне маёй асобы!*

# Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ

*Дырэктар – доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Пётр Іванавіч БРЫГАДЗІН*
*Адрас: г. Мінск, вул. Шпалерная, 7. Тэл. 3060020. Факс 3060040. E-mail: mail@eedu.by; www.eedu.by, www.simst.bsu.by*



**ДІКСТ – адно з самых буйных структурных падраздзяленняў БДУ, якія вядуць падрыхтоўку і перападрыхтоўку спецыялістаў у сферы кіравання, сацыяльнай работы, дызайну, права.**

У складзе інстытута **8 кафедраў**, факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, навукова-даследчая лабараторыя сацыялагічных і маркетынгавых даследаванняў «Грамадская думка», цэнтр інфармацыйных тэхналогій, бібліятэка. Навучальны працэс у інстытуце забяспечваюць 138 выкладчыкаў, у іх ліку **5** прафесараў, **10** дактароў і **67** кандыдатаў навук.

У інстытуце выдадзена больш за 450 найменняў навучальнай, навучальна-метадычнай, навуковай і даведачнай літаратуры. Фонд бібліятэкі інстытута налічвае 31 095 экзэмпляраў выданняў.

### ІНФРАСТРУКТУРА

Інстытут размешчаны ў трох навучальных карпусах. Галоўны корпус – у гістарычным цэнтры горада Мінска па вул. Шпалерная, 7, навучальныя карпусы па вул. Батанічная, 15 і Маякоўскага, 96. Студэнтаў пераважна засяляюць у інтэрнат № 7 на вул. Кастрычніцкая, 10/2. Дадзены інтэрнат знаходзіцца побач з метро, дзякуючы чаму дарога да навучальных карпусоў зусім не складаная. Студэнты першага курса, якія атрымалі месцы, складаюць 85 % ад агульнай колькасці тых, хто мае патрэбу ў інтэрнаце. Студэнты 2–5 курсаў – 65 %.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

У ДІКСТ БДУ навучаюцца на І ступені вышэйшай адукацыі **1890 студэнтаў**, з іх 990 на дзённай форме навучання. 117 чалавек навучаюцца ў магістратуры і 127 на факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.

Падрыхтоўка студэнтаў І ступені вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца па чатырох спецыяльнасцях: «Менеджмент», «Маркетынг», «Сацыяльная работа» і «Дызайн». У сваю чаргу спецыяльнасці дзеляцца па напрамках.

**Менеджмент** падзяляецца на сацыяльна-адміністрацыйны, менеджмент нерухомасці, фінансавы менеджмент. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя *«Менеджар-эканаміст»*. Выпускнікі спецыяльнасці «менеджмент» працуюць на вядучых прадпрыемствах і ў арганізацыях краіны, такіх як ЗАТ «Белзамежбуд», ЗАТ «МТБанк», ААТ «АСБ Беларусбанк», ААТ «Белаграпрамбанк», ГК «Твая сталіца», ТАА «ЮНІВЕСТ-М» і інш.

**Маркетынг** складаецца з трох напрамкаў: маркетынг у электроннай камерцыі, міжнародны маркетынг і рэкламная дзейнасць. Па заканчэнні студэнт атрымлівае кваліфікацыю *«Маркетолаг-эканаміст»*. Выпускнікі спецыяльнасці «маркетынг» працуюць у такіх арганізацыях, як СП ЗАТ «Мілавіца», ТАА «Вектар поспеху», ТАА «Крафттранс» і інш. Выпускнікі займаюць пасады брэнд-менеджараў, менеджараў па абслугоўванні кліентаў, маркетолагаў у галіне рэкламы, маркетолагаў у галіне гандлю, маркетолагаў-аналітыкаў і інш.

**Сацыяльная работа** падзяляецца па напрамках: сацыяльна-псіхалагічная дзейнасць і сацыяльна-рэабілітацыйная дзейнасць. Студэнты атрымліваюць кваліфікацыі *«Спецыяліст па сацыяльнай рабоце-псіхолаг»* і *«Спецыяліст па сацыяльнай рабоце-рэабілітолаг»*. Месцы працаўладкавання выпускнікоў кафедры сацыяльнай працы і рэабіліталогіі – гэта дзяржаўныя ўстановы адукацыі і аховы здароўя, НДІ медыка-сацыяльнай экспертызы і рэабілітацыі, рэкрутынгавыя агенцтвы, дэльфінарый «Нема» і інш.

**Дызайн** складаецца з чатырох напрамкаў: дызайн інтэр'ераў, экспазіцыйны дызайн, арт-дызайн, дызайн моды і аксэсуараў. Студэнт атрымлівае кваліфікацыю *«Дызайнер»*. Студэнты праходзяць практыкі і стажыроўкі, з наступным працаўладкаваннем, у вядучых праектных інстытутах, майстэрнях вядомых дызайнераў і архітэктараў, салонах мэблі і дызайну, на прадпрыемствах. Выпускнікі працуюць у ПУП «Разумныя тэхналогіі», ТАА «Аксель груп», ТАА «Дзі Кінг» і інш.

## Выбіраючы ДІКСТ – вы выбіраеце будучыню!






### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Мы супрацоўнічаем са шматлікімі арганізацыямі, як з беларускімі, так і з замежнымі. У іх лік уваходзяць такія арганізацыі, як ЗАТ «МТБанк», ТДА «Твая Сталіцакансалт», ПП «СТАМ Софт», Вільнюская акадэмія мастацтваў (Літва), Стакгольмскі ўніверсітэт (Швецыя), Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны інстытут псіхалогіі і сацыяльнай работы (Расія) і інш. Таксама вядзецца супрацоўніцтва з УССА і ССНУ, а на кафедры мастацтваў Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ працуюць курсы па падрыхтоўцы абітурыентаў да ўступнага іспыту «Творчасць».

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

У вольны ад вучобы час студэнты інстытута актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі сацыяльна значных праектаў, працы клубаў па інтарэсах, падарожнічаюць, займаюцца спортам.

Штогод у моладзевых клубах горада праводзяцца культурна-масавыя мерапрыемствы. Кожны год праводзіцца конкурс на найлепшую акадэмічную групу. Арганізуюцца сустрэчы з цікавымі людзьмі, творчыя конкурсы, фэсты, працуе «Клуб выпускнікоў». Студэнцкае самакіраванне, моладзевыя арганізацыі і аб'яднанні прадстаўлены саветам старастаў, студэнцкім саветам па якасці адукацыі, БРСМ БДУ, студэнцкім саюзам БДУ, прафсаюзнай арганізацыяй студэнтаў. У жыцці кожнага выпускніка час, праведзены ў ДІКСТ БДУ, – гэта выдатны перыяд дасягненняў, поспехаў і перамог.

### ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Вікторыя САДОЎСКАЯ – інтэрнэт-маркетолаг ТАА «Фірма «Сеўзапметал» (РФ), магістрант НДУ ВШЭ, выпускніца ДІКСТ БДУ 2016 года.**



*– Кафедра маркетынгу і наогул ДІКСТ навучылі мяне думаць нестандартна, хутка прымаць рашэнні, лавіць асноўную сутнасць задач, навучылі арганізоўваць каманду і накіроўваць яе на правільны шлях. Я вельмі ўдзячная кожнаму выкладчыку, які ўзбагаціў мяне ведамі, і ганаруся тым, што была і застаюся часткай вялікай сям'і ДІКСТ!*

**Анжэла АЛФЁРАВА – малодшы навуковы супрацоўнік РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі. Выпускніца 2016 года.**



*– Веды і навыкі, атрыманыя падчас навучання, дазваляюць ставіць перад сабой складаныя прафесійныя задачы і эфектыўна іх вырашаць. Я магу з упэўненасцю сказаць, што навучанне на «сацыяльнай рабоце» ў ДІКСТ не толькі дае розныя магчымасці для прафесійна-асобаснага росту, але і матывуе да яго!*

# Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ

*Дырэктар – доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Уладзімір Уладзіміравіч АПАНАСОВІЧ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 5. Тэл./факс 3992393. Email: sbmt@bsu.by; www.sbmt.bsu.by*

**ІБМТ быў заснаваны ў 1996 г. для падрыхтоўкі спецыялістаў міжнароднага ўзроўню ў галіне бізнес-кіравання і кіравання новымі тэхналогіямі.** За гады паспяховага развіцця інстытут падрыхтаваў для беларускай эканомікі звыш 13000 спецыялістаў бізнес-кіравання. Сёння ў інстытуце навучаецца каля трох тысяч студэнтаў і слухачоў, з іх паўтары тысячы атрымліваюць вышэйшую адукацыю.

Структура інстытута ўключае **3 факультэты**, **5 кафедраў**, а таксама шэраг аддзелаў для забеспячэння навучальнай і арганізацыйнай працы. Адукацыйны працэс забяспечвае высокакваліфікаваны прафесарска-педагагічны склад, у тым ліку **5** дактароў і **28** кандыдатаў навук. Большасць выкладчыкаў прайшла спецыяльную падрыхтоўку ці стажыроўку за мяжой у рамках сумесных міжнародных адукацыйных праектаў.

## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

У 2004 г. інстытут упершыню ў Беларусі пачаў падрыхтоўку па спецыяльнасці **«Бізнес-адміністраванне»** (кваліфікацыя – *менеджар-эканаміст*). З 2009 г. адкрыта спецыяльнасць **«Лагістыка»** (кваліфікацыя – *лагістык-эканаміст*), а ў 2011 г. пачата падрыхтоўка па спецыяльнасці **«Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі»** (кваліфікацыя – *менеджар-эканаміст інфармацыйных сістэм*). Спецыяльнасці прапануюць атрыманне першай і другой вышэйшай адукацыі на вочнай (дзённай) і завочнай формах.

«Бізнес-адміністраванне», «Лагістыка», «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» сёння з'яўляюцца найбольш запатрабаванымі спецыяльнасцямі ў сферы эканомікі ва ўмовах пераходу да інавацыйнай эканомікі. Спецыяльнасці прадугледжваюць сфарміраванасць светапогляду і валоданне выпускніком кампетэнцыямі, якія грунтуюцца на глыбокім разуменні рынкавай эканомікі, функцый і эканамічнай ролі дзяржавы, усведамленні сацыяльнай адказнасці бізнесу. Падрыхтоўка ў ІБМТ разлічана на тых, хто планує прэтэндаваць на кіраўнічыя пасады ў бізнесе.

Вялікая ўвага ў інстытуце надаецца вывучэнню англійскай мовы, якая з'яўляецца не толькі праграмнай дысцыплінай, але і мовай выкладання асобных курсаў.

З 2014 г. інстытут пачаў падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» на англійскай мове. На спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» на англійскай мове сёння навучаюцца студэнты з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Азербайджана, Нігерыі, Індыі, Туркменістана, Сірыі, Сербіі, Мазамбіка, Лівіі, Лівана, Бангладэш, ЗША.

У студэнтаў спецыяльнасці «Лагістыка» ёсць магчымасць атрымаць двайны беларуска-фінскі дыплом спецыяліста па лагістыцы. Магчымасць атрымання дыплома прадстаўляе Універсітэт прыкладных навук паўночна-ўсходняй Фінляндыі, дзе студэнты могуць навучацца па праграму 2 семестраў.

## ЗАБЯСПЕЧАНАСЦЬ ІНТЭРНАТАМ

Іншагародні студэнты забяспечваюцца інтэрнатам БДУ на 65–85 %.

## МАГІСТАРСКІЯ ПРАГРАМЫ

З 1996 г. у ІБМТ рэалізуецца магістарская праграма па падрыхтоўцы магістраў бізнес-адміністравання (праграма MBA). Паводле ацэнкі міжнароднай экзаменацыйнай камісіі, узровень ведаў выпускнікоў праграмы MBA ІБМТ БДУ адпавядае стандартам якасці заходніх універсітэтаў. У 2012 г. інстытут адкрыў падрыхтоўку магістраў па спецыяльнасцях практыка-арыентаванай магістратуры «Кіраванне лагістычнымі сістэмамі» і «Інавацыйны менеджмент», у 2013 – «Тэхналогіі кіравання персаналам», у 2015 – «Фінансавы менеджмент». З 2016 г. адкрыта падрыхтоўка па спецыяльнасці «Кіраванне банкаўскім бізнесам».







**ІБМТ вядучая ўстанова ў нашай краіне ў галіне бізнес-адукацыі!**



## МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Адна з асноўных асаблівасцяў інстытута – паслядоўнае далучэнне да міжнароднай адукацыйнай прасторы. ІБМТ мае партнёрскія зносіны з многімі еўрапейскімі ўніверсітэтамі, актыўна ўдзельнічае ў разнастайных міжнародных праектах. Найлепшыя студэнты маюць магчымасць стажыравацца ў Стакгольмскай школе эканомікі ў Рызе (Латвія), Універсітэце менеджменту і эканомікі (Літва), праходзіць практыку ў буйных замежных кампаніях і інш.

## СІСТЭМА ІТ-РЭСУРСАЎ

ІБМТ займае лідарскія пазіцыі сярод установ вышэйшай адукацыі па выкарыстанні тэхналогій электроннага навучання. Сістэма ІТ-рэсурсаў інстытута ўключае:

- рэйтынгавую сістэму ацэнкі ведаў уласнай распрацоўкі інстытута;
- навучальны партал (сістэма электроннага навучання eLearning, электронная бібліятэка, аўтарскія курсы дысцыплін, сістэма зносін выкладчыкаў і студэнтаў – круглыя сталы і форумы);
- мабільнае прыкладанне «Расклад» уласнай распрацоўкі.

## ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Інстытут надае вялікую ўвагу працаўладкаванню і планаванню будучай кар'еры студэнтаў. Цэнтр развіцця кар'еры ІБМТ праводзіць цэлы комплекс мерапрыемстваў у гэтым кірунку: пошук месцаў вытворчай і пераддыпломнай практыкі, працаўладкавання, сустрэчы з прадстаўнікамі кампаній і паспяховымі выпускнікамі, трэнінгі па будаванні кар'еры. Выпускнікі ІБМТ працуюць менеджарамі, эканамістамі, маркетолагамі, фінансавымі і сістэмнымі аналітыкамі, менеджарамі па ўкараненні ІТ-тэхналогій і сістэм, бізнес-кансультантамі, менеджарамі праектаў, праекціроўшчыкамі ІТ-сістэм, лагістыкамі, спецыялістамі па кіраванні перавозкамі, спецыялістамі па закупках і інш. Многія з выпускнікоў і студэнтаў пачынаюць свой бізнес падчас вучобы, з'яўляюцца кіраўнікамі прадпрыемстваў.

## ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Уладзімір ДАЎГЯЛА, кіраўнік ЗАТ «ДГ-Цэнтр», гандлёвая марка Admiral Husso. Выпускнік 2013 г., спецыяльнасць «Бізнес-адміністраванне».**



– Я лічу, што Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ – найлепшая бізнес-школа нашай краіны. Шырокі спектр дысцыплін дазваляе атрымаць ключавыя веды для паспяховага старту фактычна ў любой галіне, а паглыбленае вывучэнне бізнес-курсаў на англійскай мове дазволіць вам прафесійна супрацоўнічаць з міжнароднымі кампаніямі. Аднак усе гэтыя веды могуць быць атрыманы толькі ўпартай уласнай працай.

**Алена ЯРМАК, лагістык кампаніі Kuhene+Nagel. Выпускніца 2014 г., спецыяльнасць «Лагістыка».**



*– Падчас вучобы ў ІБМТ я паспела папрацаваць у беларускай лагістычнай кампаніі і прайсці стажыроўку ў польскай (міжнародная лагістычная кампанія Kuhene +Nagel). Безумоўна, іх складана параўноўваць, таму што гэта розныя кампаніі па сваіх маштабах, абаротах і бачанні бізнесу. Але адна з рысаў, якую я не магу не адзначыць, гэта адказнае стаўленне супрацоўнікаў кампаніі Kuhene+Nagel да сваіх стажораў. Праца ўяўляла сабой знаёмства з прафесіяй і выкананне абавязкаў лагістыка. Мой кіраўнік не толькі даручала мне розныя заданні, але і давала магчымасць самастойна прымаць рашэнні. Гэта стала добрым штуршком да павышэння ўзроўню прафесійнага развіцця. Пасля сканчэння ўніверсітэта мне прапанавалі супрацоўнічаць з кампаніяй ужо ў якасці паўнапраўнага спецыяліста. Дзякуй ІБМТ БДУ за веды і магчымасці!*

**Паліна ДРАНІЦЫНА, інжынер па тэставанні аддзела мабільных распрацовак EPAM Systems Беларусь. Выпускніца 2016 года, спецыяльнасць «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі»**



*– Я хацела сказаць вялікае дзякуй усім нашым выкладчыкам, усёй нашай адміністрацыі за тое, што яны далі такую магчымасць, уклалі ўсю душу ў наша навучанне. Я знайшла не толькі самых лепшых сяброў і выдатных калег, але яшчэ і працу сваёй мары – гэта шмат у чым дзякуючы ІБМТ. Праца цікавая і, вядома, усе навыкі, якія я атрымала ў інстытуце, мне спатрэбіліся. У ІБМТ атрымліваеш практычныя навыкі, якія можна прымяніць, з якімі можна ісці і працаваць.*

# Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ

*Дырэктар – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Сяргей Аляксандравіч МАСКЕВІЧ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23/1, тэл. 398-99-79. Факс: 398-99-53. E-mail: info@iseu.by; www.iseu.bsu.by*

**Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ з'яўляецца базавай ВНУ экалагічнага профілю ў дзяржавах-удзельніцах СНД.** Падрыхтоўка спецыялістаў I ступені вышэйшай адукацыі вядзецца на двух факультэтах па **7 спецыяльнасцях**. Таксама на базе факультэтаў вядзецца падрыхтоўка аспірантаў і магістрантаў.
















## МДЭІ імя А. Д. Сахарава з'яўляецца вядучай установай Беларусі па падрыхтоўцы спецыялістаў экалагічнага профілю

### ФАКУЛЬТЭТ МАНІТОРЫНГУ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

**Дэкан – кандыдат біялагічных навук, дацэнт Уладзіслаў Уладзіміравіч ЖУРАЎКОЎ.**

Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23/1. Тэл. 299-51-35.

У склад факультэта ўваходзіць **6 кафедраў**. На факультэце працуюць **9** дактароў навук і **43** кандыдаты навук. Колькасць студэнтаў – **521**, магістрантаў – **51**.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў, сфера дзейнасці якіх звязана з рашэннем пытанняў аховы навакольнага асяроддзя, выкарыстаннем і распрацоўкай экалагічных інфармацыйных сістэм, правядзеннем экалагічнага маніторынгу, прагназаваннем змен навакольнага асяроддзя пад уздзеяннем антрапагенных і прыродных фактараў, экалагічным аўдытам прадпрыемстваў, тэхнічным забеспячэннем работы ўстаноў аховы здароўя. Выпускнікі факультэта працуюць ва ўстановах НАН Беларусі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у тым ліку ў РУП «Беларуская атамная электрастанцыя».

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па наступных спецыяльнасцях:

**«Прыродаахоўная дзейнасць»**, напрамкі спецыяльнасці «Экалагічны менеджмент і экспертыза» і «Экалагічны маніторынг». Кваліфікацыя – *«Эколаг. Інжынер па ахове навакольнага асяроддзя»*.

**«Энергаэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент»**. Кваліфікацыя – *«Інжынер-энергаменеджар»*.

**«Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі»**. Напрамак спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у экалогіі)», кваліфікацыя – «Інжынер-праграміст-эколаг».

Напрамак спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у ахове здароўя)», кваліфікацыя – *«Інжынер-праграміст»*.

**«Ядзерная і радыяцыйная бяспека»**, кваліфікацыя – *«Інжынер»*.

**«Медыцынская фізіка»**, кваліфікацыя – *«Медыцынскі фізік»*.

### ФАКУЛЬТЭТ ЭКАЛАГІЧНАЙ МЕДЫЦЫНЫ

**Дэкан – кандыдат сельскагаспадарчых навук дацэнт Ігар Эдуардавіч БУЧАНКОЎ.**

Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23/1. Тэл. 398-93-59

У склад факультэта ўваходзіць **5 кафедраў**. На факультэце працуюць **14** дактароў навук і **62** кандыдаты навук. Колькасць студэнтаў – **1190**, магістрантаў – **58**.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў, у асноўныя задачы якіх уваходзіць усебаковае вывучэнне і ацэнка ўплыву фактараў бія- і абіягеннага паходжання на стан розных сістэм арганізму. Спецыялісты атрымліваюць веды ў галіне біяхімічнай, малекулярна-генетычнай, імуналагічнай, цыталагічнай дыягностыкі розных захворванняў; ацэнкі эфектыўнасці правядзення лячэння сучаснымі клініка-лабараторнымі метадамі; распрацоўкі спосабаў карэкцыі розных паталагічных працэсаў, выкліканых тэхнагеннымі нагрузкамі; выяўлення малекулярных маркераў экалагічных уздзеянняў на біялагічныя сістэмы рознага ўзроўню арганізацыі.

Выпускнікі факультэта працуюць ва ўстановах НАН Беларусі, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, таксама ў Нацыянальным антыдопінгавым агенцтве Рэспублікі Беларусь, у прыватных дыягнастычных лабараторыях і ў іншых арганізацыях медыка-біялагічнага і экалагічнага профілю.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па наступных спецыяльнасцях:

**«Медыкабіялагічная справа»**, кваліфікацыя – *«Біёлаг-аналітык. Выкладчык біялогіі»*. Спецыялізацыі – «Цыталогія», «Біяхімія», «Імуналогія».

**«Медыцынская экалогія»**, кваліфікацыя – *«Эколаг-эксперт»*. Спецыялізацыі – «Эпідэміялогія», «Радыебіялогія», «Імуналогія».

### ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ

**Дэкан – кандыдат гістарычных навук дацэнт ПУЦІК Уладзімір Станіслававіч.**

Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23/1. Тэл. 398-98-61.

Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі праводзіць работу па арганізацыі падрыхтоўчых курсаў да цэнтралізаванага тэсціравання, па падрыхтоўцы замежных грамадзян па біялогіі, хіміі, англійскай мове, рускай мове, фізіцы і матэматыцы для паступлення ў ВНУ. Выкладанне дысцыплін вядзецца на рускай, а таксама на англійскай мовах.

### ВОДГУКІ ВЫПУСКНІКОЎ

**Павел ДУБРОЎСКІ, выпускнік 2017 г. спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у ахове здароўя)». Працуе інжынерам-праграмістам ТАА «Полімайстар».**



*– Падчас навучання ў МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ я ўвесь час бачыў прафесійна пастаўлены навучальны працэс. Выкладчыкі не толькі давалі актуальны матэрыял, але і стымулявалі самастойнае навучанне. Вучоба ў МДЭІ імя А.Д. Сахарава БДУ дазволіла атрымаць шырокія веды і практыку ў розных сферах: праграмаванне, ахова здароўя, радыяцыйная бяспека. Гэтыя веды сталі добрай дапамогай для старту кар'еры праграміста ў такой спецыфічнай галіне, як распрацоўка прыбораў радыяцыйнага кантролю і спецыялізаванага праграмнага забеспячэння.*

**Анастасія ЛАПКО, выпускніца 2008 г. факультэта экалагічнай медыцыны кафедры біяхіміі і біяфізікі. Навуковы супрацоўнік, аспірант лабараторыі прыкладной біяхіміі Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Беларусі.**



*– Вучоба на факультэце экалагічнай медыцыны дазволіла мне сумясціць разам усе мае інтарэсы: хімію, біялогію і медыцыну. Бо менавіта на стыку дысцыплін адбываюцца адкрыцці, так неабходныя чалавецтву ў барацьбе з разнастайнымі захворваннямі. Тыя веды, што я атрымала на лекцыях і практычных занятках на ўніверсітэце, знайшлі сваё прымяненне ў маёй рабоце па распрацоўцы гемасарбенту для выдалення антыцел з крыві чалавека, які ў будучыні павінен з'явіцца ва ўстановах аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і замежжа.*

Белорусский государственный университет
БГУ ФДО

# Факультэт даўніверсітэцкай адукацыі

*Дэкан факультэта – Вячаслаў Міхайлавіч МАЛАФЕЕЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Акадэмічная, 25, тэл. 2840002, 2842682.*
*E-mail: fpuedu@bsu.by; www.fpuedu.bsu.by*

**Роля і месца даўніверсітэцкай адукацыі на сучасным этапе вызначаецца ў першую чаргу задачамі глыбокага рэфармавання сярэдняй і вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.**

Факультэтам даўніверсітэцкай адукацыі вырашаюцца наступныя задачы:

– прафесійная арыентацыя моладзі,

– падрыхтоўка яе да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы,

– адаптацыя замежных грамадзян да ўмоў навучання ў Рэспубліцы Беларусь.

Эфектыўнае рашэнне гэтых задач забяспечваецца распрацоўкай адпаведнай канцэпцыі навучання і стварэннем неабходнай арганізацыйнай структуры факультэта.

Колькасць выкладчыкаў – **50**, у тым ліку **5** дацэнтаў. Для арганізацыі вучэбнага працэсу на падрыхтоўчых курсах прыцягваюцца звыш 50 вопытных выкладчыкаў з базавых кафедраў БДУ, ліцэяў і гімназій г. Мінска.

Факультэт мае **3** камп'ютарныя класы і бібліятэку з фондам літаратуры для абітурыентаў больш за 20 тысяч асобнікаў.

У структуру факультэта даўніверсітэцкай адукацыі ўваходзяць:

• падрыхтоўчае аддзяленне для беларускіх грамадзян,

• падрыхтоўчае аддзяленне для замежных грамадзян,

• вучэбны цэнтр падрыхтоўчых курсаў,

• вучэбны цэнтр дадатковай адукацыі.

**Падрыхтоўчае аддзяленне для беларускіх грамадзян** працуе ў БДУ з 1969 г.

Вучэбны працэс забяспечвае кафедра даўніверсітэцкай падрыхтоўкі. Асноўная мэта – падрыхтоўка слухачоў да цэнтралізаванага тэсціравання і паспяховай здачы ўступных экзаменаў на ўсе спецыяльнасці БДУ і на адпаведныя спецыяльнасці іншых устаноў вышэйшай адукацыі. На факультэце вядзецца падрыхтоўка па наступных профілях навучання: інжынерна-тэхнічны, фізічны, матэматычны, хімічны, геаграфічны, біялагічны, гістарычны, эканамічны, філасофскі, сацыялагічны, культуралагічны, а таксама правазнаўства, мовазнаўства, літаратуразнаўства, замежныя мовы, журналістыка, псіхалогія, сацыяльная абарона, міжнародныя адносіны, культура і мастацтва.

Тэрмін навучання на падрыхтоўчым аддзяленні складае 9 месяцаў з тыднёвай нагрузкай да 26 акадэмічных гадзін. Форма навучання – дзённая.

У адпаведнасці з правіламі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы вучэбныя планы ўключаюць дзве, тры або чатыры дысцыпліны: рускую або беларускую мову і два (тры) профільныя прадметы. Агульны аб'ём вучэбнага плана складае ад 408 да 816 акадэмічных гадзін.

Вучэбныя праграмы ўсіх дысцыплін складзены з улікам паглыблення, сістэматызацыі і абагульнення ведаў, атрыманых вучнямі ў сярэдняй школе. Навучальны год складаецца з двух семестраў, якія завяршаюцца экзаменацыйнымі сесіямі, заняткі праводзяцца ў форме практычных і семінарскіх заняткаў, шырока выкарыстоўваюцца розныя формы кантролю самастойнай работы. Такім чынам, слухачы атрымліваюць магчымасць адаптавацца да ўніверсітэцкай сістэмы адукацыі.

Пра эфектыўнасць працы падрыхтоўчага аддзялення сведчаць вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, паказаныя нашымі выпускнікамі 2016 і 2017 гг.: па кожным прадмеце вынікі палепшаны на 10–20 балаў. У 2017 годзе больш за 90 % выпускнікоў паступілі ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Прапанаваныя з першых дзён заняткаў слухачам інтэнсіўныя вучэбныя нагрузкі, маральна-псіхалагічная няўпэўненасць, выкліканая новым тыпам і характарам зносін, могуць быць паспяхова пераадолены, калі слухач зможа адаптавацца да новых умоў. З мэтай рашэння дадзенай задачы кафедра ўзаемадзейнічае з Псіхалагічнай службай БДУ: арганізуе сустрэчы і кансультацыі з псіхолагамі, праводзіцца трэнінг упэўненых паводзін, арганізуецца вывучэнне інтэлектуальнай лабільнасці і каштоўнасных арыентацый слухачоў.




## Выпускнікі ФДО паспяхова працуюць у 164 краінах свету

Значная ўвага на падрыхтоўчым аддзяленні надаецца вучэбна-выхаваўчай рабоце, у аснове якой знаходзіцца выхаванне патрыятызму, знаёмства слухачоў з традыцыямі ўніверсітэта, дапамога ім у арганізацыі свайго вольнага часу. Для яе правядзення ў групах назначаецца куратар, які дапамагае слухачам адаптавацца ў новай адукацыйнай прасторы, правільна арганізаваць самастойную работу, праводзіць выхаваўчую работу ў пазанавучальны час, падтрымлівае кантакты з бацькамі. Для слухачоў арганізуюцца сустрэчы з цікавымі людзьмі, наведванне тэатраў, музеяў, выстаў, праводзяцца экскурсіі па гісторыка-архітэктурных месцах Рэспублікі Беларусь і горада Мінска.

Слухачы аддзялення актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх універсітэцкіх і факультэцкіх культурна-масавых мерапрыемствах, напрыклад, «Фестываль факультэтаў БДУ», «Дзень ФДА», «Давайце пазнаёмімся», «Новы год па-беларуску», «Міс ФДА», «Містар ФДА», «Малыя алімпійскія гульні». Традыцыйнымі на аддзяленні сталі сустрэчы з першакурснікамі – выпускнікамі аддзялення. З мэтай прапаганды здаровага ладу жыцця на факультэце праводзіцца шмат акцый, што прадугледжвае ўдзел слухачоў у спартыўных мерапрыемствах.

Для паступлення на падрыхтоўчае аддзяленне патрэбны наступныя дакументы: заява на імя рэктара, дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), сертыфікаты ЦТ, 2 фотаздымкі 3х4, медыцынская даведка формы № 086У. Калі ў абітурыента няма сертыфіката ЦТ па профільным прадмеце, то праводзіцца ўступны экзамен у форме тэсціравання.

Навучанне на аддзяленні платнае. Іншагароднім даецца інтэрнат.

Тэл.: 2840009, 2840083, 2842682.

**Падрыхтоўчае аддзяленне для замежных грамадзян** пачынае сваю гісторыю з 1961 г. За гэты час навучанне прайшло звыш 9 тысяч слухачоў з больш чым 120 краін.

Вучэбны працэс на аддзяленні забяспечвае кафедра рускай мовы як замежнай і агульнаадукацыйных дысцыплін. Асноўная мэта – фарміраванне ў замежных слухачоў маўленчай здольнасці і кампетэнтнасці на рускай мове ў асноўных відах камунікатыўнай дзейнасці, што прадугледжвае падрыхтоўку замежных слухачоў да далейшага навучання ў вышэйшых навучальных установах.

На кафедры вядзецца навучанне па наступных профілях – гуманітарны, эканамічны, хіміка-біялагічны, правазнаўчы, інжынерна-тэхнічны.

Тэрмін навучання на падрыхтоўчым аддзяленні для замежных грамадзян складае 10 месяцаў з тыднёвай нагрузкай 36 акадэмічных гадзін. У структуру вучэбнага плана ў аб'ёме 1216 акадэмічных гадзін уваходзяць: руская мова (840 гадзін), два профільныя прадметы і факультатыў (376 гадзін).

Форма навучання – дзённая, навучанне платнае. Па выніках станоўча здадзеных экзаменаў за падрыхтоўчы курс замежныя грамадзяне атрымліваюць пасведчанне, якое дае ім права быць залічанымі для навучання па выбранай спецыяльнасці як у БДУ, так і ў іншыя ўстановы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Пры падрыхтоўчым аддзяленні працуюць таксама курсы рускай мовы, на якіх даецца магчымасць вывучаць рускую мову па розных праграмах з аб'ёмам ад 80 да 720 гадзін.

У ліпені–жніўні дзейнічае летняя школа рускай мовы з рознымі праграмамі навучання працягласцю ад 4 да 8 тыдняў.

Для паступлення замежным грамадзянам трэба падаць наступныя дакументы: заправу на навучанне, заяву на імя рэктара, пашпарт з візай, дакумент аб адукацыі, медыцынскую страхоўку і 6 фотаздымкаў.

Тэл.: 2840002, 2840001, 2841800.

**Падрыхтоўчыя курсы для абітурыентаў** розныя па формах (дзённыя, вячэрнія, завочныя (з аўдыторнымі заняткамі)) і тэрмінах навучання (ад 3 дзён да 8 месяцаў), дзейнічаюць на працягу ўсяго навучальнага года. Заняткі па ўсіх дысцыплінах праводзяцца як у групах камплектнасцю 10–12 слухачоў, так і ў групах малой камплектнасці (5–8 слухачоў), а таксама ў групах індывідуальнай падрыхтоўкі (1–2 слухачы). У залежнасці ад формы навучання і камплектнасці груп колькасць гадзін у тыдзень на прадмет адводзіцца 2, 3 або 4 акадэмічныя гадзіны.

Тэрміны прыёму дакументаў і заключэння дамоў аб навучанні адлюстраваны на сайце ФДА. Прыём дакументаў спыняецца пасля камплектавання груп.

Пералік вучэбных прадметаў, а таксама кошт навучання ўдакладняецца напярэдадні пачатку набору слухачоў.

Навучанне вядуць высокакваліфікаваныя выкладчыкі ФДА, а таксама іншых факультэтаў БДУ і ўстаноў адукацыі горада Мінска, якія маюць вялікі вопыт работы ў галіне даўніверсітэцкай адукацыі. Пра эфектыўнасць падрыхтоўчых курсаў гаворыць той факт, што каля 90 % абітурыентаў, якія закончылі курсы і ўдзельнічалі ў конкурсе, становяцца студэнтамі БДУ, а астатнія – студэнтамі іншых універсітэтаў і каледжаў.

Тэл.: 284-00-08, 284-00-18.

З мэтай эфектыўнай падрыхтоўкі абітурыентаў да цэнтралізаванага тэсціравання з 2004 г. сумесна з РІКВ праводзяцца 3 этапы рэпетыцыйнага тэсціравання з кастрычніка па красавік. Апрацоўка бланкаў адказаў і выдача вынікаў тэсціравання ажыццяўляецца па тэхналогіі цэнтралізаванага тэсціравання.

Тэл. для даведак: 284-00-18; 284-00-19.

**Юлія ГОРАВА, выпускніца 2017 года, студэнтка Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава БДУ**



*– Я вучылася на ФДА і ніводнага разу не пашкадавала пра гэта. Тут створана прыемная атмасфера для таго, каб добра падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання. Заняткі праводзяць кваліфікаваныя выкладчыкі. Яны зразумела і даступна тлумачаць усе тэмы. На факультэце да слухачоў ставяцца з разуменнем і падтрымкай, што вельмі важна.*

**Уладзімір АНІСІМАЎ, выпускнік 2017 года, студэнт МІПСА**



*– Я скончыў школу ў 2016 г. У канцы 11 класа зразумеў, што хачу вывучаць інжынерныя дысцыпліны. На жаль, ЦТ здаў вельмі дрэнна і не ведаў, што рабіць. У каледж ісці не хацелася, бо не стаў бы спецыялістам таго ўзроўню, пра які марыў. У канцы жніўня даведаўся пра ФДА і паступіў на факультэт, выбраўшы з прадметаў фізіку, матэматыку і рускую мову. Зараз, калі я скончыў ФДА і паступіў у ВНУ, магу дакладна сказаць, што ФДА не толькі даў мне патрэбныя веды для паступлення, але і «пазнаёміў» з маімі сённяшнімі сябрамі. ФДА дае ўсім другі шанц для ажыццяўлення вашай мары. Навучанне рэальна было цікавым. Хачу асабліва ад- значыць выкладчыка па фізіцы – Святлану Уладзіміраўну Дземідовіч. Яна развеяла міф пра сумнае завучванне фізікі, сумныя задачы, што складаюцца з нейкіх літар і лічбаў. Вучыцца стала цікава, і дзякуючы ёй я зразумеў, у якой сферы мне варта развівацца далей. Акрамя гэтага, навучанне на ФДА – гэта час зразумець, што канкрэтна вам патрэбна ў жыцці.*

**НГУЕН ТУНГ ШОН (В'етнам), былы студэнт ФДА, пераможца алімпіяды па рускай мове, зараз – студэнт факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ.**

*– ФДА – гэта важны, цікавы і незабыўны этап у маім жыцці. Дзякуючы навучанню на ФДА я не толькі навучыўся гаварыць па-руску, але і шмат даведаўся пра Беларусь, яе культуру, традыцыі і гісторыю, пазнаёміўся з цікавымі людзьмі. Веданне рускай мовы зараз мне вельмі дапамагае вучыцца ў БДУ.*

**БУРЫДЭ (Манголія), былы студэнт ФДА, зараз – аспірант Інстытута журналістыкі БДУ.**

*– Мне вельмі пашчасціла, што я сустрэў у Мінску выключных выкладчыкаў і сімпатычных аднагрупнікаў. Вельмі важным крокам да разумення рускай культуры стаў для мяне ўдзел у навуковай студэнцкай канферэнцыі. Мой даклад быў прысвечаны вельмі складанай, але цікавай тэме – сімвалам колеру ў мангольскай і рускай культурах. Праца над дакладам займала шмат часу, але «трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца», як кажа прымаўка. Прыемна было ўбачыць вынік сваёй працы.*

# Ліцэй БДУ

*Дырэктар – кандыдат гістарычных навук Макар Аляксандравіч ШНІП*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8. Тэл. 2095265.*
*E-mail: lyceum@bsu.by; www.lyceum.bsu.by*

**Ліцэй БДУ заснаваны ў 1989 годзе з мэтай навучання і выхавання таленавітай і адоранай моладзі.**

Для забеспячэння адукацыйнага працэсу ў ліцэі працуе **10 кафедраў** – метадычных аб'яднанняў. Сярод выкладчыкаў ліцэя 35 кандыдатаў навук, 10 настаўнікаў-метадыстаў, 60 настаўнікаў вышэйшай катэгорыі. Больш за 30 супрацоўнікаў ліцэя – гэта яго выпускнікі.

### ПРОФІЛІ НАВУЧАННЯ

Ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – гэта **сем профіляў навучання**: філалагічны (беларускі, рускі і англійскі), гісторыка-грамадазнаўчы, біялагічны, хімічны, матэматычны, фізічны і адзіны ў краіне інфарматыка-матэматычны.

На дзвюх паралелях (10-ы і 11-ы класы) Ліцэя БДУ навучаецца больш за **500 ліцэістаў**.

### ПАСТУПЛЕННЕ

Каб паступіць у Ліцэй БДУ трэба мець высокі ўзровень падрыхтоўкі, бо сярэдні конкурс складае каля 7 чалавек на месца, а на некаторыя профілі – да 10. Штогод у Ліцэй БДУ спрабуе паступіць амаль 2000 абітурыентаў. Падаць дакументы можна праз асабісты кабінет абітурыента, які рэалізаваны на афіцыйным сайце Ліцэя БДУ (www.lyceum.by) і пачне працаваць ад 26 сакавіка 2018 г. Дзеля таго, каб стаць абітурыентам, дастаткова запоўніць невялікую анкету анлайн, а таксама сфатаграфаваць і запампаваць у асабісты кабінет даведку са школы. Пераможцам заключнага этапу рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, якія паступаюць у Ліцэй БДУ без экзаменаў, трэба далучыць копію атрымanага на алімпіядзе дыплома. Увесь працэс рэгістрацыі цалкам адбываецца ў інтэрнэце. Даты ўступных іспытаў, вынікі, прахадныя балы і іншую актуальную для паступлення інфармацыю таксама можна даведацца праз асабісты кабінет. Сэрвіс асабістага кабінета дазваляе абітурыенту цалкам кантраляваць працэс паступлення ў Ліцэй БДУ ад падачы дакументаў да залічэння.

Для паступлення ў Ліцэй БДУ выпускнікам 9 класаў неабходна прайсці два іспыты па прадметах, якія адпавядаюць абранаму профілю. Па кожным прадмеце можна набраць максімум 100 балаў (у суме 200 балаў). Прахадныя балы знаходзяцца ў інтэрвале паміж 100 і 150 баламі ў залежнасці ад абранага профілю. Уступныя іспыты ў Ліцэй БДУ ў 2018 годзе адбудуцца 13 і 20 мая.

### РЭПЕТЫЦЫЙНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ

Сёння ў абітурыентаў ёсць нямала магчымасцяў падрыхтавацца: з дапамогай дапаможнікаў для паступлення ў ліцэй, на падрыхтоўчых курсах «Вечаровы Ліцэй» (кожны год тут вучыцца больш за 700 абітурыентаў), на серверы дыстанцыйнага навучання ліцэя (e-lyceum.by), дзе існуе цэлы раздзел, разлічаны на абітурыентаў. Рэпетыцыйны іспыт (РІ) для тых, хто паступае ў ліцэй – яшчэ адна магчымасць для падрыхтоўкі.

Рэпетыцыйнае тэсціраванне вельмі папулярнае сярод абітурыентаў ВНУ. На ім можна і свае веды праверыць, і паглядзець, як уладкаваны экзаменацыйны матэрыял, колькі часу на яго адводзіцца і ці зможаце вы ў яго ўкласціся. Абітурыентам важна ведаць, што іх чакае на ўступных іспытах. Такая ж магчымасць існуе і ў абітурыентаў Ліцэя БДУ. Рэпетыцыйны іспыт зможа прайсці любы школьнік Беларусі на серверы дыстанцыйнага навучання (e-lyceum.by).

РІ ў Ліцэі БДУ будзе ісці ў тры этапы: 1 этап – лістапад – снежань; 2 этап – студзень – люты; 3 этап – сакавік – красавік.

На кожным этапе рэпетыцыйных іспытаў будуць толькі тыя заданні, якія 9-класнікі ўжо вывучылі на дадзены момант. Адпаведна, на трэцім этапе тэст будзе адпавядаць спецыфікацыі (праграме, па якой складаецца экзамен). Рэпетыцыйныя іспыты адбываюцца анлайн, і таму вынікі вядомыя адразу пасля заканчэння тэста. А разам з вынікам можна ўбачыць і свае памылкі, і тлумачэнне, як трэба было выканаць заданне правільна. Напрыклад, па фізіцы да кожнай задачы будзе дададзена відэа з яе рашэннем і тлумачэннямі выкладчыка. У выпадку, калі абітурыент атрымае больш чым 50 балаў (па кожным прадмеце) – самастойна, не падглядваючы ў падручнікі або інтэрнэт, не раячыся з сябрамі, бацькамі ці настаўнікамі, то і на саміх уступных іспытах у яго будуць сур'ёзныя шансы для паступлення ў Ліцэй БДУ. Акрамя таго, заўсёды ёсць магчымасць запісацца на курсы для абітурыентаў на серверы дыстанцыйнага навучання, калі вынік апынецца ніжэйшы за жаданы.

**Як прыняць удзел?**

1. У інтэрнэт-краме Ліцэя БДУ (shop.lyceum.by) у раздзеле «электронныя рэсурсы» выбраць рэпетыцыйныя іспыты.

2. Вызначыцца, на які профіль збіраецеся паступаць. Ад гэтага залежыць, якія прадметы варта здаваць падчас уступных іспытаў у Ліцэй БДУ. Да прыкладу, на інфарматыка-матэматычны профіль неабходна здаваць інфарматыку і матэматыку. Пры гэтым колькасць прадметаў па якіх можна праходзіць рэпетыцыйныя іспыты, неабмежаваная, можна выбраць рэпетыцыйныя іспыты болей чым па двух прадметах, дзеля таго каб праверыць, ці ёсць шансы паступіць на іншыя профілі.

3. Дадаць выбраныя прадметы ў кошык і аплаціць іх праз АРІП. Кошт усіх трох этапаў рэпетыцыйных іспытаў па адным прадмеце – 9 рублёў.

### АЛІМПІЯДНЫ РУХ

Ліцэй БДУ прымае актыўны ўдзел у рэспубліканскім і міжнародным алімпіядным руху. За 27 гадоў ліцэісты заваявалі 1569 дыпломаў рэспубліканскай алімпіяды, з іх 199 – за апошнія 3 гады. На міжнародных алімпіядах школьнікаў, якія праходзілі ў 62 краінах свету, ліцэісты заваявалі 203 медалі, з іх 26 – за апошнія 3 гады. Больш за 1400 разоў навучэнцы і настаўнікі ліцэя адзначаны спецыяльным фондам Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Традыцыйным з'яўляецца і ўдзел ліцэістаў у камандных спаборніцтвах – турнірах юных фізікаў і матэматыкаў як рэспубліканскага, так і міжнароднага ўзроўню. З 1992 г. юныя фізікі заваявалі 1 залаты, 5 бронзавых і 9 сярэбраных медалёў міжнародных турніраў. Юныя матэматыкі з 2009 г. атрымалі 4 залатыя, 2 сярэбраныя і 3 бронзавыя камандныя медалі.

Штогод вучні ліцэя ўдзельнічаюць у вялікай колькасці інтэлектуальных спаборніцтваў. Сярод іх Міжнародная Мендзялееўская алімпіяда; Міжнародная Жаўтыкаўская алімпіяда па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы; Еўрапейская матэматычная алімпіяда сярод дзяўчат; Алімпіяда Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі па рускай мове; Рэспубліканскі конкурс даследчых работ вучняў і г.д.

У Ліцэі БДУ важнае месца займае праца па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання. Штогод выпускнікі Ліцэя БДУ маюць самы высокі сярэдні бал па ЦТ у параўнанні з выпускнікамі іншых устаноў адукацыі. Гэта вынік супольнай працы ліцэістаў і высокапрафесійнага настаўніцкага калектыву. Не ў апошнюю чаргу гэта звязана з тым, што ў Ліцэі БДУ праводзяцца дадатковыя заняткі для 11-х класаў па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання. Для таго, каб іх наведваць, не абавязкова вучыцца ў ліцэі, дастаткова запісацца на падрыхтоўчыя курсы, у тым ліку і анлайн. З 2006 года ў Ліцэі БДУ працуе сервер дыстанцыйнага навучання (e-lyceum.by), на якім размешчаны курсы для абітурыентаў і выпускнікоў Ліцэя БДУ.

### ЛІЦЭЙСКАЕ ЖЫЦЦЁ

Чацвёртую частку вучняў Ліцэя складаюць іншагародні ліцэісты, якім даецца месца ў інтэрнаце №2 Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Добразычлівая атмасфера супрацоўніцтва паміж настаўнікамі і вучнямі становіцца ўрадлівай глебай не толькі для высокіх дасягненняў у вучобе, навуцы, але і для творчасці. Дзякуючы такому творчаму саюзу ў Ліцэі склалася шмат цікавых і разнастайных традыцый.

Сярод самых значных трэба вылучыць пасвячэнне ў ліцэісты «Салют, карапузы!», спартыўна-аздараўленчае мерапрыемства «Турсцяжынка», яркія і запамінальныя прэзентацыі класаў – «Візітоўкі», «Улазіны» – наваселле ў інтэрнаце са шчодрым частаваннем дранікамі. Адной з самых яркіх і значных падзей года з'яўляецца, без сумневу, Дзень нараджэння Ліцэя. За тры дні святкавання праводзіцца вялікая колькасць разнастайных мерапрыемстваў, якія не пакідаюць убаку ніводнага члена ліцэйскай супольнасці. Гэта і навукова-практычная канферэнцыя «Першы крок у навуку», і святочны канцэрт, і вечар сустрэчы выпускнікоў, і спартыўнае свята. Апошні званок – гэта смачнае марозіва з салодкім водарам дзяцінства і традыцыйны футбольны матч з выкладчыкамі.

Шырокі рэзананс сярод настаўнікаў і вучняў выклікаюць мерапрыемствы, заснаваныя на традыцыях народнага беларускага календара. У Ліцэі штогод святкуюцца Каляды, Дзяды, Масленка. Асаблівай увагі заслугоўвае музычна-паэтычны фестываль «Струнка беларуская», дзе дзеці і настаўнікі далучаюцца да вытокаў нацыянальнай культуры і мастацтва, а таксама дабрачынныя акцыі «Свята маёй душы», «Вусы, лапы, хвост».

Стала добрай традыцыяй праводзіць у Ліцэі БДУ спартыўныя спаборніцтвы паміж выкладчыкамі і ліцэістамі. Не толькі ўдзельнікі мерапрыемства, але і гледачы атрымліваюць вялікі зарад энергіі і бадзёрасці, якога павінна хапіць на ўвесь навучальны год.

Шмат гадоў у Ліцэі існуюць каманды па «Што? Дзе? Калі?» і «Дэбатах», якія неаднойчы станавіліся пераможцамі рэспубліканскіх і міжнародных турніраў.



**Ліцэй – гэта:**
- **Непаўторная атмасфера**
- **Якасная адукацыя**
- **Вопытныя і творчыя педагогі**
- **Таленавітыя і здольныя вучні**



**Аляксей БАШАН, выпускнік Ліцэя 1992 г. Намеснік начальніка Акадэміі ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, палкоўнік, кандыдат юрыдычных навук.**



*– Ліцэй – добрая стартавая пляцоўка. Тут вы звыкаецеся быць адказнымі, звыкаецеся працаваць. У выніку трэба па-новаму глядзець на свет, з'яўляецца жаданне адпавядаць высокім стандартам. Адчуваеш гонар за тое, што вучыўся тут. У Ліцэі не было нічога неадольнага, калі табе цікава, то і працэс навучання ідзе намнога лягчэй. Але самае галоўнае ў ліцэі – гэта людзі, з якімі цябе яднае моцная шматгадовая сувязь. Ліцэйская атмасфера дапамагае знаходзіць у сабе патэнцыял заўсёды рухацца наперад і ніколі не прыпыняцца.*

**Андрэй ІВАНЕЦ, выпускнік Ліцэя 2001 г. Намеснік дырэктара Інстытута неарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук, старшыня савета маладых навукоўцаў, доктар хімічных навук.**



*– У Ліцэі мяне ад самага пачатку вельмі ўразілі адносіны настаўнікаў да сваіх вучняў, вельмі паважлівыя і ўважлівыя. Да нас ставіліся, як да калег і заўсёды звярталіся на «вы». Ад самага пачатку я вельмі актыўна заняўся падрыхтоўкай да алімпіяды і пабачыў, што тут створана такая атмасфера і магчымасці, што кожны вучань, незалежна ад яго стартавага ўзроўню ведаў, пры неабходным старанні можа дасягнуць высокіх вяршыняў. Настаўнікі вельмі ў гэтым дапамагалі, але ў той жа час заўсёды стымулявалі нашую самастойную працу, творчую актыўнасць і даследчыцкую дзейнасць.*

**Самі ліцэісты гавораць, што «ліцэй – гэта другі дом», «сям'я», «ліцэй – гэта назаўсёды». Не будзем спрачацца з гэтым. Проста прыходзьце да нас, і ўбачыце ўсё на ўласныя вочы!**

# Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ

***Рэктар – Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, кандыдат багаслоўя***
***Адрас: г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 24. Тэл. 3276367, 289-11-61. Тэл./факс 2891161.***
***E-mail: theology.bsu@tut.by; www. theology.bsu.by***

**У структуры інстытута тры кафедры: багаслоўя, біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння, рэлігіязнаўства.** Дзейнічае вучэбная літургічная лабараторыя. Больш за 65 % выкладчыкаў інстытута маюць навуковыя ступені і званні.



### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ ажыццяўляе падрыхтоўку па спецыяльнасці **«Тэалогія»** з прысваеннем кваліфікацыі *«Тэолаг-рэлігіявед. Выкладчык грамадазнаўчых дысцыплін»*. Нашы выпускнікі маюць магчымасць альбо працягваць навучанне ў магістратуры і аспірантуры, альбо працаваць выкладчыкамі курса «Рэлігіязнаўства» і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Высокі ўзровень падрыхтоўкі дазваляе ім таксама паспяхова працаваць у сферы навукі, культуры, царкоўнага і сацыяльнага служэння.

### ДЫСЦЫПЛІНЫ

Студэнты вывучаюць 6 замежных моў: чатыры старажытныя (старажытнаяўрэйскую, старажытнагрэчаскую, лацінскую, царкоўнаславянскую) і дзве сучасныя (англійскую і нямецкую).

У цыкле спецыяльных дысцыплін вывучаюцца Свяшчэннае Пісанне Старога і Новага Запаветаў, біблейская археалогія, багаслоўе (асноўнае, параўнальнае, дагматычнае, маральнае), літургіка, патралогія, агульная гісторыя хрысціянскай царквы, кананічнае права, гістарычнае рэлігіязнаўства, сектазнаўства, сістэматычнае рэлігіязнаўства, рэлігійная філасофія, візанталогія, псіхалогія рэлігіі, сацыялогія рэлігіі.

### БІБЛІЯТЭЧНЫ ФОНД

У бібліятэцы інстытута назапашаны ўнікальны фонд навуковай літаратуры па багаслоўскіх, царкоўнагістарычных, рэлігіязнаўчых і рэлігійнафіласофскіх дысцыплінах. Бібліятэчны фонд і фонд электронных рэсурсаў уключае больш за 21 тысяч назваў (27 тысяч адзінак захавання).

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Інстытут тэалогіі ўзаемадзейнічае з прыходамі Беларускай праваслаўнай царквы з аднаго боку і ўстановамі адукацыі – з іншага. Штогод на базе інстытута праводзяцца міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні і міжнародная студэнцкая навуковая канферэнцыя «Хрысціянскія каштоўнасці ў культуры сучаснай моладзі», у якіх бяруць удзел школьнікі і студэнты не толькі Беларусі, але і краін блізкага замежжа. Навучэнцы старэйшых класаў могуць прыняць удзел і ў конкурсе даследчых і творчых прац, тэматыка якіх прымеркавана да юбілейных дат і памятных падзей у гісторыі роднай краіны.

Сістэматычна ў інстытуце праводзяцца сустрэчы студэнтаў з дактарамі багаслоўя, кандыдатамі філасофскіх навук, прадстаўнікамі сферы мастацтва. Таксама на базе інстытута створана дыскусійная пляцоўка «Рэлігіязнаўчы кінаклуб «Рэлігія і кіно», арганізавана дзейнасць студэнцкай навуковай даследчай лабараторыі «Нетрадыцыйная рэлігійнасць у Беларусі».

А ў мастацкай галерэі інстытута можна пазнаёміцца з творамі таленавітых мастакоў і іканапісцаў. Ёсць і Музей Бібліі, у якім захоўваюцца выданні і пераклады Бібліі на розныя мовы свету. Дасведчаныя экскурсаводы распавядуць пра кожны экспанат, прадэманструюць чытанне на царкоўнаславянскай, лацінскай і іншых мовах.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Студэнты яшчэ падчас свайго навучання спрабуюць сябе ў якасці выкладчыкаў у нядзельных школах праваслаўных прыходаў г. Мінска, праходзяць педагагічную практыку ва ўстановах адукацыі сталіцы. Кожны можа ўдзельнічаць і ў грамадскай дзейнасці інстытута, якая прадстаўлена сукупнасцю разнастайных маладзевых праектаў, такіх як студэнцкі лялечны тэатр «Батлейка»; хор Інстытута тэалогіі БДУ; добраахвотніцкае аб'яднанне «Элеас»; асветнікі вызны лекторый. Адукацыйныя экскурсіі па святых і гістарычных месцах; паломніцкія паездкі; студэнцкія лагеры і іншыя мерапрыемствы, якія спрыяюць развіццю далягляду студэнта, фарміруюць яго маральную і грамадзянскую пазіцыю, з'яўляюцца пастаяннай і неад'емнай часткай жыцця кожнага, хто паступіць парог Інстытута тэалогіі.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі Інстытута тэалогіі працаўладкоўваюцца ў навучальныя ўстановы, рэлігійныя аб'яднанні, грамадскія арганізацыі, турыстычныя фірмы (рэлігійны турызм), СМІ, выдавецтвы, навукова-даследчыя цэнтры, бібліятэчныя цэнтры.

Гэта, без сумнення, унікальная навучальная ўстанова валодае ўсімі якасцямі для таго, каб стаць alma mater для выдатных спецыялістаў, якія сумяшчаюць прафесіяналізм і актыўную жыццёвую пазіцыю.

# Юрыдычны каледж БДУ

***Дырэктар – кандыдат юрыдычных навук Алег Міхайлавіч СТАРАВОЙТАЎ***
***Адрас: г. Мінск, вул. Камсамольская, 21. Тэл./факс 2891282.***
***E-mail: college@bsu.by; www.lawcollege.bsu.by***



### РАЗВІЦЦЁ

Юрыдычны каледж БДУ пачаў сваю дзейнасць з 1 верасня 2000 г. у якасці першай у краіне профільнай установы, якая забяспечвае атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці **«Праваназнаўства»**. Дзякуючы якаснаму выкладчыцкаму складу (адукацыйны працэс забяспечваюць 8 кандыдатаў і 20 магістраў навук) за 17 гадоў дзейнасці каледж стаў адной з найбольш прэстыжных устаноў краіны. Высокі ўзровень падрыхтоўкі ў Юрыдычным каледжы пацвярджаецца і поспехамі нашых былых навучэнцаў у прафесіі (ёсць сярод іх суддзі, намеснікі пракурораў, кіраўнікі арганізацыйна-кадравых службаў і інш.), і поспехамі ў вучобе (больш за 90 % нашых былых навучэнцаў працягваюць адукацыю ў беларускіх ВНУ), і поспехамі ў навукова-даследчай дзейнасці (два былыя навучэнцы абаранілі кандыдацкія дысертацыі, трыццаць два – з'яўляюцца лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адоранай моладзі.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ І СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па наступных спецыялізацыях: «Дзяржаўна-прававая дзейнасць», «Судова-прававая дзейнасць», «Гаспадарча-прававая і кадравая работа». Выпускнікам даецца кваліфікацыя *«Юрыст»*.

### АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС

Навучанне ў каледжы ажыццяўляецца па вучэбных планах і праграмах, якія даюць паглыбленую гуманітарную і спецыяльную падрыхтоўку, а таксама адпаведныя практычныя навыкі.

Адукацыйны працэс забяспечваюць сем цыклавых камісій: агульнаправавых дысцыплін, дзяржаўна-прававых дысцыплін, грамадзянска-прававых дысцыплін, працэсуальных дысцыплін, сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, прыродазнаўчых дысцыплін, матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій. Дзейнічаюць два аддзяленні: на аснове агульнай базавай адукацыі (дзённая форма навучання) і агульнай сярэдняй адукацыі (дзённая і завочная формы навучання).

У каледжы функцыянуюць тры камп'ютарныя класы, а таксама лабараторыя заканадаўства, бібліятэка і чытальная зала з вялікім выбарам найноўшай юрыдычнай літаратуры. Каледж падключаны да агульнаўніверсітэцкай інфармацыйнай сеткі, мае свабодны выхад у інтэрнэт.

Выпускнікі каледжа маюць права працягваць навучанне па спецыяльнасці на юрыдычным факультэце БДУ і іншых ВНУ са скарочаным тэрмінам навучання.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі Юрыдычнага каледжа запатрабаваныя ў:
– органах судовай улады (канцылярыя, статыстыка, архіў, забеспячэнне судовай вытворчасці);
– органах прымусовага выканання судовых пастаноў і іншых выканаўчых дакументаў;
– органах унутраных спраў (канцылярыя, служба аховы грамадскага парадку, крымінальная міліцыя, дзяжурная частка);
– юрыдычных (прававых), кадравых, рэферэнцкіх службах суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці, некамерцыйных юрыдычных асоб (грамадскія арганізацыі, прафесійныя саюзы і г. д.);
– органах пракуратуры (канцылярыя, статыстыка, архіў і г. д.);
– адвакатуры, натарыяце;
– органах сацыяльнай абароны.

Асноўныя арганізацыі–заказчыкі кадраў, якія штогод забяспечваюць працаўладкаванне выпускнікоў – Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Мінскі гарадскі суд, упраўленні ўнутраных спраў Мінгарвыканкама і Мінаблвыканкама, Эканамічны суд г. Мінска.

Наш каледж – навучальная ўстанова для здольных і энергічных юнакоў і дзяўчат. Ён рыхтуе кваліфікаваных юрыстаў, якія спалучаюць глыбокія тэарэтычныя веды з уменнем іх практычнага ўвасаблення. Гэта дазваляе ім знайсці перспектыўную, цікавую, высокааплатную працу, якая будзе для іх справай усяго жыцця.

### ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПРЫЁМЕ

Ў 2018 г.

(Спецыяльнасць **«Праваназнаўства»** на бюджэтнай і платнай аснове)

На аснове агульнай базавай адукацыі (9 кл.): тэрмін навучання – 2 гады 10 месяцаў (дзённая форма). Залічэнне ажыццяўляецца па конкурсе сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыі.

На аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 кл.): тэрмін навучання – 1 год 10 месяцаў (дзённая форма). Залічэнне ажыццяўляецца па суме балаў сертыфікатаў ЦТ (беларуская (руская) мова, грамадазнаўства) і сярэдняга бала дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі.

Завочная форма: тэрмін навучання – 2 гады 9 месяцаў. На завочную бюджэтную форму могуць паступаць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю і працуюць па адапаведнай спецыяльнасці, а таксама дзеці-інваліды, інваліды I, II групы. Залічэнне ажыццяўляецца па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі.

На завочную платную форму залічэнне ажыццяўляецца па суме балаў сертыфікатаў ЦТ (беларуская (руская) мова, грамадазнаўства) і сярэдняга бала дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі.

Парадак прыёму ў каледж рэгулюецца Правіламі прыёму ў ССНУ, зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.02.2006 № 80 (са зменамі і дапаўненнямі).

# ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ДЗЁН АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ
## у БДУ на 2017/2018 навучальны год

| Факультэт | Дата, час | Адказны | Тэлефон |
|---|---|---|---|
| БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ вул. Курчатава, 10, аўд. 1 | 28 снежня 2017 г., 13-30<br>29 сакавіка 2018 г., 13-30 | Дзітчанка Таццяна Іванаўна | 209-59-40 |
| ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ вул. Кастрычніцкая, 2, канферэнц-зала | 04 снежня 2017 г., 10-00<br>03 лютага 2018 г., 10-00 | Гаргуль Алег Валер'евіч | 209-52-82 |
| ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ вул. Ленінградская, 16, аўд. 312 | 04 студзеня 2018 г., 11-00<br>29 сакавіка 2018 г., 11-00 | Грышчанкава Наталля Дзмітрыеўна | 209-54-91 |
| ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ вул. Кальварыйская, 9, актавая зала | 04 студзеня 2018 г., 12-00<br>29 сакавіка 2018 г., 12-00 | Сіліна-Ясінская Таццяна Уладзіміраўна | 259-70-34 |
| ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ вул. Чырвонаармейская, 6, актавая зала | 04 студзеня 2018 г., 12-00<br>29 сакавіка 2018 г., 12-00 | Бярэйшык Лілія Уладзіміраўна | 209-55-98 |
| МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ пр. Незалежнасці, 4, аўд. 433 | 05 студзеня 2018 г., 15-00<br>26 сакавіка 2018 г., 15-00 | Яблонская Ганна Генадзьеўна | (8029) 348-11-28 |
| ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН вул. Ленінградская, 20, аўд. 1201 | 13 студзеня 2018 г., 13-00<br>31 сакавіка 2018 г., 13-00 | Карэлін Сяргей Валер'евіч | 209-57-72 |
| ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ пр. Незалежнасці, 4, аўд. 521 | 05 студзеня 2018 г., 14-00<br>27 сакавіка 2018 г., 14-00 | Задворны Барыс Валянцінавіч | 209-50-70 |
| ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ вул. Курчатава, 5, аўд. 115 | 05 студзеня 2018 г., 10-00<br>24 сакавіка 2018 г., 10-00 | Ушакоў Дзмітрый Уладзіміравіч | (8029) 501-71-90 |
| ФАКУЛЬТЭТ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ вул. Курчатава, 5, аўд. 212 | 03 студзеня 2018 г., 12-00<br>26 сакавіка 2018 г. 12-00 | Шандора Наталля Іванаўна | (8029) 687-31-97 |
| ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК вул. Кальварыйская, 9, аўд. 635 | 04 студзеня 2018 г., 14-00<br>23 сакавіка 2018 г., 14-00 | Бобр Аляксандр Міхайлавіч | 259-74-06 |
| ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ пр. Незалежнасці, 2, аўд. 220 | 05 студзеня 2018 г., 12-00<br>31 сакавіка 2018 г., 12-00 | Саладухін Ігар Анатольевіч | 209-50-67 |
| ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ вул. К. Маркса, 31, актавая зала | 04 студзеня 2018 г., 12-00<br>27 сакавіка 2018 г., 12-00 | Крычко Вольга Пятроўна | 222-36-02 |
| ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ вул. Ленінградская, 14, аўд. 301 | 23 снежня 2017 г., 14-00<br>24 сакавіка 2018 г., 14-00 | Цабкала Жанна Анатольеўна | (8044) 779-70-97 |
| ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ вул. К. Маркса, 31, аўд. 63 | 04 студзеня 2018 г., 14-00<br>30 сакавіка 2018 г., 14-00 | Каралёва Ганна Анатольеўна | 222-39-96 |
| ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ вул. Ленінградская, 8, аўд. 609 | 04 студзеня 2018 г., 10-00<br>22 сакавіка 2018 г., 10-00 | Сатолін Уладзімір Мікалаевіч | 209-52-79 |
| ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ вул. Шпалерная, 7, аўд. 106 | 26 снежня 2017 г., 11-00<br>30 сакавіка 2018 г., 11-00 | Манкевіч Валерый Віктаравіч | 306-00-17 |
| ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ вул. Маскоўская, 5, аўд. 213 | 06 студзеня 2018 г., 11-00<br>31 сакавіка 2018 г., 11-00 | Зубараў Андрэй Васільевіч | 222-83-19 |
| ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА пр. Незалежнасці, 24, аўд. 307 | 20 снежня 2017 г., 13-00<br>28 сакавіка 2018 г., 13-00 | Дзмітрыева Алена Валер'еўна | 327-63-67 |
| МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА вул. Даўгабродская, 23/1, аўд. 21 | 05 студзеня 2018 г., 12-00<br>31 сакавіка 2018 г., 14-00 | Пуцік Уладзімір Станіслававіч<br>Грыцкевіч Яўген Расціслававіч | 398-98-61<br>398-93-59 |
| ФАКУЛЬТЭТ ДАЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ АДУКАЦЫІ вул. Акадэмічная, 25, аўд. 303 | 28 снежня 2017 г., 14-30<br>29 сакавіка 2018 г., 14-30 | Андрыянава Алена Мікалаеўна<br>Біруля Ірына Анатольеўна | 284-00-14<br>284-00-83 |
| ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ вул. Камсамольская, 21, аўд. 409 | 04 студзеня 2018 г., 10-00<br>29 сакавіка 2018 г., 10-00 | Урублеўская Ніна Генадзьеўна | 328-55-34 |
| ЛІЦЭЙ вул. Ульянаўская, 8, актавая зала | 27 снежня 2017 г., 11-00<br>27 сакавіка 2018 г., 11-00 | Варакса Ігар Мікалаевіч | 226-00-62 |

## БДУ запусціў Telegram-бот для абітурыентаў!




Новы сэрвіс дазваляе аператыўна адказаць на тыпавыя пытанні тых, хто паступае. Акрамя таго, распрацоўка Медыяцэнтра БДУ служыць своеасаблівым правадыром па розных частках сайта для абітурыентаў БДУ. Спіс скарыстаных у боце пытанняў быў распрацаваны на аснове маніторынгу і аналізу зваротаў абітурыентаў БДУ. Адказы на запыты ўтрымліваюць спасылкі на больш падрабязную інфармацыю на сайце «Абітурыент БДУ».

Для працы з ботам абітурыенту неабходна ўсталяваць месенджар Telegram, знайсці бот «Абітурыент БДУ» па імені карыстальніка @applicantbsubot і адправіць паведамленне «start». Пасля гэтага раскрыецца кнопкавае меню з пунктамі, кожны з якіх утрымлівае карысную інфармацыю пра прыёмную кампанію. Пры дапамозе бота можна азнаёміцца з планам прыёму ў БДУ і прахаднымі баламі мінулага года, правіламі прыёму ва ўніверсітэт, магчымасцямі пражывання ў інтэрнатах універсітэта і г.д. Тут размяшчаюцца навіны, анонсы хуткіх мерапрыемстваў, фота- і відэаматэрыялы.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт шырока выкарыстоўвае камунікацыйныя магчымасці сацыяльных сетак. У БДУ маюцца афіцыйныя групы і старонкі ў сацыяльных сетках і сэрвісах «Укантакце», Facebook, Instagram, LinkedIn, Twitter, YouTube, Pinterest, Google+, ResearchGate.

# Школы юных



1. Пры **БІЯЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ** працуе «Школа юнага біёлага». Слухачамі школы могуць стаць навучэнцы 9–11 класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. Мэта школы – паглыбленае вывучэнне біялогіі, падрыхтоўка да ўдзелу ў алімпіядах. На занятках навучэнцы разбіраюць пытанні тэорыі, выконваюць практычныя працы. Заняткі праводзяцца штотыдзень па серадах на біялагічным факультэце (вул. Курчатава, 10). Навучанне бясплатнае.

Тэлефон: (+375-17) 209-59-00.
Вэб-сайт: www.bio.bsu.by.

2. Пры **ГЕАГРАФІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ** працуе «Школа юных географаў, геолагаў і краязнаўцаў». Слухачамі школы могуць стаць навучэнцы 7–11 класаў агульнаадукацыйных школ, гімназій і ліцэяў. Мэта школы – паглыбленае вывучэнне геаграфічных навук. Заняткі праводзяцца кожную апошнюю суботу месяца на геаграфічным факультэце (вул. Ленінградская, 16). Навучанне бясплатнае.

Акрамя таго, на факультэце функцыянуе дыстанцыйная школа па геаграфіі для навучэнцаў 10–11 класаў, якая прапануе дадатковы тэарэтычны матэрыял для паглыбленага вывучэння геаграфіі. Прадугледжваецца выкананне цыкла практычных прац і дыягностыка атрыманых ведаў у форме тэставых заданняў і адказаў на прапанаваныя пытанні. Навучанне бясплатнае.

Тэлефон: (+375-17) 209-54-92.
Вэб-сайт: www.geo.bsu.by.

3. Пры **МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ** працуе «Школа юнага матэматыка» для вучняў 5–10 класаў. Мэта школы – паглыбленае вывучэнне матэматыкі. Заняткі праводзяцца адзін раз у тыдзень на механіка-матэматычным факультэце (пр. Незалежнасці, 4). У рамках школы праводзіцца алімпіяда па матэматыцы «Абітурыент БДУ». Навучанне бясплатнае.

На факультэце функцыянуе дыстанцыйная матэматычная школа, у якой могуць навучацца вучні 9–11 класаў. Мэта школы – паглыбіць і замацаваць пройдзеныя тэмы па матэматыцы. Прадугледжана правядзенне 30 заняткаў. Адзін занятак разлічаны на тыдзень, складаецца з тэарэтычнага матэрыялу, заданняў для самастойнай працы, кантрольнага задання, якое рэцэнзуецца выкладчыкамі факультэта. Рэгістрацыя магчымая на працягу ўсяго навучальнага года на сайце www.dl.bsu.by. Навучанне бясплатнае.

Тэлефоны: (+375-17) 209-50-46, 209-52-49.
Вэб-сайт: www.mmf.bsu.by.

4. Пры **ФАКУЛЬТЭЦЕ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ** працуе «ЮНІ-Цэнтр-XXI». У рамках гэтага прафарыентацыйнага цэнтра функцыянуюць вочная, вочна-завочная і дыстанцыйная «Школы юных па матэматыцы, інфарматыцы і фізіцы» для навучэнцаў 5–11 класаў. Асноўная мэта названых школ – дадатковае (паглыбленае) навучанне па матэматыцы, інфарматыцы, фізіцы; развіццё мыслення і прышчапленне навыкаў выкарыстання атрыманых ведаў да рашэння задач навучальнага, алімпіяднага і даследчага характару. Для навучэнцаў 10–11 класаў праводзіцца дадатковая падрыхтоўка па рашэнні заданняў цэнтралізаванага тэсціравання. У рамках цэнтра праводзяцца алімпіяда па матэматыцы і інфарматыцы «Абітурыент БДУ», алімпіяда па крыптаграфіі, трэніравальны тэст-экзамен для абітурыентаў. Навучанне платнае.

Тэлефон: (+375-17) 209-50-70.
Вэб-сайты: www.uni.bsu.by і www.school.bsu.by.

5. Пры **ФАКУЛЬТЭЦЕ РАДЫЁФІЗІКІ І КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ** працуе «Школа радыёфізіка» для вучняў выпускных класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. Мэта школы – знаёмства абітурыентаў з патрабаваннямі ўступнага выпрабавання па фізіцы, знаёмства з факультэтам, яго навучальнай і навуковай базай. У рамках школы праводзіцца алімпіяда па фізіцы «Абітурыент БДУ». Навучанне бясплатнае.

Тэлефон: (+375-17) 209-58-36.
Вэб-сайт: www.rfe.bsu.by.

6. Пры **ФІЗІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ** працуе «Вочна-завочная фізіка-матэматычная школа» для вучняў выпускных класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. Мэта школы – дапамагчы абітурыентам сістэматызаваць і паглыбіць веды па фізіцы і матэматыцы, падрыхтавацца да здачы цэнтралізаванага тэсціравання. Заняткі ў вочнай школе праходзяць два разы ў месяц (з кастрычніка па сакавік) на фізічным факультэце (пр. Незалежнасці, 2). Навучанне бясплатнае.

Тэлефон: (+375-17) 209-52-67.
Вэб-сайт: www.physics.bsu.by.

7. Пры **ХІМІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ** працуе «Школа юнага хіміка». Слухачамі школы могуць стаць навучэнцы 7–11 класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. Мэта школы – паглыбленае вывучэнне хіміі. У рамках навучання праводзяцца тэарэтычныя, практычныя і лабараторныя заняткі. Заняткі праходзяць на хімічным факультэце (вул. Ленінградская, 14). Навучанне бясплатнае.

Тэлефон: (+375-29) 912-14-97.
Вэб-сайт: www.chemistry.bsu.by.

8. Пры **ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ** працуе «Школа юных гісторыкаў» для навучэнцаў 7–11 класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. Мэта школы – паглыбленае вывучэнне гісторыі, падрыхтоўка да ўдзелу ў алімпіядах. Форма навучання: вочная (7–11 клас), дыстанцыйная (10–11 клас). Навучанне бясплатнае.

Тэлефон: (+375-17) 209-55-98.
Вэб-сайт: http://www.hist.bsu.by/school.

9. Пры **ІНСТЫТУЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ** працуе «Школа маладога журналіста» для вучняў выпускных класаў школ, ліцэяў і гімназій. Мэта школы – знаёмства абітурыентаў з патрабаваннямі ўступных выпрабаванняў, дапамога ў падрыхтоўцы публікацый, знаёмства з факультэтам, яго навучальна-вытворчай і навуковай базай, кансультацыі дасведчаных педагогаў-практыкаў. Навучанне бясплатнае.

Тэлефоны: (+375-17) 259-70-33, 259-70-34.

10. Пры факультэце **МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН** працуе «Школа будучага мытніка». Слухачамі школы могуць стаць навучэнцы 10–11 класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. Мэта школы – прафесійная арыентацыя абітурыентаў, якія мараць абараняць эканамічныя межы Рэспублікі Беларусь на мытнай мяжы, забяспечваць паспяховае прасоўванне імпартных і экспартных тавараў. Падчас вучобы навучэнцы знаёмяцца з асновамі міжнароднай лагістыкі, вывучаюць асновы мытнай справы. Заняткі праводзяць выкладчыкі кафедры мытнай справы і супрацоўнікі Мінскай рэгіянальнай мытні. Заняткі праходзяць 2 разы на месяц па суботах з 10.00 на факультэце міжнародных адносін (вул. Ленінградская, 20, аўд. 813). Навучанне бясплатнае.

Тэлефоны: (+375-17) 209-57-51, 209-57-52.
Вэб-сайт: www.fir.bsu.by, e-mail: mytnica@bsu.by.

11. Пры факультэце **ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК** працуе «Школа юных філосафаў «Пайдэя»» для навучэнцаў 9–11 класаў. Мэта школы – знаёмства са светам філасофскіх ведаў. Заняткі дазваляюць пашырыць далягляд, паглыбіць веды па гісторыі духоўнай культуры і грамадазнаўстве, развіць навыкі крытычнага мыслення і лагічнага разважання. Праграма працы школы прадугледжвае знаёмства з працай факультэта, вывучэнне і абмеркаванне філасофскіх тэкстаў, правядзенне дыскусій і круглых сталоў па найбольш актуальных праблемах сучаснасці. Навучанне бясплатнае.

Тэлефон: (+375-17) 259-70-54.
Вэб-сайт: www.ffsn.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

26 снежня 2017 года
Падпісана да друку 22.12.2017 г.
Зак. 765. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***